Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 30 снежня 1988 г. № 52 (3462) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

70 год БССР і КПБ

Ніна МАЕЎСКАЯ

Жыцьме Беларусь!

ЗМАЛКУ люблю высокія, магутныя дрэвы і нават чорных, мудрых груганоў, якія, седзячы на галінах, задумліва аглядаюць акругу. Свет пад высокімі дрэвамі здаецца абжытым і ўстойлівым, трывалым і вечным. І ўзнікае трымклівае пачуццё, што і гэтыя дрэвы, і птушкі ведаюць і помняць тое, што ўжо за далягляда часу, невядомае, але важнае для цябе. Яны маўклізе ў невядомасць тая страшная чорная машына, якой усе баяцца і шчыльна запінаюць вокны, каб не прасочвалася святло. Я сама не раз чула, як яна доўга натужна гула, праязджаючы па нашай ціхай вуліцы, бачыла, які затоены жах і чаканне жылі ва ўсіх у вачах.

Гэта клопаты і страхі майго дзяцінства, гэта свет, разбураны, хліпкі, які я, як і ўсё маё пакаленне, спасцігала сваім, яшчэ дзіцячым розумам.

Але даруйце, сёння гаворка не пра мяне. Ёсць славутая юбілярка, і трэба гаварыць пра яе. Пра маці нашу — Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку. Рэспубліка наша маладая, але моцнага, цярплівага і знакамітага, хоць занядбанага, раскіданага роду. Нялёгкі шлях быў у нашай маладой рэспублікі, але толькі нядаўна мы пачалі па-сапраўднаму пра гэта гаварыць і цягнуцца да яе гісторыі.

Памятаю свае ўступныя экзамены ва універсітэт. Радасная, усхваляваная, амаль гатовая студэнтка (адны «выдатна» ў экзаменацыйным лістку), прыйшла на экзамен па гісторыі. На калідоры, ля дзвярэй аўдыторыі, дзе ідзе экзамен, некалькі разгубленых, дрыжачых абітурыентаў. Астатнія разбегліся, заходзіць баяцца: прымае грозны, вусаты чалавек па прозвішчу Абэцэдарскі. Зайшла. Выцягнула білет, села, рыхтуюся і слухаю, як «плавае» мая папярэдніца. І Абэцэдарскі ўжо не здаецца мне гэткім страшным. Ён нават прыходзіць ёй на дапамогу, пытаецца: «Якім гатункам лён здала? Высокім? Ну, абы лён быў добры, а гісторыю — вывучыш». Мяне вельмі ўразілі тады яго словы, здалося, гэта не проста фраза, сказаная, каб падбадзёрыць чалавека, а самі адносіны да гісторыі. Не таму, што побач з маімі «выдатна» з'явілася «пасрэдна», здалося, нават, што нечым не спадабалася маё прозвішча. Ён перачытаў яго двойчы, папытаў, з якіх мясцін родам, пачуўшы, нешта прабурчэў.

Потым ужо, калі я прыйшла на аддзяленне журналістыкі філфака БДУ, выкладчык курса гісторыі журналістыкі сказаў мне: «Ваша прозвішча мне вельмі знаёмае. Лагун быў членам першага Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. Вывучайце гісторыю», — параіў гэты наіўны чалавек. Але па чым яе было вывучаць? У школьных падручніках, у дапаможніках для студэнтаў, напісаных і адрэдагаваных Л. С. Абэцэдарскім, апроч Мяснікова і Кнорына, ніякіх прозвішчаў больш не было, нібы рэспубліка стваралася сама сабою, без людзей.

Толькі цяпер мы пачынаем гаварыць, як няпроста нараджалася наша Беларуская Савецкая Рэспубліка, як збірала свае сілы «горацешная, пакутная Беларусь, Беларусь рабочых і бедных сялян, спярша доўгія вякі свайго жыцця служыўшая сродкам для абагачэння польскага вяльможнага панства — памешчыкаў, зломысных грашаўнікоў-купцоў і ўсялякіх багацеяў-крывасмокаў, а потым захопленая пад уціск расейскага крывавага самадзяржаўя, з яго генераламі і самаўладным чыноўніцтвам, абдураная ды абманутая з касцёльных амбоняў ксяндзамі і з царкоўных алтароў папамі, скутая з ног да галавы ланцугамі няволі, цярпеўшая здзекі і глум і перажыўшая цяжкае ярмо нямецкага прыгону». Так гаворыцца ў «Маніхвэсце часовага рэвалюцыйнага работнічасялянскага савецкага правіцельства Беларусі».

25 кастрычніка 1917 года ў Мінску ўлада перайшла ў рукі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты пры Саветах, якія стварыліся ў ходзе барацьбы, неадкладна пачалі ажыццяўленне першых мерапрыемстваў рабоча-сялянскай улады. 26 лістапада 1917 года для практычнага ажыццяўлення пераходу ўлады да Саветаў былі створаны Абласны выканаўчы камітэт Саветаў (Аблвыканкомзах) і Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту. 31 студзеня 1918 года дэкрэтам СНК РСФСР, падпісаным У. І. Леніным, быў створаны Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацком).

Па сутнасці, гэта было пачаткам стварэння беларускай

(Працяг на стар. 2—3).

ДАРАГІЯ ЧЫТАЧЫ!

Вы атрымалі апошні ў адыходзячым, 1988 годзе, нумар «ЛіМа». У ім вы знойдзеце публікацыі да 70-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Яны — пра слаўных сыноў народа І. Лагуна, Д. Мальца, А. Баліцкага, В. Купрэвіча. Пярэдадзень утварэння рэспублікі — раздзел з рамана Г. Далідовіча.

На старонках нумара вы прачытаеце матэрыялы нашай пераднавагодняй анкеты, на пытанні якой адказваюць С. Алексіевіч, С. Грахоўскі, В. Грыгалюнас, Г. Давыдзька, М. Данцыг, С. Законнікаў, В. Каваленка, А. Казловіч, У. Калеснік, І. Лучанок, В. Маслюк, А. Марачкін, А. Пісьмянкоў, М. Фінберг.

В. Быкаў расказвае пра сваю паездку ў ЗША, пра свае ўражанні ад выступлення на сесіі Генеральнай Асамблеі ААН М. С. Гарбачова.

Н. Гілевіч адказвае на пытанні чытачоў рэспубліканскай бібліятэкі імя У. І. Леніна.

Старонкі інтэрнацыянальных узаемасувязей: коласаўскі музей у Каўнасе, беларускае апавяданне панямецку, украінскія эцюды нашага празаіка.

У «паэтычным сшытку» нумара — вершы М. Баравік, Н. Гальпяровіча, Л. Забалоцкай, В. Тараса, М. Трафімчука.

«Пра тое, чым жывуць людзі...». Пераднавагоднія гутаркі з лімаўскім чытачом.

З НОВЫМ ГОДАМ, СЯБРЫ! ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ НА СТАРОНКАХ ШТОТЫДНЁВІКА.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Напярэдадні 70-годдзя БССР і Кампартыі рэспублікі, напярэдадні Новага, 1989 года «ЛіМ» папрасіў некаторых дзеячаў літаратуры і мастацтва Беларусі расказваць, якім быў для іх год сёлетні, 1988-ы год, што адыходзіць у нябыт, і якія спадзяванні звязваюць яны з годам наступным, 1989-ым. Вось што адказалі яны на пытанні нашай экспрэс-анкеты.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

Жыццё чалавека саткана з розных нітак-падзей. Ёсць тут чырвоныя, але хапае і чорных. Такім бачыцца мне мінулы высакосны год, які ўскалыхваў душу зрэдку радасцю, а найбольш болем. Змрочнае крыло чарнобыльскай бяды, якое вісіць над нашай зямлёй, раёнамі Украіны, Браншчыны і засціць людзям белы дзень, надтачылася новай трагедыяй — страшэнным па сваёй сіле землятрусам у братняй Арменіі. І яшчэ назаўсёдная стрэмка ў сэрцы — заўчасны здлёт у незваротны вырай таленавітай руплівіцы нашай паэзіі, светлай, узнёслай і мужнай Жэні Янішчыц. Як усё сплятаецца, сцісканецца ў адзін вузел! І не развязаць яго, і не рассячы...

Кожнай сваёй крывінкай жыццё чалавечае крычыць, што яно надта крохкае, безабароннае, што людзі прыходзяць у гэты свет, каб жыць дзеля праўды і справядлівасці, думаць, любіць, ствараць. Але многія не чуюць той пранізлівы крык, абцяжжараюць падазрэннем, варожасцю, канфрантацыяй і без таго складанае наша быццё. Пра гэта засведчылі падзеі, якія адбываліся ў мінулым годзе ў рэспубліцы. Галоўны іх урок у тым, што людзі перастаюць быць «вінцікамі» і «гайкамі», пачынаюць, хоць і марудна, але ўсведамляць сваю ролю ў вялікай рэвалюцыйнай справе перабудовы грамадства. І гэта саграе надзеяй на лепшае. Гады культу, валюнтарызму, застою нанеслі не толькі фізічныя, матэрыяльныя страты, але і падарвалі наша духоўнае, маральнае здароўе, што бачыцца сёння асабліва выразна. Вялікая праца павінна быць зроблена розумам і рукамі ўсенароднай сям'і, каб падняць эканоміку, вырашыць набалелыя сацыяльныя і нацыянальныя пытанні, перамагчы апатыю, абыякавасць, паказуху, бюракратыю, вярнуць чысціню зямлі, рэкам, лясам, адрадзіць родную мову, абудзіць у кожным чалавеку разуменне важнасці зберажэння і актыўнага засваення багатых культурных традыцый, духоўнай спадчыны Беларусі.

У гэтую працу хоча ўнесці сваю, няхай сабе і сціплую лепту, рэдакцыя часопіса «Полымя». Радасна, што многія публікацыі мінулага года выклікалі чытацкую пошту, сталі прадметам абмеркавання, што вырас тыраж часопіса. Адбылося шмат чытацкіх канферэнцый, сустрэч супрацоўнікаў рэдакцыі і членаў рэдкалегіі з працоўнымі калектывамі, настаўнікамі, студэнтамі, школьнікамі, якія праходзілі шчыра і зацікаўлена. Спадзяёмся, што і ў новым годзе чытачы не будуць абыякавымі да твораў прозы, паэзіі, драматургіі, публіцыстыкі, крытыкі, якія мяркуе надрукаваць «Полымя».

Для мяне асабіста мінулы год быў багатым на падзеі і сустрэчы з цікавымі людзьмі, як у сваёй рэспубліцы, так і за яе межамі. Гутаркі з працаўнікамі Віцебшчыны і Міншчыны, уздел у Шаўчэнкаўскім свяце ў Харкаве, у Днях памяці Лесі Украінкі на Валыні, у «Варшаўскай паэтычнай восені» і літаратурных сустрэчах на Беласточчыне, паездка ў складзе дэлегацыі Савецкага камітэта абароны міру ў ФРГ, дзе ішлі вострыя, але добразычлівыя і надзвычай карысныя дыскусіі, мацавалася супрацоўніцтва з актывістамі Хрысціянскай службы міру, далі мне шмат уражанняў, жыццёвага матэрыялу для асэнсавання. Думаю, што ўсё гэта не пройдзе бясследна, адгукнецца ў тых радках, якія просяцца на паперу.

ВОСЕМ ДЗЁН У СНЕЖНІ

Васіль БЫКАЎ пра паездку ў Злучаныя Штаты Амерыкі

Штосьці істотна мяняецца ў нашых дачыненнях з «вялікім светам». Адчулі гэта на сабе і мы, лімаўцы. Толькі за апошні час рэдакцыю наведалі аўстралійскі і амерыканскі дыпламаты, журналісты з Польшчы, Іспаніі, Нідэрландаў, Японіі. І калі іх цікавіла тое, пра што мы пішам на старонках газеты, і, адпаведна, тое, што хвалюе нашых чытачоў, — ці не значыць гэта, што ў непарушны, здавалася б, падзел на «міжнародную арэну» і «ўнутраныя справы» жыццё ўносіць значныя карэктывы!

З другога боку, новую якасць набываюць і ўзаемаадносіны на ўзроўні дзяржаў. Найбольш выразна гэта прагучала ў выступленні М. С. Гарбачова з трыбуны сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, дзе кіраўнік СССР рашуча выказаўся за «новыя міжнародныя адносіны»: «Гаворка ідзе пра супрацоўніцтва, якое можна было б дакладней назваць «сатворчасцю», «саразвіццём».

«Жыццё прымушае адкідаць звыклыя стэрэатыпы, састарэлыя погляды, вызваляцца ад ілюзій,— сказаў М. С. Гарбачоў. — Сёння мы ўступілі ў эпоху, калі ў аснове прагрэсу будзе ляжаць агульначалавечы інтарэс. Усведамленне гэтага патрабуе каб і сусветная палітыка вызначалася прыярытэтам агульначалавечых каштоўнасцей».

Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў быў сярод тых, хто слухаў выступленне савецкага лідэра непасрэдна ў зале ААН. Мы звярнуліся да Васіля Уладзіміравіча з просьбай падзяліцца ўражаннямі ад сваёй паездкі ў Нью-Йорк.

— Вялікая група нашых дыпламатаў, журналістаў, дзеячаў навукі і культуры прыехала ў ЗША за некалькі дзён да пачатку афіцыйнага візіту М. С. Гарбачова,— сказаў В. Быкаў.— У складзе дэлегацыі былі тры пісьменнікі — Уладзімір Карпаў, Ігар Дзядкоў і я. Напярэдадні такой важнай падзеі, натуральна, узнікла вялікая цікаўнасць да Савецкага Саюза, яго знешняй і ўнутранай палітыкі, да асобы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. І мы нейкім чынам задавальнялі гэты інтарэс амерыканскай грамадскасці. Давалі інтэрв'ю, прымалі ўдзел у шматлікіх прэс-канферэнцыях, сустракаліся з уплывовымі прадстаўнікамі дзелавых колаў ЗША.

— На якія пытанні даводзілася найчасцей вам адказваць?

— Найбольшая колькасць пытанняў была накоўт нашай перабудовы. Адчувалася, што яна сёння цікавіць усе нацыі міжнароднага супольніцтва. І не проста цікавіць. Усіх хвалюе ход перабудовы, яе лёс. На прэс-канферэнцыях, пад час сустрэч мы выказваліся аптымістычна, хоць, трэба сказаць, што заходнія журналісты даволі інфармаваныя, разбіраюцца таксама ва ўсіх нашых праблемах і цяжкасцях.

— Як нам вядома, у ЗША выходзілі некаторыя вашы творы, у прыватнасці, «Мёртвым не баліць», «Воўчая зграя», — але ж наведалі гэтую краіну вы ўпершыню...

— Так, і, наколькі можна рабіць высновы пасля васьмі дзён знаходжання ў незнаёмай краіне, напаткаў там для сябе абсалютна іншую цывілізацыю. Нават візуальна. Уразіла перш за ўсё архітэктура, асаблівы яе стыль. Ні на што не падобны і вельмі, лічу, арганічны. Добрае ўражанне пакінулі амерыкан-

Жыцьме Беларусь!

(Пачатак на стар. 1).

савецкай дзяржаўнасці, першым крокам да ўтварэння самастойнай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя, якая адкрылася 30 снежня 1918 года ў Смаленску, аднадушна пастанавіла прызнаць неабходным абвяшчэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і аб'явіла сябе Першым з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.

1 студзеня 1919 года быў абнародаван Маніфест аб утварэнні Беларускай ССР.

З'езд абраў кіруючыя органы КП(б)Б.

У склад Цэнтральнага Бюро КП(б)Б увайшлі Алібегаў Іван Якаўлевіч, Андрэеў Аляксандр Андрэевіч, Жылуновіч Дзмітрый Фёдаравіч, Іваноў Сямён Варфаламеевіч, Калмановіч Майсей Іосіфавіч, Кнорын Вільгельм Георгіевіч, Лагун Іосіф Васільевіч, Мяснікоў Аляксандр Фёдаравіч, Найдзёнаў Грыгорый Паўлавіч, Перно Ян Францавіч, Пікель Рычард Вітольдавіч, Рэйнгольд Ісак Ісакавіч, Селязнёў Уладзімір Сяргеевіч, Собалеў Васіль Захаравіч, Яркін Віктар Іванавіч.

Пра большасць з іх мы ведаем вельмі мала...

Стварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі ўскладнялася акупацыяй: у 1918 годзе нямецкімі імперыялістамі, у 1919—1920 гадах — войскамі буржуазна-памешчыцкай Польшчы. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка абвяшчалася двойчы: 1 студзеня 1919 года і 31 ліпеня 1920 года.

Лета 1920 года прынесла беларускаму народу доўгачаканую свабоду. І зноў практычна паўстала пытанне аб аднаўленні беларускай савецкай дзяржаўнасці. На пасяджэнні прадстаўнікоў партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый Мінска і Мінскай губерні была прынята і 31 ліпеня абнародавана «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі».

Беларусь набыла сваю дзяржаўнасць, сваю мову, якая стала роўнай сярод роўных, сваю школу, сваю культуру.

Праўда, частка яе тэрыторыі і народа па Рыжскім дагаворы адышла да панскай Польшчы. Некаторыя паветы, дзе беларусы складалі большасць насельніцтва, былі ў складзе Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерній, што ўваходзілі ў склад РСФСР.

Паўставала пытанне аб далучэнні іх да БССР. Звернемся да аднаго з пунктаў прапаноў У. І. Леніна, напісаных 30 ці 31 снежня 1920 г. т. Красцінскаму:

«2) Червякову поручить **спешно** выработку проекта **детального** письма ЦК РКП о Белоруссии и **декрета** СНК о том же (тайного)».

Гэтыя радкі напісаны на пісьме Г. В. Чычэрына ў Палітбюро ЦК РКП(б) ад 30 снежня 1920 года, дзе ён адзначаў, спасылаючыся на А. Р. Чарвякова, неўрэгуляванасць дзяржаўных адносін Беларусі з РСФСР, якія абцяжжараюць супрацоўніцтва абедзвюх рэспублік. Пытанне аб заключэнні саюзнага дагавору паміж Савецкай Беларуссю і РСФСР было пастаўлена беларускімі партыйнымі і савецкімі органамі восенню 1920 г. Перагаворы, якія праходзілі ў канцы снежня 1920 г. і ў пачатку студзеня 1921 года, завяршыліся падпісаннем 16 студзеня Саюзнага рабоча-сялянскага дагавора паміж РСФСР і Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай Беларусі. 21 студзеня 1921 года дагавор быў зацверджаны сесіяй ЦВК Беларусі.

Гэта сведчыць пра тое, што станаўленне міжнацыянальных і эканамічных адносін было працэсам нялёгкім. Пытанне аб перадачы Беларусі тэрыторый, родных ёй, ставілася на VII з'ездзе Кампартыі Беларусі, які праходзіў 20—26 сакавіка 1923 года. З'езд звярнуўся з гэтым пытаннем да ЦК РКП(б). 7 сакавіка 1924 года Прэзідыум ЦВК СССР прыняў пастанову аб аб'яднанні ў складзе Беларускай ССР усіх тэрыторый Савецкага Саюза з большасцю беларускага насельніцтва.

У канцы 1926 года БССР былі перададзены горад Гомель і два паветы — Гомельскі і Рэчыцкі.

У Беларускай Савецкай Рэспубліцы панаваў небывалы ўздым. Раскаваны народ беларускі адчуў радасць вольнай працы, тварыў цуды, выконваючы і перавыконваючы дзяржаўныя планы. Людзі нібы падганялі час, хацелася зрабіць як мага болей, палепшыць жыццё. І ўжо ў першай пяцігодцы з'явіўся лозунг «Пяцігодку за чатыры гады!» І засвяціліся агні новых фабрык і заводаў, якія і сёння знакамітыя ў нас — «Гомсельмаш», «Бабруйскдрэў», фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», «КІМ» у Віцебску, Аршанскі льнокамбінат, Крычаўскі цэментны і інш.

Пачалося асушэнне балот. І гэта ўсё, улічыце, будавалася, рабілася саматугам, без магутнай, як цяпер, тэхнікі, уручную, стоячы па калена, а то і па пояс у вадзе.

Людзі імкнуліся да яднання, хацелі жыць калектыўна. Арганізоўвалі камуны. Група дэмабілізаваных воінаў БВА прыехала ў 1929 г. у цэнтр Мар'інскіх балот з цвёрдым намерам асушыць іх і ператварыць у квітнеючыя ўрадлівыя палеткі. Народны паэт Янка Купала апеў іх подзвіг у паэме «Над ракою Арэсай». Прыехаўшы на Палессе, ён прыходзіў у наш невялічкі дом у цэнтры Любані, каб пагаварыць з маім прадзедам Мінай Лагуном. Прадзед быў палескі доўгажыхар, якому даўно пераваліла за сто, і мог што-кольвечы расказаць з даўнейшага жыцця. Не ведаю, як вучаць цяпер у школах настаўнікі, ці звяртаюцца за прыкладамі з мясцовага жыцця, ці гавораць з імі пра людзей тутэйшых, а вось гэта — і пра Я. Купалу, і пра прадзеда свайго Міну — я пачула ад першай сваёй настаўніцы ў школе.

Гісторыя. Яна ў лёсах людзей, нават адной нашай Савецкай вуліцы.

Знішчэнне кулака, як класа, раскулачванне. Гэта ў доме побач. Пра гэта, калі дзе і гаворыцца, дык толькі пад строгім сакрэтам: бацькі нашай суседкі жывуць у Сібіры, на высылцы.

Абвастрэнне класавай барацьбы, вынішчэнне ворагаў Савецкай улады. Гэта ў доме насупраць. Там жыве з дзецьмі негаваркая, нейкая вельмі самотная жанчына. Муж яе, былы сакратар райкома — вораг народа, польскі шпіён. У адну ноч іх узялі, усіх: і яго, і старшыню выканкома, і дырэктара лясніцтва. Аказваецца, яны сябравалі, а брат дырэктара лясніцтва не раз хадзіў да родзічаў у Польшчу, пераходзячы граніцу.

Вайна. Дык яна ў кожнай хаце.

Вялікія будоўлі камунізму. Таксама тут, у нас. Толькі чамусьці працуюць там прымусова. Дадому іх не пускаюць нават на пахаванне блізкіх.

Панаванне «каралевы палёў». Вось яна — разораная па самы беражок пойма знакамітай Арэсы.

Меліярацыя. Таксама ў нас.

цы. Харошыя погляды... Іх незвычайная раскаванасць, кантактнасць, добразычлівасць. Дарэчы, усе гэтыя якасці найлепшым чынам праявіліся ў тым, як Нью-Йорк сустракаў М. С. Гарбачова. На ўсім шляху картэжа аўтамабіляў сабралася вялікая колькасць народу, які вітаў савецкага кіраўніка. Хоць, як казалі журналісты, нью-йорцаў зусім не проста прымусіць каго-небудзь вітаць.

Пасля было выступленне М. С. Гарбачова ў ААН. Зноў жа, надзвычайная цікаўнасць, людзі стаялі ў праходах, ажыўлена рэагавалі, гучалі апладысменты. Зрэшты, пра гэта вы, напэўна, маглі меркаваць па тэлетрансляцыі з залы ААН. Некаторыя палажэнні даклада Міхаіла Сяргеевіча былі ўспрыняты як сенсацыйныя. Найбольшы водгук знайшлі канкрэтныя прапановы нашай краіны па далейшай дэмілітарызацыі міжнародных адносін, у прыватнасці, абавязацельствы па буйнамаштабным скарачэнні арміі і ўзбраенняў; новыя падыходы да вырашэння балючых праблем так званага «трэцяга свету»; а таксама канцэпцыя прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей. Ужо сам факт таго, што гэта прагучала на такім высокім узроўні, з трыбуны ААН, сведчыць пра вялізны прагрэс у нашым грамадскім жыцці, у нашай філасофіі.

— Апошнім часам комплекс складаных праблем, паяднаных назвай «правы чалавека», перастаў быць для нас чымсьці адцягненым. А што, на вашу думку, Васіль Уладзіміравіч, тут самае галоўнае?

— Цярпімасць. Наша грамадская свядомасць, у значнай ступені выхаваная на нецярпімасці, шмат у чым ускладняе развіццё дэмакратычных працэсаў. Адсутнасць талерантнасці вызначыла і ўсё тое кепскае, што было ў нашым мінулым. І калі мы гаворым, што вучымся дэмакратыі, дык перш за ўсё пачынаць трэба з усталявання цярпімасці. З усведамлення таго, што іншае і, магчыма, не зусім зразумелае (у поглядах, пазіцыях, учынках) — неабавязкова кепскае альбо варожае. Вельмі важным лічу таксама разбурэнне «вобраза ворага». У сферы міжнародных адносін мы ўжо нямала дасягнулі ў гэтым напрамку. Што тычыцца нашага ўнутранага жыцця, дык тут спатрэбіцца яшчэ шмат часу і, як ні парадаксальна, барацьбы, каб канчаткова зжыць «вобраз ворага».

— Вы казалі пра свае сустрэчы з дзелавымі коламі Амерыкі. Цікава, пра што цяпер размаўляюць беларускі пісьменнік і амерыканскі бізнесмен?

— Такіх сустрэч было некалькі. Напрыклад, на прыёме, наладжаным ў гонар савецкай дэлегацыі кіраўніком Інфармацыйнага агенцтва ЗША Ч. Уікам, з боку гаспадароў прысутнічала 30 буйнейшых амерыканскіх бізнесменаў, эліта. Перад гэтым мяне запрасіў Інстытут міжнароднай адукацыі, дзе таксама былі гутаркі з прадстаўнікамі дзелавых колаў. Магчыма, вас гэта і здзівіць, але гаворка ішла, галоўным чынам, пра магчымасці пашырэння эканамічных узаемаадносін паміж нашымі дзяржавамі. Наколькі я зразумеў, тут ёсць пакуль што вялікія цяжкасці, што найперш вынікаюць з нашай эканамічнай адсталасці, неканвертуемасці рубля. Хоць амерыканскія бізнесмены ў прынцыпе выказваліся за развіццё эканамічнага супрацоўніцтва.

— Карыстаючыся нагодай, Васіль Уладзіміравіч, задам некалькі традыцыйных, нават перадnавагодніх пытанняў. 1989 год пачнецца для вас публікацыяй у часопісе «Полымя» новай аповесці «Аблава», раздзел з якой быў змешчаны нядаўна ў нашым штотыднёвіку. А што далей?

— Пачаў перакладаць аповесць на рускую мову. Гэтая праца забірае ў мяне звычайна вельмі шмат часу і сіл. Да таго ж, цалкам засяродзіцца на ёй не выпадае — узнікаюць больш надзённыя клопаты, звязаныя з публіцыстычнымі выступленнямі, грамадскай дзейнасцю.

— Што б пажадалі вы ў новым годзе нашаму штотыднёвіку?

— Сёлета «ЛіМ», на маю думку, паслядоўна прытрымліваўся лініі на дэмакратызацыю нашага жыцця. Разумею, што было гэта няпроста, і тым большай удзячнасці заслугоўвае зробленае рэдакцыйным калектывам і лімаўскімі аўтарамі. Хацелася б пажадаць вам не саступаць з перабудовачных пазіцый і ў наступным годзе.

Вёў гутарку А. ГАНЧАРОЎ.

ГІСТОРЫЯ БЕЗ «БЕЛЫХ ПЛЯМ»

Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Мінская вышэйшая партыйная школа, Акадэмія навук БССР, Міністэрства народнай адукацыі БССР правялі навукова-тэарэтычную канферэнцыю, прысвечаную 70-годдзю ўтварэння БССР і Кампартыі Беларусі.

На пленарным пасяджэнні былі зроблены даклады: «70 год Камуністычнай партыі Беларусі: некаторыя ўрокі гістарычнага вопыту», «Утварэнне БССР. Шлях барацьбы і здзяйснення», «Эканоміка Савецкай Беларусі ва ўмовах перабудовы: асаблівасці развіцця і перспектывы», «Народная адукацыя рэспублікі: гісторыя і перспектывы развіцця».

Гаворка была прадоўжана ў секцыях, дзе таксама закраналіся розныя пытанні гісторыі Савецкай Беларусі, гаварылася аб працэсах дэмакратызацыі, што адбываюцца сёння ў жыцці грамадства, падкрэслівалася важнасць урокаў гісторыі для наступальнага руху наперад.

БІБЛІЯТЭКІ — ЮБІЛЕЮ РЭСПУБЛІКІ

«Квітнее мой край беларускі» — пад такім дэвізам праходзіць рэспубліканскі агляд-конкурс прапаганды і распаўсюджвання беларускай літаратуры, прысвечаны 70-годдзю БССР і Кампартыі рэспублікі. Ён аб'яўлены Міністэрствам культуры і Дзяржкамвыдам БССР, праўленнем Белспажыўсаюза, сакратарыятам Белсаўпрофа сумесна з Саюзам пісьменнікаў БССР і Рэспубліканскім таварыствам аматараў кнігі.

У рамках агляду-конкурсу ў Барысаве, Баранавічах, Мядзелі, Клецку, Валожыне, Астраўцы, Слуцкім і шэрагу іншых раёнаў адбыліся святы кнігі. Паўсюдна ў бібліятэках, кнігарнях экспануюцца выстаўкі літаратуры «Беларускай ССР — 70 год», «Кастрычнік і Беларусь», «Народжаная Кастрычнікам», арганізуюцца выстаўкі-продажы літаратуры непасрэдна ў працоўных калектывах і навучальных установах. Праводзіцца разнастайная масавая работа — сустрэчы з літаратарамі, работнікамі выдавецтваў, канферэнцыі, паэтычныя вечары і вусныя часопісы, агляды навінак беларускіх выдавецтваў.

Заслугоўвае ўвагі ініцыятыва Слонімскай раённай бібліятэкі імя Я. Коласа. Сумесна з Домам культуры тут арганізаваны цыкл вечароў «Табе, Беларусь, нашы мары і песні», мэта якога — пазнаёміць працоўных з лепшымі творамі беларускіх пісьменнікаў, арганізаваць сустрэчы з цікавымі людзьмі, літаратарамі. Цікавымі былі вечары «Беларусь, я твой салдат і сын», «Ты сын наш геройскі — Кастусь Каліноўскі», абмеркаванні кніг А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...», В. Быкава «Кар'ер».

У падрыхтоўцы да юбілею Савецкай Беларусі трэба адзначыць актыўнасць літаратараў рэспублікі. Напрыклад, у Валожыне ў літаратурна-музычным вечары «Край мой — гонар мой» удзельнічалі І. Чыгрынаў, А. Савіцкі, У. Ліпскі, В. Хомчанка, В. Казько. У Астраўцы на свяце кнігі пабывалі А. Мальдзіс, паэты Гродзеншчыны Ю. Голуб, Р. Бялячыц, літаратурныя дзеячы з братняй Літвы. Цікавай была і сустрэча чытачоў Маларыцкай раённай бібліятэкі з М. Кацюшэнкам і В. Жуковічам. Толькі ў Вілейцы і раёне ў гэтым годзе пабывала 12 беларускіх пісьменнікаў, якія выступалі ў 62 аўдыторыях.

Разам з тым зазначым, што праходзячы рэспубліканскі агляд-конкурс прапаганды і распаўсюджвання беларускай літаратуры патрабуе больш увагі з боку яго арганізатараў на месцах. Не ўсюды ведаюць аб аглядзе, адсутнічаюць афішы, якія паведамляюць мэты і задачы конкурсу, інфармацыя аб мерапрыемствах. Аглядавыя камісіі не цікавяцца, як праходзіць агляд-конкурс, як выконваюцца яго ўмовы. Аб гэтым сведчыць праверка асобных раёнаў Віцебскай, Брэсцкай і Мінскай абласцей.

Конкурс працягнецца па люты 1989 года. Для яго пераможцаў устаноўлены дыпломы і ганаровыя граматы, грашовыя прэміі, нагрудныя значкі «Актыўны прапагандыст кнігі». Так што яшчэ ёсць час, каб сёе-тое паправіць.

М. РОЗУМ.
галоўны бібліёграф Дзяржбібліятэкі БССР імя У. І. Леніна, член рэспубліканскага аргкамітэта па арганізацыі і правядзенні вынікаў агляду-конкурсу.

У «СОВЕТСКОЙ ЛИТЕРАТУРЕ»

Дзесяты нумар часопіса «Советская литература» на чэшскай і славацкай мовах адкрываецца апавяданнем І. Пташнікава «Львы» ў перакладзе В. Жыдліцкага. Гэты твор прадстаўлены разам з апавяданнямі В. Астаф'ева, Ю. Сямёнава, С. Залыгіна і іншых знакамітых савецкіх пісьменнікаў.

«Львы» працягваюць знаёмства чэхаславацкіх чытачоў з творчасцю вядомага беларускага празаіка. Перад гэтым у перакладзе на чэшскую мову выходзілі аповесць «Тартак» і раман «Мсціжы». На славацкай мове была выдадзена аповесць «Лонва».

«Пра тое, чым жывуць людзі...»

Рэйд па адрасах леташняга перадnавагодняга рэпартажу

РОЎНА ГОД НАЗАД, за тыдзень да надыходу 1988-га, мы ўзялі некалькі кароткіх — на хаду, як кажуць, — інтэрв'ю ў чытачоў нашага штотыднёвіка непасрэдна ля газетных кіёскаў, а заадно і ў саміх кіяскёраў. Рэпартаж аб тых сустрэчах ля ранішніх кіёскаў пад назваю «Каб не разміналіся...» быў змешчаны ў першым нумары «ЛіМа» за гэты год. Сёй-той з чытачоў, магчыма, памятае яго (рэпартаж выклікаў досыць ажыўленую чытацкую пошту, якая знайшла адлюстраванне на старонках газеты), аднак жа коратка нагадаем, аб чым ішла гаворка.

Тыя перадnавагоднія сустрэчы з чытачамі і кіяскёрамі вывелі нас на праблемы, абсягі якіх умоўна можна акрэсліць ланцужком «чытач — газета — чытач». На той час у гэтым ланцужку было нямала неадладжаных звёнаў, якія выпадалі з яго і перашкаджалі мацаваць пастаянныя сувязі чытача з газетай. Розных перашкод і замінак мы выявілі (падказалі іх найперш чытачы) пад час рэйду нямала. Высветлілася, скажам, што кіёскі «Саюздруку» атрымлівалі для продажу ўсяго лічаныя экземпляры «ЛіМа» (два, чатыры, ці не сама больш — сем), якія, натуральна, не маглі задаволіць чытацкі попыт на газету. Самі кіяскёры ставіліся да нашага штотыднёвіка, як, зрэшты, і да іншых выданняў на беларускай мове, абыякава, залічалі яго ў «нехадавы тавар», што «прыносіць адно толькі лішнія турботы ды страты». Прычыну непапулярнасці такіх выданняў кіяскёры (калі не ўсе, дык многія) тлумачылі найперш іх беларускай мовай. А некаторыя кіраўнікі «Саюздруку» наогул лічылі беларускамоўныя выданні... беззмястоўнымі. Выяўлены былі ў час рэйду і многія іншыя сумныя факты, з'явы і акалічнасці.

З той пары мінуў год — прамежак часу не надта вялікі, але і не малы. Маглі за год адбыцца сякія-такія змены? Безумоўна. Асабліва калі ўлічыць, што сёння на ўсім ляжыць адзнака паскарэння. Менавіта з гэтае прычыны і парашылі мы ў перадапошнюю снежаньскую суботу зноў прайсціся адрасамі леташняга перадnавагодняга рэпартажу — сустрэцца ля ранішніх кіёскаў з нашымі сёлетнімі чытачамі і, само сабой, з кіяскёрамі.

(Працяг на стар. 10).

Вунь якая спрамленая рака з голымі берагамі.

За клопатамі пра хлеб і соль, пра малако і мяса, пра станкі і машыны беларусы мала думалі пра культуру. І неяк само сабою аказалася, што школы пераставалі быць нацыянальнымі, паступова пераводзіліся на рускую мову ў гарадах і сёлах.

Народ наш — вялікі летуценнік. Ён верыць у магчымае і немагчымае. Толькі ўволю паелі хлеба (помніцца, у сталоўках ён ляжаў нарэзаны, бясплатны), запусцілі першыя спадарожнікі і недзе ў цёплых, утульных кабінетах вырашылі — скора камунізм. Ён зусім ужо блізенька, можна нават дакладна вызначыць тэрмін — 80-ты год. І запісалі гэта не дзе-небудзь, а ў Праграме партыі.

Але дзіўна — адбывалася непрадбачанае, запатрабаванні раслі неверагодна, а здольнасці гаслі. Ужо было ясна, што мы паспяшаліся. І прафесар гісторыі ВПШ, дзе я вучылася, хапаючыся за галаву, гаварыў нам раздражнёна на занятках: «Гаварыце мне толькі да коскі. Не ведаю, не ведаю я, адкуль возьмецца і пальецца патокам багацце...».

Нядаўна я размаўляла з работнікам Дзяржплана БССР, які там працуе амаль усё сваё жыццё. Я пытала ў яго, гаварыла: «Вы ж рабілі падлікі, планавалі, выводзілі лічбы, няўжо вы верылі?» На гэта ён мне адказаў шчыра, што, канечне, лічбы былі завышаныя, але была такая сляпая вера, што здавалася: гэта тут, у нашым рэгіёне, адставанне, а ў другіх, мусіць, справы лепш, і што неададзім мы — перакрыюць яны. Раз сказала партыя — так яно і будзе. Гэта была шчырая вера. Я помню, як шчыра, ажно далоні балелі, апладзіраваў я і Брэжневу, калі той прыязджаў у Мінск. Гэта было... Надыходзіла празарэнне ў адных і зацямненне ў другіх.

Памятаю, калі выкладчыца ВПШ, паказваючы нам, як школьнікам (а школьнікамі мы былі сапраўды, толькі многія на перавыхаванні), паказвала кніжкі Л. І. Брэжнева і ўпэўнена, без ценю сумнення, гаварыла: «У будучым літаратура будзе такою». Я была ўпэўнена: не, літаратура такою не будзе, таму што яна не забава ці, як цяпер гавораць, не «майн кайф» Брэжневых і Рашыдавых, а збалелая, трывожная і шчырая душа народа. І голас яе, і праўда яе, як ні забараняй, як ні заглушай слоўнай траскатнёю і барабанным боем, прарвецца, і будзе пачута. І ў мяне ўжо ляжаў рукапіс аповесці «Людзі мае добрыя», дзе не толькі ў назве, у самой ёй быў крык да людзей, што ўсё ад нас саміх — і дабро, і зло, усё ад людзей, ад нас саміх, як мы зробім, так яно і будзе.

Застойны час... Нават здзівілася адразу, калі пачула гэты тэрмін. Асабіста для мяне гэта быў час змагання і барацьбы за чалавечую годнасць, за чысціню і праўду. Многа страчана сілы і здароўя, каб тлумачыць людзям, што такое дабро, як яго рабіць, ці за дзяржаўны кошт, ці неяк іначай, што такое шчырасць, чэснасць, сціпласць. Балела сэрца і душа ад таго, што гэтыя спрадвечныя маральныя крытэрыі былі парушаны.

Перабудова — не новы тэрмін, не прыдуманы М. С. Гарбачовым. Гэта насілася ў паветры, жыло, балела ў народзе. Іначай дзе б я, у 1979 годзе, пішучы аповесць, узяла тую размову сваіх герояў, што трэба перастройвацца. Дарэчы, я і цяпер супраць гэтага беларускага тэрміна перабудова, ёсць жа ў нашай мове словы перастройваць, настройваць музычны інструмент на новы лад. Думаеце, у іншых мовах няма адэкватнага слова (накшталт перабудова дома), а яны ўзялі рускае — «перестройка», бо яно сапраўды азначае істотна новую, своеасаблівую з'яву. Тое, што адбываецца і павінна адбыцца ў нашым грамадстве, адпаведна настройцы музычнага інструмента на новы лад. Гэты музычны інструмент — чалавек, душа ягоная. Калі кожны перастроіць сваю душу, настроіць яе на шчырасць і спагаду, на жыццё па сумленні і праўдзе, калі чалавек адчуе сябе гаспадаром сваёй зямлі, вось тады і адбудзецца яна — перабудова. Працэс гэты няпросты. Яшчэ Пляханаў прадбачыў «мучительные» дзесяцігоддзі, у якія краіна будзе адыходзіць ад культу асобы.

Народ наш абудзіўся. Чалавек болей не хоча лічыцца «вінцікам», а быць паўнапраўным членам грамадства. Яму сёння не ўсё роўна, што будзе з яго зямлёю, народам, багаццем яго краіны, яго моваю.

Сёння нашы народы яшчэ мацней паяднаў вялікі пакутны боль Арменіі. Людзі з усяго свету адгукнуліся, кінуліся на дапамогу. У аднаго з іх, сына зямлі беларускай, Анатоля Бяганскага, рабочага салігорскага будтрэста № 3 разарвалася сэрца. Ад болю, ад спагады, калі ўбачыў пад узнятай плітой мёртвых маці і дачку.

Гора Арменіі на віду, наша ж, што разышлося кругамі ад чарнобыльскага выбуху — нячутнае і нябачнае, як і самі цярплівыя сэрцы беларусаў. Але таксама хочацца крычаць свету, біць у званы. Скажыце, што будзе з намі, з нашымі дзецьмі, з нашым народам? Да гэтага часу няма поўнай праўды аб стане зямлі беларускай. Як ёй жыць, як дыхаць, як зберагчы сябе і людзей.

Ёсць і вельмі асабісты боль. Прататып героя маёй аповесці Аляксандр Пятровіч, механізатар калгаса «Рассвет» Любанскага раёна, які двойчы быў на работах у радыяцыйнай зоне, цяпер вельмі цяжка хворы. Не ведаю, не знаю, як яму дапамагчы...

70 гадоў для чалавека — гэта жыццё, для краіны — гэта толькі пачатак жыцця. І ў нашай рэспубліцы гэта пачатак — натхнёны, радасны, поўны надзей, пакутны і трывожны.

Слухаю, як пляменніцы мае Танечка і Ірынка Лагуны, вучаніцы мінскай школы, шпараць па-беларуску і маці іх, руская жанчына, работніца завода вылічальнай тэхнікі, вучыць яе з дзецьмі, набіраюся сілы і веры: значыць, не марна я не сплю ночы, пішу свае аповесці і апавяданні — будзе і на іх чытач. А галоўнае — жыцьме Беларусь. Жыцьме яе народ, яе мова. Не знікне і наш род.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Сяргей ГРАХОЎСКІ

Пра нашы цяжкасці, хібы ў развіцці грамадства мы толькі цяпер пачынаем гаварыць праўду. Мяне заўсёды абурала, калі паняцце «іншадумец» сёй-той імкнуўся кваліфікаваць, як нешта неадпавядаючае нашаму ладу, нашым ідэалам. Я хачу спытаць: хіба 280 мільёнаў чалавек, якія насяляюць нашу краіну, могуць аднолькава думаць, мысліць, аднолькава ставіцца да жыцця? Вядома ж, не. Але і да гэтуль у бюракратаў, што займаюць свае крэслы з таго, яшчэ застойнага перыяду, слова «іншадумец» выклікае такую непрыхаваную нянавісць, што становіцца жахліва. І кожны з іх лічыць сваю думку ісцінай у апошняй інстанцыі. У Карла Маркса ёсць такое выказванне: «Новая эра адрозніваецца ад старой эры галоўным чынам тым, што бізун пачынае ўяўляць, нібыта ён геніяльны».

Калі гаварыць пра літаратуру, дык у застойны перыяд ніводзін таленавіты твор не заставаўся непакараны, незабаронены. Гэта тычылася кніг В. Быкава, і А. Адамовіча, і У. Караткевіча, і А. Кулакоўскага, і іншых.

Тыя забаронцы не хочуць «поступаться принципами» і зараз. Вось толькі свежы прыклад. У Ракаве сабралі ўсіх пайшчыкаў раённай спажыўкааперацыі, перад якімі выступіў прадстаўнік Валожынскага райкома партыі. Ён сказаў прысутным, што беларускія пісьменнікі сталі небяспечнай сілай і нават, ні больш ні менш, хочуць захапіць уладу. Нядаўна я атрымаў ліст з Краснапольскага раёна, у якім расказвалася, што загадчык аддзела прапаганды райкома партыі Лазука з усіх трыбун бэсціць В. Быкава—як злоснага і небяспечнага нефармала, бэсціць пісьменніка з сусветным імем, чалавека, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўласнай крывёй сцвердзіў свой патрыятычны абавязак, сваю адданасць Радзіме.

Вучыцца ў В. Быкава дакладнай грамадзянскай пазіцыі, бескампраміснасці і прынцыповасці — вось што я хачу пажадаць кожнаму нашаму пісьменніку. «Калі мастак здраджвае ісціне, дык талент здраджвае мастаку», — пісаў В. Бялінскі.

Апошнім часам здзіўляе імкненне некаторых беларусаў пры пасадах у сваіх прамовах, у афіцыйных дакументах засцерагаць і палохаць беларускім нацыяналізмам. Айчынная вайна засведчыла высокую інтэрнацыянальную свядомасць беларускага народа. Колькі выратавалі беларускія жанчыны параненых рускіх, грузін, украінцаў, армян, калмыкаў, чувашоў, колькі з іх потым сталі пабрацімамі нашых партызан, аселі потым у нашых гарадах і сёлах, стварыўшы трывалыя інтэрнацыянальныя сем'і.

Пра які нацыяналізм можна гаварыць у Беларусі, дзе многія так лёгка адмовіліся ад сваіх нацыянальных вытокаў, мовы і культуры? Ці не блытаюць некаторыя «ретивые» таварышы любоў да роднай мовы, гісторыі і культуры з нацыяналізмам, каб канчаткова «абманкурціць» пазбаўленую пачуцця нацыянальнай годнасці частку насельніцтва, запалохваючы яе застарэлым і выкрытым стэрэатыпам «нацдэмаўшчыны»?

Дарэчы, успомніліся мае даўнія радкі:

Пакуль не меў пасаду і нагрузку,
Не ўмеў пісаць і гаварыць па-руску,
А як пасаду і аклад здабыў,
Па-беларуску гаварыць забыў.

Я на пяць гадоў старэйшы за нашу рэспубліку. На маіх вачах прайшоў амаль увесь яе шлях. Я не магу паскардзіцца на свой літаратурны лёс. Пасля 1956 года, калі я вярнуўся ў Беларусь пасля доўгай і вымушанай адсутнасці, у мяне выйшла 47 кніг. Асабліва ўраджайны быў гэты, 1988 год. Мне пашчасціла выдаць аж тры кнігі. Самую маленькую па аб'ёме, але самую дарагую для мяне кніжку «І радасць, і боль», у якой я паспрабаваў сказаць тое, чаго не мог сказаць на працягу многіх гадоў. Гэта вершы пра пакуты нашага народа ў часы сталіншчыны. Выйшла кніжка прозы «Сустрэча з самім сабой» і выбраных вершаў «Осенний свет» на рускай мове ў Маскве. У наступным годзе выйдзе зборнік вершаў у перакладзе на ўкраінскую мову ў Кіеве. Акрамя гэтага, сёлета была надрукавана аповесць «Такія сінія снягі» ў «Полымі», а ў «Маладосці» — успаміны пра трагічны лёс братоў Шашалевічаў.

Пражыты складаны год. Але мы — аптымісты. Я ўпэўнены, што новы 1989 год будзе больш мудры (па ўсходнім календары новы год — год мудрай змяі), больш шчодры на радасць, будзе годам упэўненага поступу перабудовы. Інакш быць не можа.

Скарбонка талентаў

Паказам лепшых работ самадзейных майстроў Мінска ў сталіцы рэспублікі завяршыўся фестываль народнай творчасці

Дні культуры горада Мінска атрымаліся ажно перанасычанымі рознымі мерапрыемствамі. Вось праграма толькі двух з іх. 22 снежня адбыліся: канцэрт «Родныя напевы» фальклорнай групы кавальскага корпуса МТЗ, справаздачны канцэрт калектываў народнай творчасці клуба ВА «Гарызонт», эстраднае шоу з удзелам народнага ансамбля бальнага танца Палаца культуры камвольшчыкаў. 23 снежня мы ўбачылі адкрыццё выстаўкі работ самадзейных мастакоў і майстроў дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва, канцэрт калектываў народнай творчасці ВА «Інтэграл», справаздачны канцэрт дзіцячых калектываў народнай творчасці Палаца культуры і тэхнікі Мінскага аўтазавода, свята фальклору «Беларускія вячоркі», тэатралізаванае свята «Ты ў сэрцы маім, Беларусь!»...

У фестывальныя дні ў гарадскім Палацы піянераў і школьнікаў адкрылася выстаўка дзіцячай творчасці агульнаадукацыйных школ горада, прайшоў II гарадскі фестываль аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах.

КРЫНІЦА НАТХНЕННЯ

У паўтарамільённым Мінску багата народных майстроў. Пра гэта сведчыць хоць бы такі факт: напярэдадні адкрыцця выстаўкі работ самадзейных мастакоў і майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якая праходзіла ў Выставачнай зале УНДІНТІ, 6 народных умельцаў - мінчан было ўзнагароджана медалямі ВДНГ СССР, сярод якіх В. Альшэўскі, А. Маголін, Э. Афанасенка.

— Разьбой па дрэве займаюся 50 гадоў,—расказвае В. Альшэўскі. — Не адзін раз атрымліваў узнагароды ВДНГ СССР. Раней, калі дазваляла здароўе, за год вырабляў да 30 работ, некаторыя з іх пабывалі ў ЗША, выконваў заказ я і для Венгрыі.

Для творчага почырку разьбяра па дрэве А. Маголіна характэрна імкненне надаць сваім работам агульначалавечае гучанне («Кніжнік», «Вароты», «С. Полацкі»). Адухоўленасцю і высокапрафесійным майстэрствам вылучаліся работы В. Гулякевіча («Музыка», «Лясная казка», «Зубр»).

Нямала наведвальнікаў збіралі інкруставаныя работы У. Курбана. Людзі з захапленнем разглядалі яго бар, журнальныя столікі і пано.

Дэбютавала ў гэты дзень са сваімі работамі грымёр тэатра музкамедыі Т. Багданава. Яна пачала займацца габеленам і вышыўкай год назад, але паспела за гэты час стварыць 35 работ.

— Вышываць навучылася ў дзяцінстве, а вось ушчыльную гэтай работай занялася нядаўна,— гаворыць Т. Багданава. — Вышыўка па бархаце і стварэнне габелена — мая любімая работа. Мяркую стварыць вялікае палатно «Лебядзінае возера» па матывах славутага балета.

Самую вялікую экспазіцыю складалі на выстаўцы творы жывапісу. Нешта загадкавае і рамантычна-ўзнёслае бачыцца ў работах Р. Магутова («Змярканне», «Поўня»). Вядомыя, памятныя мясціны занатаваны на палотнах М. Якавенкі («Нясвіж», «Радзіма Дзяржынскага», «Лагойск»). Па-свойму хвалююць «ціхія» пейзажы П. Майсеенкі і Л. Кізілы.

Уваход на выстаўку быў платны: дарослы білет — 30, дзіцячы — 10 капеек. На такіх жа выстаўках абласцей уваход быў бясплатны. Чаму ж раптам — платныя білеты? Адказу не знайшоў. Спакон веку народныя ўмельцы за тое, каб зірнуць на іх творы, і капейкі не бралі, палічылі б такое за грэх. Зірнуў на білеты, якімі «ўзнагароджваюць» наведвальнікаў. Там пазначана, што гэта білеты... за пракат лыжаў з чаравікамі ў парку. Дзіва дый годзе!..

МІНСКІ БАЛЬ-88

Два дні ў Мінску ў рамках фестывалю народнай творчасці праходзіла свята сучаснага бальнага танца «Мінскі баль-88», у якім прынялі ўдзел танцавальныя пары з Масквы і Ленінграда, Кіева і Львова, Рыгі і Харкава... Адзначым, што ў спаборніцтвах выступалі чатыры пары мінчан.

—Удзел у конкурсе прынялі лепшыя танцавальныя пары краіны,— расказвае член журы В. Ясель. — Мы нават не чакалі, што да нас прыедуць такія арыгінальныя танцоры. Тым больш прыемна, што на спаборніцтвах паспяхова выступілі гаспадары. Дарэчы, наша пара Юрый і Алена Царовы нядаўна вярнуліся з Чэхаславакіі, дзе сталі лаўрэатамі міжнароднага фестывалю, і на «Мінскім бале-88» яны яшчэ раз пацвердзілі сваё высокае майстэрства...

Выступаюць Леанід **Плятнёў** і Ліяна **Арыф**.

Фота Ул. КРУКА.

Перамožцамі сярод танцавальных пар міжнароднага класа сталі Валерый і Агіта Міронавы з Рыгі, другое месца занялі мінчане Юрый і Алена Царовы, на трэцім — Леанід Плятнёў і Віяна Арыф з Масквы. Сярод танцавальных пар класа «А» 1-ае месца занялі Аляксандр і Марыя Гусевы з Ленінграда, 2-ое і 3-яе месцы —у мінчан Уладзіміра і Ірыны Барысевічаў, Сяргея Марцінкевіча і Таццяны Славінскай.

А мне да гэтага хочацца дадаць некалькі больш мінорных слоў. Па-першае, які ж гэта баль, калі танцоры ўсміхаліся паўпустой зале? Па-другое, не былі выпушчаны да свята, як чакалася, спецыяльныя значкі і вымпелы, хоць і праводзілі мінчане свята ў 14 раз. І, па-трэцяе, арганізатары болю абышліся занадта ўжо стэрэатыпнымі формамі правядзення такіх мерапрыемстваў, не хапіла ім той дасціпнай фантазіі, якая кожнае відовішча ператварае ў сапраўднае свята.

В. ЛАПЦІК.

РЭДКІЯ БЕЛАРУСКІЯ ВЫДАННІ

У Львоўскай навуковай бібліятэцы імя Васіля Стэфаніка АН УССР захоўваецца унікальная калекцыя прыжыццёвых і рэдкіх выданняў Маркса, Энгельса, Леніна, апублікаваных у нашай краіне і за рубяжом да 1939 года. Калекцыя налічвае больш як 1200 работ класікаў марксізму-ленінізму на мове арыгіналаў і ў перакладзе на рускую, украінскую, беларускую, польскую, венгерскую, англійскую, французскую і іншыя мовы.

Несумненную цікавасць уяўляюць творы заснавальнікаў навуковага камунізму, выдадзеныя на беларускай мове. Беларускія выданні, што захоўваюцца ў Львове, былі надрукаваны ў Гомелі і Мінску.

Унікальнымі ў калекцыі з'яўляюцца творы У. І. Леніна ў перакладзе на беларускую мову. Асаблівую цікавасць уяўляе зборнік «Аб рэлігіі», у якім надрукаваны ленінскія работы ў перакладах К. Гарабурды: «Сацыялізм і рэлігія» (1905 г.); «Аб адносінах да рэлігіі рабочай партыі» (1909 г.); «Класы і партыі ў іх адносінах да рэлігіі і царквы» (1909); «Аб «лёкаях папоўшчыны» і прапагандзе атэізму» (1912); «З артыкула Н. Леніна «Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізму». Зборнік быў надрукаваны Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі ў 1925 годзе ў серыі «Ленінская бібліятэка». У зборніку перад назвай указаны, аўтар: Н. Ленін (У. І. Ульянаў).

Другой кнігай на беларускай мове, выдадзенай ў Мінску Дзяржаўным выдавецтвам у серыі «Ленінская бібліятэка», была работа Леніна «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме» ў перакладзе У. Чаржынскага (1925 г.).

Як жа трапілі рэдкія беларускія выданні Энгельса і Леніна ў фонды Львоўскай навуковай бібліятэкі? Да ўз'яднання Заходняй Украіны з УССР яны належалі бібліятэцы ўкраінскага навуковага таварыства імя Тараса Шаўчэнкі ў Львове.

Работа Ф. Энгельса «Нарыс тэорыі Маркса», выдадзеная ў 1919 г. мінскім выдавецтвам «Звязда» на рускай мове, знаходзілася ў славутай львоўскай бібліятэцы Асалінскіх.

Знаходжанне рэдкіх выданняў класікаў марксізму-ленінізму, выдадзеных на Беларусі яшчэ ў даваенныя гады, у бібліятэках Львова сведчыць аб гістарычных традыцыях у сувязях украінскага і беларускага народаў.

А. МАРКЕВІЧ,
старшы выкладчык кафедры марксізму-ленінізму Львоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М. Лысенкі, слухач ІПК пры Белдзяржуніверсітэце.

КОРАТКА АБ НАБАЛЕЛЫМ

У. КУРБАН,
разьбяр па дрэве:

— Ужо 10 гадоў займаюся інкрустацыяй. Для такой работы мае калегі звычайна набываюць у магазіне шпон, а я шукаю неабходную драўніну сам, летась за мораным дубам ездзіў на Гродзеншчыну.

Занятак мой вельмі працаёмкі. Напрыклад, журнальны столік я рабіў паўтара года, аддаўшы яму і ўвесь свой водпуск. Складанасць маёй работы быццам усе разумеюць, спецыялісты па народных промыслах адзначаюць, што такой справай займаюцца лічаныя адзінкі ўмельцаў, але далей маімі работамі ніхто не цікавіцца.

Што я магу прапанаваць як народны майстар? Магу па эскізах выканаць любую сталярную работу, аднаўляць мэблю. Бачылі прыгожы стол А. Міцкевіча ў навагрудскім музеі паэта? Я зрабіў яго дакладную копію.

П. МАЙСЕЕНКА,
самадзейны мастак:

— У нас не хапае пэндзляў, фарбаў і багету. Не хапае храмі

пастаянна, але нічога не мяняецца. Напрыклад, знікла з магазінаў жоўтая фарба, а без яе не зробіш практычна ніякага іншага колеру. Што робім? Шукаем, дзе хто можа.

Багет, які ў апошнія гады рэзка падаражаў, выпускае гомельская фабрыка, яго не трэба да нас прывозіць здалёку, і дзіву даешся, чаму яго не хапае ў магазінах?

Пажадана, каб неабходныя для нас тавары размяркоўва

АД РЭДАКЦЫІ. Вось і закончылася свята—дні паказу дасягненняў народнай творчасці абласцей рэспублікі і горада Мінска, якія былі прысвечаны 70-годдзю ўтварэння БССР і Кампартыі Беларусі і доўжыліся два месяцы. Мы вернемся да іх праз нейкі час зноў, на гэты раз паспрабуем падсумаваць вынікі фестывалю, прааналізаваць напрамкі і тэндэнцыі развіцця народнай творча

У Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна адбылася сустрэча чытачоў з першым сакратаром Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР Нілам ГІЛЕВІЧАМ. Размова ішла аб ролі і месцы пісьменніка ў перабудове, аб значэнні літаратуры ў грамадскім жыцці. Некаторыя фрагменты гэтай размовы, якая, дарэчы, доўжылася больш за дзве гадзіны, прапануем вашай увазе ў запісе нашага карэспандэнта.

Ніл ГІЛЕВІЧ

ВЕРУ Ў РАЗУМНУЮ САДРУЖНАСЦЬ...

— Сёння праводзіць сустрэчы з чытачамі,— сказаў у сваім уступным слове Н. Гілевіч,— надзвычай цікава, але і няпроста. Усё наўкол нас так імкліва мяняецца, такая ідзе рашучая і крутая пераацэнка каштоўнасцей, што часам мы здзіўляемся самім сабе: наколькі ж мы выраслі за апошнія гады ў сацыяльным і духоўным плане, наколькі вастрэй і смялей сталі гаварыць пра тое, што нас хвалюе, непакоіць, трывожыць.

Натуральна, што гэты дабратворны працэс наклаў свой адбітак і на характар нашых з вамі сустрэч. Цяпер ужо не пытаюцца пра біяграфію пісьменніка, яго творчы шлях, гісторыю напісання таго альбо іншага твора. Пытаюцца пра рэчы больш істотныя. І гэта лагічна. Мы хочам зразумець саміх сябе, асэнсаваць навакольную рэчаіснасць, усвядоміць ролю літаратуры ў грамадскім жыцці.

Трохі пра сённяшнюю літаратурную сітуацыю. Нярэдка пытаюцца: чаму так мала твораў пра перабудову? Што можна сказаць наконт гэтага? Канечне ж, мы таксама хацелі б, каб ужо сёння вы знаходзілі раманы, аповесці, паэмы, п'есы, якія неслі б у сабе выразную адзнаку часу, давалі адказы на пытанні, што вас хвалююць. Але для таго, каб напісаць добры твор, патрэбен час.

Ісціна як быццам бясспрэчная. І ўсё ж... Ці не празмерна мы апраўдваемся, ці не зацягнулася творчая паўза? Пасля красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС прайшло ўжо амаль чатыры гады. Хіба гэтага мала для пісьменніка, які не самаізаляваўся ад грамадскага жыцця, які мае вочы, вушы, гарачае сэрца? Можа ён напісаць такі твор, дзе б ужо асэнсоўваліся працэсы нашага сённяшняга дня? Думаю, што можа.

Кажуць, што цяпер усе пісьменнікі пайшлі ў публіцыстыку. Што праўда то праўда. Многія пайшлі. Але гэтаму не толькі засмучацца трэба, а і радавацца. Бо пакуль мы ў публіцыстыцы не ўсвядомім наш час, не спасцігнем тыя імклівыя перамены, што адбываюцца ў навакольным жыцці, мы па-сапраўднаму не пранікнем у сутнасць сацыяльных з'яў, будзем слізгаць па паверхні, і ў рэшце рэшт як належыць не выканаем свайго пісьменніцкага абавязку.

Што ж ўяўляе сабой наша сённяшняя рэчаіснасць? Найпершая і самая радасная перамена — людзі загаварылі. Канечне, хто як можа. І хто пра што. Але гнятлівае маўчанне скончылася. Народ абудзіўся. Грамадска-палітычная актыўнасць нашых людзей як ніколі высокая.

Выявілася, аднак, розная ступень гатоўнасці да гэтага абуджэння, да гэтай актыўнасці. Адны горача вітаюць, што людзі адкрыта і чэсна загаварылі. Другія ж, я б сказаў, займаюць пазіцыю чакання: паглядзім, маўляў, як далей пойдуць справы. Яшчэ невядома, да чаго гэтае абуджэнне прывядзе. Трэція — ёсць і яны — не толькі не радуюцца, але і самі баяцца, і другіх стараюцца напалохаць. «Кабыничеговышлисты» —трапна назваў паэт такіх людзей.

Я не схільны спрошчваць сітуацыю. Яна сапраўды ў многіх сваіх праявах нечаканая, незвыклая для ўсіх нас, і перш за ўсё для ідэалагічных работнікаў. А пісьменнікі ў пэўным сэнсе таксама з'яўляюцца ідэалагічнымі работнікамі. Таму неадназначнасць успрымання сённяшняй грамадскай сітуацыі характэрна і для пісьменніцкага асяроддзя.

Трэба, аднак, разабрацца: чаго мы хочам? Прымаем мы партыйныя дакументы толькі на словах, а на практыцы схіляемся да таго, каб усё заставалася па-старому, ці сапраўды шчыра жадаем рашучых перамен і гатовы рабіць усё, каб максімальна спрыяць рэвалюцыйнаму абнаўленню? Ад адказу на гэтае пытанне залежыць, па які бок барыкады, калі гаварыць вобразна, вызначыць кожны з нас сваё месца ў барацьбе за перабудову.

Магу з пэўнасцю сказаць, што большасць пісьменнікаў занялі ў гэтым руху актыўную пазіцыю, і сваім натхнёным, палымяным словам імкнуцца садзейнічаць пазітыўным працэсам. Ёсць свае набыткі і ў празаікаў, і ў паэтаў, і ў драматургаў. Але ў авангардзе перабудовы ідуць нашы публіцысты, а дакладней кажучы, наша публіцыстыка, бо, як я ўжо адзначаў, сёння на гэтай ніве працуюць прадстаўнікі ўсіх літаратурных цэхаў.

Калі ж гаварыць пра тыя праблемы, якімі жыве публіцыстыка, то іх, найбольш важных, найбольш актуальных, бадай, тры. Першая — гэта далейшая дэмакратызацыя нашага грамадства і пашырэнне публічнасці. Літаратура тут можа зрабіць вельмі многае. Прыгадайце шматлікія публікацыі ў часопісах, газетах. Хіба не змянілі яны нашага ўяўлення аб некаторых прынцыповых з'явах палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця? Хіба не рыхтавалі яны той выключнай важнасці крок, зроблены намі на апошняй сесіі Вярхоўнага Савета СССР, калі былі прыняты істотныя змяненні і дапаўненні да Асноўнага закону нашай краіны?

Другая праблема, якая сёння ў цэнтры ўвагі публіцыстыкі, гэта праблема экалогіі. Па сваёй значнасці і актуальнасці я, можа, нават паставіў бы яе на першае месца. Бо калі мы не вырашым гэтай праблемы — усё астатняе проста траціць усялякі сэнс. Сённяшняе парушэнне гармоніі паміж прыродай і чалавекам пісьменнікі адчуваюць надзвычай востра і рэагуюць на гэта бурна, эмацыянальна. Таму ў нас, у Саюзе пісьменнікаў, што ні сход — то цэлая дыскусія. Людзей хвалююць і вынікі чарнобыльскай аварыі, і пытанні меліярацыі Палесся, і лёс Салігоршчыны, і многае, многае іншае.

Наламалі мы дроў нямала, але, можа, яшчэ не зусім спазніліся, можа, яшчэ нешта можна павярнуць, паправіць? Інакш мы рызыкуем застацца без вады і чыстага паветра. На жаль, я не магу сказаць, што ўжо ўвесь наш народ зразумеў гэту вялізную праблему. Дык ці мае права паэт, празаік, драматург не думаць, не пісаць пра гэта? Таму і вымушаны яны нярэдка адкладваць убок свае мастацкія творы і брацца за публіцыстыку, уключацца ў барацьбу за выратаванне жыцця на зямлі.

Кожны, хто мае сумленне, павінен сёння біць у званы, крычаць, проста лямантаваць. Але нягледзячы на гэты крык, інерцыя заганных метадаў нашага гаспадарання настолькі вялікая, што яе цяжка спыніць. Можна сто тысяч чалавек вывесці на плошчу, мітынгаваць цэлы дзень, а які-небудзь кабінетны чыноўнік здзекліва пасмяецца з усяго гэтага і падпіша дакумент, які заўтра прычыніць нашай прыродзе непапраўную шкоду. Рэальнай управы на сённяшняга бюракрата мы пакуль што не маем. Вось чаму асаблівую надзею ўскладваем мы сёння на ўдасканаленне нашай палітычнай сістэмы, на вяртанне да ленінскіх прынцыпаў, форм і метадаў кіравання і гаспадарання.

Не ўсё, аднак, на гэтым шляху пашырэння дэмакратызацыі, абнаўлення ўсіх сфер нашага жыцця, бясхмарна. Ёсць глухое, даволі адчувальнае супраціўленне чыноўніцтва, але ёсць пэўныя эмацыянальныя перахлёсты, залішняя катэгарычнасць, гэтак званая ультрарэвалюцыйнасць і з боку нашай творчай інтэлігенцыі. Асабліва гэта праяўляецца ў дачыненні да нашай трэцяй, самай балючай, праблемы — праблемы роднай мовы, гісторыі, культуры ў цэлым. Складанасць, напружанасць сітуацыі, якая тут склалася, вымагаюць асаблівай асцярожнасці, асаблівай прадуманасці дзеянняў. Між тым апошнім часам у сродках масавай інфармацыі з'явіўся шэраг артыкулаў, у якіх зроблены грубыя, жорсткія абвінавачванні ў адрас інтэлігенцыі, перш за ўсё пісьменнікаў, абвінавачванні агульныя, без разбору—не тое гавораць, не туды вядуць.

Дзеля чаго гэта? Навошта? Няўжо так цяжка зразумець, што ў галовах пісьменнікаў не нейкія хімеры, не блазенскія спакусы, а ўсё-такі яны кіруюцца вельмі і вельмі сур'ёзнымі матывамі. А калі мы не ўмеем яшчэ як след карыстацца дэмакратыяй — не трэба баяцца. Трэба толькі выразна бачыць, што ў гэтым вялікім руху здаровае, істотнае, якое абяцае добрыя вынікі, а што—выпадковае, лішняе, непрымальнае.

Пакуль Н. Гілевіч гаварыў уступнае слова, у прэзідыум прыйшло шмат запісак з самымі рознымі пытаннямі.

З ЗАПІСКІ:

«Паважаны Ніл Сямёнавіч! Вы гаварылі аб праблеме беларускай мовы як самай балючай. Але хіба можна вырашыць гэту праблему без павышэння агульнага ўзроўню культуры народа? І яшчэ. У вельмі тактоўнымі. Я, напрыклад, супраць таго, каб уводзіць беларускую мову ў вышэйшых навучальных установах, бо многія спецыялісты, якія прыехалі да нас з іншых рэспублік, апынуцца ў цяжкім становішчы. Ваша думка наконт гэтага?»

Н. Гілевіч:

— Па першаму пытанню. Канечне ж, паміж праблемай мовы і праблемай культуры самая цесная сувязь. Калі чалавеку не хапае элементарнай культуры, простага разумення, што трэба паважаць сваю мову, сваю літаратуру, сваю гісторыю, то карысці ад такога чалавека будзе небагата. Усе нашы сённяшнія беды, можа, якраз і ідуць ад таго, што нам не хапае культуры. Культуры працы. Культуры ўзаемаадносін. Маральнай культуры.

Справа, вядома, не ў вышэйшай адукацыі, бо і непісьменны чалавек можа быць вельмі культурным. Такімі, дарэчы, і былі нашы продкі. Іх адносіны да зямлі, да іншых людзей, іх мараль — гэта для нас сёння сапраўдны ўзор. Культурны чалавек сам адчуе неабходнасць вывучаць родную мову, альбо мову таго народа, сярод якога ён жыве не адзін ужо год.

Цяпер наконт другога пытання. Цалкам згодзен з тым, што вяртанне роднай мовы, выхаванне да яе павагі, любові — пытанне няпростае. Тут патрэбны і асцярожнасць, і разуменне сітуацыі. Адным махам яго не рашыць. Нас (а я маю на ўвазе не толькі пісьменнікаў, а ўсю свядомую інтэлігенцыю) чакае вялікая работа не на адзін год, і не на два. Пэўныя захады ў гэтым кірунку зроблены ўжо па лініі партыйных і савецкіх органаў, Міністэрства народнай адукацыі рэспублікі. Але ж ідзе і адваротны працэс. Пакуль мы засядаем, крычым, пішам паперы, некаторыя кіраўнікі школ самачынна, без ведама і дазволу ўлад, пераводзяць навучанне на рускую мову, як гэта зрабіў, напрыклад, зусім нядаўна адзін з дырэктараў у Пружанскім раёне. Значыць, варта ўжо, як кажуць, «и власть употребить», каб гэты непажаданы працэс не толькі спыніць, але і павярнуць яго ў адваротны бок.

Як быць з ВНУ? Канечне, адразу ўсе інстытуты перавесці на беларускую мову нерэальна. Дый ніхто такой задачы сёння і не ставіць. Трэба пераводзіць спярша тыя навучальныя ўстановы, дзе для гэтага ёсць магчымасці. А каб такія магчымасці паявіліся ў кожнай установе, скажам, праз пяць-дзесяць гадоў, неабходна загадзя рыхтаваць кадры. Інакш мы праблемы не вырашым ніколі. І нельга спісваць сваю душэўную ляноту на аб'ектыўныя ўмовы. У пачатку дваццатых гадоў да нас ва універсітэт прыехаў з Масквы прафесар Пічэта і ўжо праз паўгода чытаў курс сваіх лекцый па-беларуску.

З ЗАПІСКІ:

«Як вы адносіцеся да нефармальных аб'яднанняў, створаных у нашай рэспубліцы?»

Н. Гілевіч:

— Усялякія формы грамадскага руху я гатовы вітаць, але пры адной умове, што гэта будзе (не на словах, а на справе) працаваць на перабудову ў тым сэнсе, як гэта абвешчана ў партыйных дакументах. Створанае ў рэспубліцы аб'яднанне «Талака» і з'яўляецца, на маю думку, менавіта такой формай грамадскага руху. Праграма іх дзейнасці—сведчанне не толькі абуджэння гістарычнай, нацыянальнай самасвядомасці нашай моладзі, але і яе духоўнага росту. Жыць толькі прагматычнымі інтарэсамі — зневажальна для маладога чалавека, маладога інтэлігента. Да таго ж, у Беларусі вельмі вострая праблема захоўвання гістарычных помнікаў, помнікаў культуры. Нідзе, бадай, не была так запушчана гісторыя роднага краю, як у нас. І справа не ў тым, што гісторыкі не працавалі. Яны працавалі актыўна — выходзілі і манаграфіі, і двух-

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Віктар КАВАЛЕНКА

Мінулы год быў надзвычай напружаны і цяжкі. Працэс перабудовы ад кожнага патрабуе новай мабілізацыі сіл. Акрамя інстытуцкіх турбот у гэтым напрамку, быў заняты напісаннем артыкула пра канцэптуальную гатоўнасць сучаснай літаратурнай крытыкі ўспрыняць ідэю перабудовы ў перадавых, рэвалюцыйных патэнцыях. Галоўны выток эмацыянальных імпульсаў для гэтай працы — у самім характары сучаснага грамадскага жыцця, якое трывожыць неапраўданай супярэчнасцю. Мінулы год, відаць, не аднаго мяне красамоўна пераканаў, што перабудова ў ідэалагічнай сферы і ў духоўным жыцці рэспублікі ідзе марудна і цяжка, што кансерватызм жывучы, што ён здатны пры пэўных умовах, пры недастатковай самаарганізацыі перадавых грамадскіх сіл, пераходзіць у лабавую, грубую, безаглядную атаку.

Асабліва мяне засмучае і трывожыць, што прадстаўнікам старых дактрынёрскіх прапісаў негалосна дазволена не цырымоніцца. І яны не цырымоняцца! У многіх матэрыялах, якія друкаваліся ў «Вячэрнім Мінску», — не толькі пагарда да элементарнай ісціны, але і адкрытая хлусня, апора на людзей нядобрасумленных, скампраметаваных сваёй папярэдняй дзейнасцю. Зададзена арганізоўваліся нападкі нібыта ад імя рабочага класа на тых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, якія заўсёды імкнуліся гаварыць праўду пра свой час, саромеючыся нават лёгкіх форм лёкайства. Надзіва зацятымі былі спробы дыскрэдытаваць і адлучыць ад працэсаў перабудовы тых пісьменнікаў, як, напрыклад, В. Быкава і А. Адамовіча, якія ўсім зместам і пафасам сваёй творчасці заўсёды садзейнічалі падрыхтоўцы перамен у грамадскім жыцці краіны.

Кажуць, трэба, каб ва ўмовах перабудовы спаборнічалі многія ацэнкі, падыходы, думкі і канцэпцыі. Правільна! Але ж не можа спаборнічаць бруд і смецце. Маральны і філасофскі ўзровень палемікі ў рэспубліканскім друку катастрафічна зніжаўся. І камусьці гэта трэба і выгадна. Несумненна, што падобнымі метадамі робяцца спробы затармазіць ход перабудовы, накіраваць жыццё ў звыклае рэчышча адміністрацыйна-каманднай сістэмы, калі кіраваць лёгка, бо дастаткова загаду.

Хай Новы год прынясе нам больш надзеі, што перабудова ўмацуецца, і хай праца кожнага з нас будзе гарантыяй гэтай надзеі.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Уладзімір КАЛЕСНІК

Год мінулы быў, у маім адчуванні, гняўлівым з прасоння. Што бадзёрыла? — Поступ гуманізацыі жыцця, перадусім палітычных адносін на самым высокім узроўні, пераход на новае палітычнае мысленне. Што бянтэжыла, даймала, засмучала? Правінцыяльная інерцыя ў рэспубліцы і асабліва ў рэгіёнах, некантакты і кароткія замыканні паміж афіцыйнай і самадзейнай плынямі грамадскай думкі, паміж фармаламі і нефармаламі, інстанцыямі і нізавой ініцыятыўнасцю. Кіраўнікам яўна хацелася падстрыгчы і прычасаць самадзейнікаў па аўтарытарнай модзе.

Падзеяй нумар адзін, як і мае калегі — гуманітарнікі, літаратары, лічу дружнае падключэнне савецкай грамадскасці да гуманізацыі адносін на ўсіх узроўнях. Акцыяй палітычнага года была ліквідацыя ракет сярэдняй дальнасці, ініцыятыва нашага кіраўніцтва па скарачэнні колькасці войск на еўрапейскім кантыненце, ініцыятыва сумленнага парытэту, раўнавагі сіл.

Прыярытэтнасць агульначалавечага над нацыянальным і рэгіянальным пацвердзіў гуманістычны рух салідарнасці, дапамогі армянскаму народу, пацярпеламу ад стыхійнага бедства, спачуванне ўсіх краін і народаў свету, а ў першую чаргу савецкіх братніх народаў паказала, што жывуць у краіне высокія традыцыі роднасці, якія дапамаглі нам, беларусам, аджыць пасля жахаў вайны і фашысцкай акупацыі.

Пашана да агульналюдскога адкрывае перад кожным з нас браму скарбаў вялікага шматколернага свету, дапамагае знаходзіць разумныя суадносіны паміж нацыянальным, рэгіянальным і савецкім, спалучаць вялікія драмы народаў з малымі, але часта не менш балючымі клопатамі родных куткоў. Актывізацыя патрыятычных пачуццяў дазваляе заўважыць агульную запушчанасць рэгіянальнай культуры ў рэспубліцы. Дух уніфікацыі прывучыў нават студэнцкую моладзь вывучаць дыялекты і фальклор холадна, не любуючыся іх экзатычнай інакшасцю, а часта наадварот — крывячы губкі з-за таго, што вось нейкі там дыялект не хоча прыпадобіцца да літаратурнай нормы. Не звярталася ўвага на тое, што і літаратурная норма не падмацоўвалася практыкай інтэлігенцкіх эліт, што спарадзіла спакусы не прызнаваць прыярытэру, які існаваў толькі ў тэорыі на акадэмічным узроўні.

Такія тэндэнцыі трывожаць у праграмных заявах некаторых ініцыятараў краязнаўчага таварыства «Полісся», якія плануюць аб'яднаць розныя дыялекты Палесся, рэгіёна, размешчанага на сутыках трох славянскіх культур, у адзін арэол і называюць яго мовай Палесся, незалежнай ад беларускай літаратурнай мовы.

Паэтычныя вартасці дыялектных слоў і выразаў неабходна ўключыць у мову нацыянальную, беларускую, каб гаварыць са светам. Са скетчаў, дасціпных прыпевак і фацэцый сучаснай літаратуры не атрымаецца, нават калі дадаць да гэтых мілых у сваёй наіўнасці твораў пару сярэдненькіх банальных па змесце інтэлігенцкіх рыфмаванак на дыялекце. Для чаго патрэбна гэтае пераварочванне прыярытэтаў? Для задавальнення павышаных амбіцый аднаго-двух паэтаў, якім не ўдалося сцвердзіць сябе, пішучы па-беларуску. На здароўе, пішыце на бытавой гаворцы Моталя ці Іванава, але ж памятайце, што гутарковая мова ў прынцыпе мала прыдатна для стварэння паўнагучнай паэзіі. Фальклор, народная паэзія ствараюцца не на гутарковай мове дыялектаў, а на выпрацаванай вякамі вобразна-паэтычнай мове, якая з'яўляецца цудадзейным сродкам узбуджэння эстэтычных эмоцый. Ініцыятары падвышэння аднаго з дыялектаў Палесся да ўзроўню асобнай мовы парушаюць прыярытэты каштоўнасцей. Хіба канцлер ВКЛ, рэдактар славутага статута Леў Іванавіч Сапега, пісьменнікі-палемісты Лявонцій Карповіч, Афанасій Філіповіч—гэта толькі палешукі? Яны ж дзяржаўныя і культурныя дзеячы нацыянальнага маштабу. Зусім неўразумела гучыць і намер стварыць палеска-рускі слоўнік, ігнаруючы пры гэтым факт, што кафедра беларускай мовы Брэсцкага педінстытута склала ўжо і здала ў выдавецтва слоўнік дыялектаў Палесся, як дыялектаў мовы беларускай. Новае мысленне апавяшчае прыярытэт агульначалавечага над нацыянальным, класавым і рэгіянальным, а амбіцыйныя краяведы, родам з Іванаўшчыны — прыярытэт Мотальска-Іванаўскай гаворкі над беларускай нацыянальнай мовай.

Я адзначыў сабе ў думках як знамянальнае ўражанне пражытага года тое, што пачуў і пабачыў, дзякуючы тэлевізару, як танцуе і спявае на ўсіх сваіх дыялектах Расія. Прыгадвалася польская прыказка: «Як чэх зайграе, рускі запяе, а паляк станцуе — ніхто не папраўціць». Думалася мне, гледзячы выступленні мотальскіх драматычнага і танцавальнага гурткоў: а ці не зрабіць універсальным гуманістычным крытэрыем ацэнкі ўсякай працы тое, ці спяваюць працаўнікі, а то і ці працуюць яны спяваючы. Такая праца фарміруе асобу чалавека, а не толькі спецыяліста.

ВЕРУ Ў РАЗУМНУЮ САДРУЖНАСЦЬ...

(Пачатак на стар. 5).

якая сёння ад іх карысць? Я не схільны абвінавачваць толькі гісторыкаў — час быў такі. Дык вось у святле гэтага мне здавалася і здаецца вельмі разумнай ініцыятыва моладзі аб'яднацца вакол праблемы адраджэння помнікаў гісторыі і культуры, выхавання гістарычнай самасвядомасці. Канечне ж, у гэтым руху, як і ва ўсякім іншым руху, тым больш маладзёжным, ёсць і прыкрыя недахопы, і недапушчальныя пралікі, пра якія трэба гаварыць, якія трэба пераадольваць, але нельга на гэтай падставе навешваць на маладых людзей ярлыкі, ставіць пад сумненне сам рух.

Што датычыць «Тутэйшых», аб'яднання маладых літаратараў, то яно адносна нефармальнае, бо створана пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі і працуе пад яго эгідай. Члены гэтага аб'яднання маюць сваю праграму — адраджэнне роднай мовы, садзейнічанне дзяржаўным органам у вырашэнні многіх праблем развіцця беларускай культуры. Тут нямала здольных маладых людзей. Скажам, адзін з іх, паэт А. Сыс, прыняты нядаўна ў члены Саюза пісьменнікаў. Шкада толькі, што і ў гэтым аб'яднанні юнацкі максімалізм, а часам, можа, і не дастатковая палітычная адукаванасць перашкаджаюць больш цвярозаму, узважанаму падыходу да некаторых пытанняў. Але варта бачыць галоўнае, што ёсць у гэтым руху, і падтрымліваць, развіваць яго, ставіць на службу перабудове.

З ЗАПІСКІ:

«Вы расказалі пра «Тутэйшых». Але ж, відаць, літаратурная змена гэтым аб'яднаннем не вычэрпваецца?»

Н. Гілевіч:

— Канечне. Трэба больш дэталёва разабрацца, што ёсць наша маладая літаратурная змена. Я сказаў бы, што таленавітыя людзі ідуць у літаратуру. Вядома, гэты прыток мог бы быць куды больш багатым, калі б не тая сітуацыя, якая склалася з беларускай мовай. Мы гэта адчулі. Адчулі не сёння, а яшчэ дзесяць-пятнаццаць гадоў назад, калі беларуская мова стала на вачах знікаць з нашых школ. Гэта непазбежна прывяло да таго, што аслабла эстэтычнае выхаванне моладзі, знізіўся ўзровень выкладання роднай мовы. Тыя парасткі літаратурных здольнасцяў, якія маглі б атрымаць падтрымку ў школе, не атрымоўвалі яе. Не дзіўна, што на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта з кожным годам прыходзіць усё менш і менш маладых паэтаў, празаікаў. І ўсё ж, будзем аптымістамі. Ва ўсякім разе, тыя захады, якія сёння робяцца ў рэспубліцы, даюць падставы спадзявацца на лепшае.

З ЗАПІСКІ:

«Чаму ў «Маладосці» друкуюцца часцей за ўсё сталыя пісьменнікі? А дзе ж друкавацца маладым? Хіба гэта спрыяе іх росту?»

Н. Гілевіч:

— Гэта няпраўда. Нават без асаблівага падліку, толькі пагартаўшы старонкі часопіса, бачна, што маладыя аўтары тут пераважаюць. І я не думаю, што нехта з сур'ёзных пісьменнікаў хоча свядома закрыць дарогу маладым. Наадварот. Намаганнямі Саюза пісьменнікаў мы дабіліся адкрыцця яшчэ аднаго маладзёжнага часопіса — «Крыніца». З гэтага года пачаў выходзіць літаратурны дадатак да «Маладосці». Выдавецтва «Мастацкая літаратура» штогод браніруе для маладых 12 пазіцый. Было б што выдаваць. А вось цікавых, таленавітых твораў якраз і бракуе.

З ЗАПІСКІ:

«Што робіць Саюз пісьменнікаў БССР для адраджэння беларускай мовы, для паўнакроўнага развіцця беларускай культуры?»

Н. Гілевіч:

— Ну а што можа зрабіць Саюз пісьменнікаў? Яго галоўная задача — ствараць спрыяльныя ўмовы для таго, каб усе члены Саюза маглі актыўна і плённа працаваць. Высокаідэйныя, высокамастацкія літаратурныя творы — наш галоўны ўклад і ў справу перабудовы, і ў справу развіцця роднай культуры. Але гэтага мала. Будзем весці шырокую растлумачальную, выхаваўчую работу. Будзем словам і справай садзейнічаць павышэнню аўтарытэту роднай мовы. Упэўнен: ад таго, што кожны жыхар рэспублікі будзе аднолькава добра валодаць дзвюма мовамі, шкоды ад гэтага нікому не будзе. Наадварот. Я веру, што толькі ў разумнай садружнасці, у супольнасці нашых мар і імкненняў, паважаючы адзін аднаго і тую зямлю, на якой жывем, мы зможам па-сапраўднаму адчуваць сябе шчаслівымі

БЕЛАРУСКАЕ АПАВЯДАННЕ ПА-НЯМЕЦКУ

У канцы 1987 года лейпцыгскае выдавецтва «Філіп Рэклам» выпусціла ў серыі «Універсальная бібліятэка» зборнік класічных беларускіх апавяданняў «Малады дубок». У выдавецкіх дадзеных пазначана «Падрыхтаваў выданне Норберт Рандаў». За гэтымі радкамі стаіць не толькі тое, што ён склаў кнігу, напісаў прадмову, даведкі пра аўтараў, але і не менш важнае — ідэя выдання кнігі.

Каб прыйсці да гэтай ідэі, трэба было набыць багата ведаў па беларусазнаўству, ды, можа, не менш укласці сіл і здольнасцей у пераклады твораў беларускіх пісьменнікаў на нямецкую мову. У выніку, у 1971 годзе з'явілася ўкладзеная нашым сябрам анталогія на нямецкай мове «Буслы над балотамі» (да працы над якой былі падключаны і іншыя перакладчыкі).

І вось цяпер новая анталогія, у якую ўключаны апавяданні 1905—1930-х гадоў: Ядвігін Ш. — «Чалавек», «Сабачча служба», «Гаротная», «При исполнении служебных обязанностей»; Якуб Колас — «Недаступны», «Малады дубок», «Хаім Рыбс», «Балаховец»; Змітрок Бядуля — «Тата» («Шалёны»), «Летапісцы», «Лявоніха і Сымоніха», «Сорам» («Сярод ночы»); Цішка Гартны — «Здарэнне з камісарамі»; Максім Гарэцкі «Роднае карэнне», «Рускі», «Чарнічка»; Андрэй Мрый—«Камандзір»; Кузьма Чорны—«Хвоі гавораць», «Трагедыя майго настаўніка», «Макаркавых Волька»; Міхась Зарэцкі — «42 дакументы», «Максімаліст», «Ракавыя жаронцы»; Платон Галавач—«Кнак»;

Die junge Eiche

Klassische belorussische Erzählungen

Reclam

Віктар КАРАМАЗАЎ

...З УСІМ НЯЎТУЛЬНЫМ СВЕТАМ

ДЗВЕ ЎКРАІНСКІЯ СТАРОНКІ

І да яго, і да сябе

На вышыню Тарасаву ніхто ніколі не ўзыдзе, як ніхто ніколі не перажыве ягонае драмы, драмы прыгону. Але людзі, якія хочуць звацца людзьмі, ідуць і ідуць, падымаюцца на яго гару, бо ён, Тарас Рыгоравіч, усіх сюды, на Чарнечую, да сябе кліча, усіх збірае, каб пяднаць сваім болем і сваёй песняю. З яго вышыні па-новаму бачыш і свет, і самога сябе.

Гэтую думку я запісаў у кішэнны блакноцік, як сваё маленькае адкрыццё, ад жывога ўражання, на Чарнечай гары, ўзышоўшы на яе і аддыхаўшыся. Цяпер, праз колькі дзён, перачытаў і задумаўся: дзе і калі я рабіў першыя крокі да Кабзара?

Успамінаецца зіма сорак першага года: Татарыя, райцэнтр Старое Даржанова, двухпавярховая драўляная школа, школьны двор, у двары—стары драўляны дом, у ім —пакой з грубкаю пасярэдзіне, ложак за грубкаю, а пад ложкам — чорны драўляны куфэрак. Што за куфэрак? Чый ён? Што ў ім?

Бачу чарнявага настаўніка, татарына. Ён жыў у гэтым пакоі і пакідаў яго нам, ідучы на фронт. Бачу, як ён збірае на стале ў мяшок рэчы. Над сталом пад столлю, на кручку-драціне, падвешаны мех з сухарамі. Сухары настаўнік сушыў на чорны дзень, а падвешваў ад мышэй. Ідучы на фронт, пакідаў нам гэтае багацце, але і не толькі гэтае. Калі бацька, сястра і маці былі ў школе, і мы з ім, нашым нечаканым дабрахвотам, засталіся ўдвух у хаце, ён паклікаў мяне да сябе, дастаў з-пад ложка драўляны куфэрак, скінуў з яго маленькі замочак, адкінуў века і выклаў адтуль, з куфэрка, на стол дзіўныя рэчы: акварэльныя, у талерачках, фарбы, маленькі пэндзлік, вялікі сшытак, яшчэ новенькі, для малявання, карабок каляровых алоўкаў і кнігі — Сланімскага «Чарнігаўцы», раман, і Шаўчэнкаў «Кабзар». Настаўнік пагладзіў мяне, малога, па галаве — мне было сем гадоў, і я ўжо чытаў — і сказаў: «Гэта я пакідаю табе. Гэта мой табе падарунак. Можа, калі-небудзь і ты мяне ўспомніш». І я помню яго да гэтага часу, бо куфэрак, які ён мне падарыў, шмат у чым вызначыў мае захапленні ў маленстве, маё развіццё, мае духоўныя пачаткі, берагі маёй патаемнай размовы з жыццём. Праз чатыры гады вайны той куфэрак я прывёз, вярнуўшыся з бежанства, у Крычаў, і ён яшчэ і цяпер — праз паўстагоддзе — стаіць, абыгрызены мышамі і абдзёрты, недзе на гарышчы маёй крычаўскай хаты. На кніжнай паліцы стаіць той самы «Кабзар», побач з «Чарнігаўцамі», — кнігі мне дарагія, бо адны з першых маіх кніг, па якіх я вучыўся разумець свет і самога сябе, якія шмат чаму мяне навучылі, шмат сцежак у жыцці мне паказалі. А тыя фарбы, той пэндзлік? Іх я ўжо не знайду, але і яны тое-сёе ва мне абудзілі, выяснілі. Яшчэ можна знайсці ў той самай крычаўскай хаце і па суседзях ці мае акварэлі, ці карціны, напісаныя алеем на палатне, якім тады, у першыя пасляваенныя гады, былі нямецкія мяхі з арламі ды свастыкамі, якія я старанна загрунтоўваў, нацягнуўшы палатно на падрамнік. Сярод акварэлей з пасляваенных гадоў застаўся і партрэт Шаўчэнкі, копія з таго, якім адкрываўся «Кабзар», таго, з куфэрка, даваеннага выдання: густыя вусы, суровы пагляд на свет, на галаве папаха, кажух на плячах. Намаляваўшы, я прынёс яго, па-

Лукаш Калюга — «Трахім — штучны чалавек», «Цеснаватая куртачка», «Вам знаёмае»; Ян Скрыган—«Таіса», «У Кірылы на хутары». Своеасаблівым запевам да кнігі гучаць змешчаныя на яе пачатку беларуская народная казка «Дудар» у апрацоўцы Якуба Коласа і імпрэсія Яна Скрыгана «Памяць зямлі». Гэта пералік сведчыць, што выбар твораў зроблены на высокім эстэтычным узроўні.

Расказаў пра змест і зноў жа падумаў: колькі трэба было прачытаць прозы, каб адабраць тое, што ўвайшло ў кнігу, колькі ўкладзена тут працы. А Рандаў не любіць ісці па пратаптанай дарожцы, ён кожны раз імкнецца зрабіць «сваю» кнігу, «сваю» анталогію. Мы прывыклі, што звычайна ўкладальнікі ў анталагічных выданнях даюць твор і невялічкую нататку пра аўтара. На гэты раз, у анталогіі Рандава, амаль кожнаму аўтару папярэднічае кароткае, эмацыянальнае слова, я сказаў бы, эцюд, нашага майстра навелы Яна Скрыгана, папярэднічае тым празаікам, з кім ён бачыўся, знаўся...

У дачыненні да другіх аўтараў зборніка Рандаў звярнуўся да іншых крыніц. Так, да Андрэя Мрыя ён узяў урывак з успамінаў Заіра Азгура, да Ядвігіна Ш. скарыстаў некралог Палуты Бадуновай пра пісьменніка. Усе гэтыя матэрыялы не толькі пашыраюць гарызонты кнігі, яны робяць яе больш значнай, цікавай. Дарэчы, вяртанне твораў Андрэя Мрыя ў нас адбылося на год пазней, чым знаёмства з яго творчасцю ў ГДР. А апавяданне Алеся Гаруна «Пан Шабуневіч», якое ў нас на той час не перадрукоўвалася, было ўключана Рандавым у анталогію «Буслы над балотамі».

Яшчэ адно ўражанне ад гэтага выдання як чытача. Я не асабліва прымаю замежныя анталогіі агульнага характару, у якіх кожны аўтар прадстаўлены адным творам, яны не даюць уяўлення пра творчую індывідуальнасць мастака. Іншая справа, калі такія анталагійныя зборнікі прысвячаюцца пэўнай тэме або творам пэўнага перыяду. З цікавасцю чытаеш анталогіі агульнага характару роднай прозы ці паэзіі, бо ты маеш пэўнае ўяўленне пра творчасць пісьменніка, і тады ўзнікаюць розныя думкі, асацыяцыі, настрой. Наш сябра ўключыў у сваю анталогію адзінаццаць празаікаў, і амаль кожны з іх прадстаўлены некалькімі творамі. І прачытаўшы апавяданні, даведку і ўспамін, нямецкі чытач, мне здаецца, зможа ўявіць творчы міні-партрэт кожнага аўтара гэтай анталогіі.

Такое першае ўражанне выклікала ў мяне знаёмства з анталогіяй, атрыманай з Берліна. Застаецца дадаць, што з Норбертам Рандавым над перакладамі твораў беларускіх пісьменнікаў працавалі таксама Міхаіл Дэвеў, Карл Гутшміт, Хармут Хэрбот, Ірыс Лорэнц, Клаус Мюллер, Гундула і Уладзімір Чапегі, Ігар Чапега, Эрхард Вайнхолец.

Аляксей ГАРДЗІЦКІ.

АМЕРЫКАНСКІ ДЫПЛАМАТ У РЭДАКЦЫІ «ЛіМа»

«Адносіны паміж Савецкім Саюзам і Злучанымі Штатамі Амерыкі налічваюць пяць з палавінай дзесяцігоддзяў. Мяняўся свет — мяняліся і характар, роля, месца гэтых адносін у сусветнай палітыцы,—гаварыў нядаўна на 43-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН М. С. Гарбачоў. — Вельмі доўга яны будаваліся пад знакам канфрантацыі, а часам варожасці— то адкрытай, то скрытай. Але ў апошнія гады ва ўсім свеце змаглі ўздыхнуць з палёгкай дзякуючы змяненням да лепшага ў сутнасці і атмасферы ўзаемаадносін паміж Масквой і Вашынгтонам».

Кенэт Хілас у час гутаркі.
Фота Ул. КРУКА.

Пацяпленне ў адносінах паміж дзвюма вялікімі краінамі мінчане маглі зазначыць па тым элементарным факце, што толькі на працягу апошніх тыдняў у сталіцы рэспублікі адкрываліся амерыканскія выстаўкі. Спачатку—«Шматкніжная Амерыка», потым—«Інфарматыка ў жыцці ЗША». У сувязі з апошняй Мінск наведаў другі сакратар пасольства ЗША ў СССР Кенэт Хілас. Па яго просьбе адбылася сустрэча ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Сказаўшы, прадстаўляючыся, што ён працуе ў ідэалагічным аддзеле пасольства і займаецца пытаннямі ўнутранай палітыкі Савецкага Саюза, К.Хілас цікавіўся грамадска-палітычным, культурным і духоўным жыццём у нашай рэспубліцы, праблемамі перабудовы і дэмакратызацыі, характарам рэдакцыйнай пошты. Адказваючы на адно з зададзеных яму пытанняў, амерыканскі дыпламат заначыў, што аптымістычна глядзіць на працэс перабудовы, выказаў спадзяванне на далейшае развіццё амерыканска-савецкага супрацоўніцтва ў справе раззбраення, у галіне культуры і правоў чалавека. Заходзіла таксама размова аб літаратурных узаемасувязях, аб выданні твораў беларускіх аўтараў у ЗША, аб культурным абмене паміж так званымі пароднены гарадамі.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Анатоль КАЗЛОВІЧ

Для мяне гэта быў год павучальных расчараванняў. Калі ў каторы раз мы спешна абмяркоўвалі чарговы закон (аб выбарах), я злавіў сябе на пытанні: мой удзел ва ўсенародным абмеркаванні — палітычная гульня? Я ўспомніў, з якой прагнасцю чытаў газеты напярэдадні XIX партканферэнцыі, як адгукалася мая душа на слушныя прапановы людзей, але спадзяванні мае спраўдзіліся далёка не ўсе.

Напрыклад, былі прапановы вызваліць прэсу з-пад улады бюракратыі, каб прэса была сапраўды плюралістычнай. Большасць дэлегатаў канферэнцыі сустрэлі мудрую прапанову ў штыкі.

Я прафесійны газетчык, журналістыка — мой грамадзянскі, партыйны, асабісты абавязак. Я верыў, што будуць створаны ўмовы для таго, каб я мог адкрыта выказаць свае думкі. Не! На працягу ўсяго адыходзячага года рэспубліканская прэса ганьбавала мяне за тое, што я асмеліўся сказаць праўду пра ліхадзействы меліярацыі і некаторых прадстаўнікоў кіруючага апарату.

Прыкра, але я не мог уступіць у палеміку. Па-першае, з адчаем зразумеў, што мая думка не цікавіць тых, хто арганізуе манаполію прэсы, хто маіх калег-журналістаў прымушае ісці супраць сумлення (супрацоўнікі «Советской Белоруссии» баяліся нават косачку паправіць у артыкулах апалагетаў меліярацыі Скарапанава і Будзінаса). Падругое, ні мне, ні маім шматлікім аднадумцам не дазволілі выказацца ў прэсе, не былі надрукаваны і пісьмы-водгукі чытачоў пра тую ж меліярацыю, якая вядзе Беларусь да абвастрэння экалагічнай сітуацыі.

Вось вам і вынік: калі раней людзей дурманілі васемнаццаціпрацэнтным вермутам, то цяпер дурманяць васемнаццаціпрацэнтным плюралізмам. А каб я не бачыў усяго гэтага, каб зноў стаў сляпы, 30 кастрычніка мне ў вочы пырснулі асляпляльным газам...

Дзесяць секунд я пастаяў аслеплены, потым выцер слёзы — і зноў бачу! Бачу, што робіцца вакол, стараюся дакладна перанесці на паперу, а паперу нясу ў рэдакцыю, каб надрукаваць, значыць, цепліцца ўва мне надзея.

Думаю, гэта і ёсць рэальны прамежкавы вынік перабудовы: нязгасная Надзея.

У гэтым годзе выйшлі дзве мае кнігі: адна ў Мінску, другая ў Маскве. Кнігі публіцыстыкі ішлі да чытача надта доўга: з Мінска—два гады, з Масквы—аж восем.

Скажыце, калі ласка: ці можа аўтар радавацца гэтай сумнай акалічнасці? Аўтар можа толькі гневацца і зноў-такі спадзявацца на лепшае. Лепшае — наперадзе! Значыць, трэба жыць.

мятаю, у школу. Быў урок літаратуры. Настаўніца Дар'я Маркаўна заўважыла яго ў мяне і павесіла на класную дошку — пачала чытаць на памяць:

Нащо мені чорні брови.
Нащо карі очі,
Нащо літа молодії.
Веселі дівочі?
Літа мої молодії
Марно пропадають,
Очі плачуть, чорні брови
От вітру линяють.

Пасля гэтага Дар'я Маркаўна, адна з лепшых маіх настаўніц, часта казала мне: «Віця, намалюй партрэт Пушкіна да наступнага ўрока». Ці: «...партрэт Лермантава». І я маляваў. І Пушкіна, і Лермантава, і Гогаля, і Някрасава. Яна вешала партрэт на класную дошку і вяла ўрок. Тады ў школе нагляднасці, як цяпер, не было, не было ні кніжак, ні партрэтаў пісьменнікаў. Мала ў каго былі падручнікі.

Чаму гэта ўспамінаю зараз? Ды таму, што адтуль, ад настаўніка-татарына, ад яго куфэрка, ад «Кабзара» і фарбаў з таго куфэрка, які знайшоў мяне ў далёкім сорак першым, пачалася мая сцяжына сюды, на гару Чарнечую. А яна і не можа быць лёгкая. Тут, у Каневе, мне расказалі, як пасля вайны на гару Чарнечую падымаўся салдат, вярнуўшыся з вайны без ног. Людзі хацелі падхапіць пад рукі, панесці на гару, да Тараса, але ён адмовіўся ад іх ласкі, сказаўшы: «Тарас не прыме мяне, калі я сам да яго не падымуся». І ён падняўся на Чарнечую гару да Кабзара — без ног. І калі б некалі мая любімая настаўніца не прачытала гэтае шаўчэнкаўскае: «Нащо мені чорні брови...», калі б гэта не засталося ў памяці з таго галоднага пасляваеннага года, можа б, я не пачуў «Думы» паэта з гэтакім неверагодным хваляваннем, з якім пачуў іх цяпер, ледзь пераступіўшы парог доміка-музея Шаўчэнкі на былым Казіным балоце ў Кіеве ў адну з раніц сакавіка, прыехаўшы сюды на святкаванне ўгодкаў вялікага Кабзара.

Думи мої, думи мої,
Лихо мені з вами!

Наверсе, пад столлю мансарды, куды вяла лесвіца, спяваў, яднаючы тугу чалавечай душы з тугою струн бандуры, цудоўны ўкраінскі спявак Юрый Дзямчук, а здавалася, што там, угары, усё роўна як недзе пад небам, на свае Чарнечай гары, са светам гаворыць сам Тарас Рыгоравіч. І гаворыць, і кліча да сябе на размову. І ты ідзешпадымаешся лесвіцай, быццам на яго голас. Быццам падымаешся на Чарнечую гару. І да яго, і да самога сябе.

Гэта я заўважаў і раней: кожны крок да Кабзара — крок нібыта і да самога сябе. Там, на Чарнечай, пачуўшы пра таго бязногага салдата, я зразумеў, што гэта адчуванне — не толькі маё. І тут — адна з таямніц яго паэзіі.

Як спасцігнуць гэтую таямніцу?

Ёсць пытанне. Да самога сябе. Нечаканае. Калі б маё адкрыццё Кабзара супала з цёплымі, ціхімі, сытнымі, мірнымі святамі, проста шчаслівымі днямі майго жыцця, ці адгукнулася б душа на голас шматпакутніка Тараса Рыгоравіча так, як яна адгукнулася?..

Куды дзенешся — жывуць таямніцы і загадкі паэзіі. Але гэта не толькі таямніцы і загадкі паэта. Яшчэ гэта таямніцы і загадкі душы, якая адкрывае душу паэта. І вось гэта, апошняе, магчыма, свет не менш хвалюючы, як свет самога паэта.

Аб гэтым думаеш, і калі ўспамінаеш сваё, і калі бачыш, як ідуць ды ідуць на Чарнечую гару да паэта людзі, калі ўяўляеш, што гэта ідзе народ і што ён, народ, ідзе да паэта вунь з якіх часоў!..

Так і яшчэ раз — так: і да яго, і да саміх сябе.

Камяняр

Якою б цемрай і безвыходнасцю ні здавалася жыццё на пуцявінах гісторыі, выйсце чалавецтва заўсёды знаходзіла. Да свята і надзеі. І калі ў свеце пануе ўсё ж закон раўнавагі, які дае магчымасць выжыць сумленню і праўдзе, то гэта таму адбываецца, што чалавецтва не страчвае здольнасці нараджаць геніяў духу.

Ці не аб гэтым сказаў Іван Франко ў сваім «Прысвячэнні» Тарасу Рыгоравічу Шаўчэнку?

«Ён быў сынам мужыка і стаў уладаром у царстве духу».

Ужо самы першы радок «Прысвячэння» спакушае задумацца: а ці не з'яўляецца гэты партрэт Шаўчэнкі, напісаны энергічным публіцыстычным словам Івана Франка, яго ўласным партрэтам — самапартрэтам?

Ва ўсякім выпадку, сказаць пра вялікага настаўніка так катэгарычна мог толькі вучань, у сэрцы якога гарэў ваяўнічы агонь Кабзара.

«О мой народ!..»

І гэта — не толькі першы радок з «Маісея». Гэта ўздых самога Франка. І ўздых, і адчуванне свае высокай місіі перад сваім народам. Яго Маісей не проста біблейскі вобраз, які выводзіць свой народ з егіпецкага палону. У ім — пэўны ідэал самога Франка.

Гэтак мне думалася ва ўтульна-ўрачыстай калоннай зале кіеўскай філармоніі на Уладзімірскай горцы, апранутай у мажорна-зялёныя, дзе-нідзе ўжо з мінорна-ржавымі плямамі, вопраткі верасня, калі Украіна разам з усім славянскім светам адзначала 130-годдзе Івана Франка. Сядзеў, слухаў, што кажуць людзі, выходзячы да трыбуны, сваё ўжо сказаўшы другім ці трэцім, і дзівіўся: цэлае стагоддзе, пра яго, класіка, кажуць, кажуць хораша, разумна, не шкадуючы вышыні слоў і голасу, а хто сказаў мацней, як ён сам? Хто і дзе?..

Пачаўся канцэрт. На сцэну выйшаў Андрэй Паламарэнка— артыст у званні народнага Украіны:

Я дзіўны бачыў сон. Перада мной нібыта
У пустэльнай дзікасці бязмежнае плато,
І я, сталёвым ланцугом абвіты,
Стаю пад скальнай стромаю з граніту,
А далей тысячы такіх, як я, братоў.

Няма пад рукой томіка паэта на яго роднай украінскай мове, тэкст прыводжу ў перакладзе на нашу мову Уладзіміра Караткевіча. Ды не гэта тут важна. Пераклад выдатны. Тут — пра іншае. Пра свой, як слухача, стан.

І ўсе мы, як адзін, узнеслі ўгору рукі,
І безліч молатаў аб камень загуло...

О, што такое сапраўдны артыст! Ён сам, увесь раптам нібыта ператварыўся не то ў скалу, не то ў метал молата, голас вырваўся нібыта не з чалавечых грудзей, а з той скалы, дакладней — з-пад яе смяротнага цяжару, і ўзнёсся, нібы скінуўшы з сябе ланцугі, да неба, скалануў усё навокал, нібы аб'яднаўшыся з усім светам:

Дзяўбіце гэты ўцёс!..

Акно ў залу са шкляным звонам расчынілася, да столі ўзляцелі, нібы ветразі ці сцягі, лёгкія шторы, і разам са свежым паветрам сюды шуганула пунсовае восеньскае лісце. Яно густа ляцела па зале, па сцэне, вецер гайдаў паветра і люстры, але, здавалася, ніхто гэтага не заўважаў і не чуў, ніхто не падхапіўся з крэсла, каб зачыніць акно — іншы вецер трымаў усіх у сваім палоне, куды мацнейшы:

Дзяўбіце гэты ўцёс!..

Я выйшаў з залы, з філармоніі.

Вечар, даволі позні, на збегу з ноччу, быў не халодны, але ветраны, імжыў дробны, нясмелы ці лянівы, дожджык. Вецер гнаў па Уладзімірскай горцы, унізе—па вуліцы сухое восеньскае лісце. Гэта было самае цяжкое восеньскае лісце Кіева, яго ліп і каштанаў, за ўсе часы, за ўсе вякі. На ім быў цяжар металу Чарнобыля. Лісце густога зялёнага футра Кіева прыняло на сябе воблакі смерці з Чарнобыля і цяпер, пажоўклае, густа сыпала на зямлю, пад ногі, на галовы. Удзень пра яго шмат гаварылі, яго паспешліва змяталі, зграбалі, грузілі на аўтамашыны, вывозілі за горад, закапвалі ў глыбокія ямы, а яно ўсё сыпала і сыпала. І ляцела ў залу філармоніі. І там, у шматлюднай зале, яго не заўважалі. Не заўважалі і тыя, хто пра яго шмат гаварыў удзень і, можа, з бояззю.

І ўсе мы, як адзін...
...тысячы такіх, як я, братоў.

Я ішоў па Кіеве і думаў пра тое самае: чаму не магу пазбавіцца — хоць, праўда, і не стараюся гэтага рабіць — адчування, што ўсё гэта, сказанае Іванам Франком, сказана нібыта кімсьці іншым пра яго самога? Але цяпер у гэтым пытанні мне гучаў і адказ на яго. Гэты адказ быў у самім лёсе паэта. У яго пастаянным, праз усю творчасць, праз усё жыццё, матыве: ...такіх, як я, братоў.

...такіх, як я...

Ён знайшоў у сабе гэты ўнутраны голас, голас брата ўсіх людзей, гэтым голасам гаварыў са светам, ён быў яму арганічны, ішоў ад сэрца, ад лёсу, агульнага з лёсам спакутаванага свету, і гэты паэтаў голас да «такіх, як я», пра «такіх, як я», «такіх, як я, братоў» высвятляў яго самога з той сілаю, з якой ён гаварыў пра іншых.

Зрэшты, у гэтым таленце — доля ці не кожнага сапраўднага паэта?

Вось і ў Цёткі:

Хацела б быць зярном пшаніцы,
Упасць на ніўкі вёскі...

Іншае? Але, па сутнасці, тое самае: агульнасць лёсу — з усімі, з усім няўтульным светам.

Проза

Генрых Далідовіч

Эвакуацыя

Закончыў трылогію «Гаспадар-камень».

У першым рамане з аднайменнай назваю я намагаўся паказаць лад жыцця ў беларускім краі напярэдадні першай сусветнай вайны, у другім, у «Пабуджаных» — падзеі 1917 года, а ў трэцім рамане «Свой дом» — спроба адлюстраваць надзвычай цяжкі 1918 год і складаныя перыпетыі ўтварэння беларускай дзяржаўнасці.

Карыстаючыся магчымасцю, шчыра дзякую гісторыкам М. Сташкевічу і В. Скалабану, пісьменніку Э. Ялугіну, энцыклапедысту М. Камінскаму за кансультацыі і літаратуру.

Увазе чытачоў прапаноўваю ўрывак з рамана «Свой дом», дзе апісваецца драматычны мінскі эпізод у ноч з 19-га на 20-ае лютага 1918 года.

АЎТАР.

ЯНЫ прыселі — на хвілінку, каб неўзабаве падняцца і ўжо рушыць у далёкую дарогу.

Звонка падаў свой голас у нямой цішыні тэлефонны званок. Падхапіўся, трубку ўзяў нервовы, аброслы за дзень Мяснікоў. Паранейшаму ў шынялі і чорнай скураной шапцы.

— Ну я, Мяснікоў, — хмурна адказаў таму, хто званіў, і тут жа сам спытаў: — А вы — хто? Які такі ўжо Народны сакратарыят?! Самазванцы!

Не зажадаў болей гаварыць, падаў трубку яму. Ландар прыклаў яе, яшчэ халодную, да вуха і пачуў мужчынскі глухаваты голас:

— Не, шаноўны. Мы — не самазванцы. Мы — з ліку тых 105 чалавек Савета, які выбраў і зацвердзіў наш снежаньскі кангрэс. Цяпер мы як законны Беларускі Прадпарламент бяром на сябе законнае права клапаціцца пра свой народ. А вось вы, чужакі, гвалтам захапілі тут уладу, штыкамі разагналі наш з'езд і ўрад, дык вы сапраўды самазванцы. Але вам нічога не дакажаш, бо ў вас свая карыслівая мэта, дык і не будзем дыскутаваць. Тым больш, што справядлівасць усё ж ёсць: вы, адкуль прыйшлі, туды і ўбіраецеся, а мы бяром уладу, ахоўваем родны край, ад якога нам няма куды ўцякаць. А вось пра іншае пагаварыць трэба... — А пасля занепакоена: — Алё? Алё?

— Слухаем, — спакойна прамовіў Ландар і, калі чалавек з глухім голасам запытаў, хто ён, то назваўся.

— Мы заклікаем вас, Ландар, да сумлення, — сказалі яму ў трубку.

— Да якога?

— Гісторыя некалі ацэніць: добра ці дрэнна тое, што вы кінулі нас пад ногі немцам і Доўбар-Мусніцкаму. Цяпер жа гутарка, кажу, пра іншае. Не на словах, а на справе, будзьце ласкавы, урэшце падбайце пра наш народ. Пра тых, хто і на вас працаваў.

— Што вы хочаце?

— Як мы паспелі ўжо абсачыць, вы забіраеце з сабою казну, астатняе падчысцілі ўжо збеглыя з турмы легіянеры. Нам удалося сабраць, як кажуць, толькі крошкі. Значыць, наш люд застаецца без капейкі, асуджаны на голад і выміранне. Адпаведна, мы патрабуем: вярніце казну!

— Мы, як і кожны ўрад, які сябе паважае, не можам пакінуць фінансы ворагу.

— Чаму — ворагу? Народу! У тым ліку і тым, хто, паўтараю, ужо на вас гнуў спіну!

— А каму, дазвольце вас спытаць, мы павінны перадаць скарб?

— Нам, новаму ўраду.

— Ніколі! Вы спажывіцё на свае карыслівыя мэты альбо паслужліва аддасцё немцам.

— Мы даём чэснае слова, што ўсе грошы будуць толькі для працоўных і служачых.

— Ну-ну! — ухмыльнуўся Ландар, пацёр вольнаю рукою ахаладнелыя нос і шчокі. — Вы і чэснае слова! Хто кляўся асабіста мне, што не будзе змагацца супраць Савецкай улады, але крывадушна парушыў клятву?

— Якраз вы глухатой да нашага болю і дэспатызмам змусілі нас пайсці ў падполле. Вы і ў гэтыя дні — бесы: аддаіцё край, Расею немцам, а з намі, нацыяналамі, ваюеце насмерць!

— Перастаньце, двудушнік! — спакойна, але рэзка перапыніў Ландар. — Мы з дэкрэтамі пра мір, пра зямлю, з нядаўняй «Дэкларацыяй правоў працоўнага і эксплуатуемага народа» зламыснікі?

— Ха-ха! — нервова засмяяліся ў трубку. — Скажыце, калі ласка, дзе ваш дакляраваны мір, дзе зямля?! Усё — цацанка-абяцанка! Вы дбаеце толькі пра ёселяў і янкеляў! Вось ім даіцё ўсё: уладу, пасады, правы, золата, яны — цяпер новыя паны над намі!

— Мана! Паклёп!

— Карацей, Ландар, калі вы не пакінеце казну, мы затрымаем вас і будзем судзіць! Як ворагаў, рабаўнікоў беларускага народа!

— Рукі кароткія ў вас, спадарок!

У гэтую хвіліну рослы камендант у чорнай скураной куртцы і шапцы борздка падышоў да акна і, затуліўшы шчокі далонямі, зірнуў уніз, на ўжо ўцемненую Петраградскую вуліцу. Але тут жа рэзка адскочыў.

— Натоўп распраўляецца з нашай вартаю, — усхвалявана прамовіў. — Выходзьма, таварышы! Праз чорны ход!

Ландар кінуў на рычажкі трубку, увішна схапіў пакоўны партфель з дакументамі Савета, важкі, загадзя сабраны чамадан і ўслед за Пятровым і Мясніковым, пакідаючы свой асветлены лямпаю кабінет, подбегам падаўся ў прыёмную, а пасля — па цёмнай лесвіцы ў змрочны двор, з яго — да вакзала, дзе чакаў іх цягнік на Смаленск. Там, як сказалі яму, павінны быць ужо каля ста чалавек з Аблвыкамзаха з сем'ямі, вайсковы атрад, вагоны з дакументамі, зброяй і харчам, некалькі класных вагонаў і платформа з браневіком.

Паўцемнаваты, толькі там-сям з асветленымі вокнамі вакзал, як убачыў Ландар, быў ачэплены байцамі з вінтоўкамі — тыя не пускалі да пуцей розны падазроны люд. Згледзеўшы іхнюю тройку, той-сёй з гэтага гурту, мусіць, пад'юшчваючыся ад стыхіі, суцемак і пачуцця ўсёдазволенасці, пагрозна памкнуўся насустрач.

— Назад! Застрэлю на месцы! — Пятроў наставіў рэвальвер на найбліжэйшага таўсматага дзецюка ў ватоўцы з авечым каўняром і ў салдацкай шапцы, запыніўся, прапускаючы наперад Ландара і Мяснікова.

Дзяцюк, а за ім і астатнія маладыя хлопцы ў шынялях і кажушках замерлі, бо ў гэты час на іх наставілі рулі вінтовак і байцы. Нечакана дзецюкоў расштурхнула, выбегла сюды высакаватая і тонкая паненка ў доўгай спадніцы, у кароткім кафтаніку і круглай чорнай шапачцы, залямантавала:

— Са-ша!

Пачуўшы гэты знаёмы, толькі цяпер адчайны голас, Мяснікоў запыніўся — у адно імгненне да яго падскочыла гэтая асоба з клункам, кінулася на грудзі.

— Сашачка, забяры мяне з сабою!

Дзецюкі смачна і на розныя лады зарагаталі:

— Гы-гы-гы!

— За камісарыка захацела!

— Мы цяпер цябе таптаць будзем!

Мяснікоў застаўся пагутарыць са сваёю прыхільніцай, а Ландар з Пятровым скрозь ачапленне падаліся да брамы. І ўжо ім паняслося ўслед:

— Накамісарыліся!

— Прадалі нас немцам!

— Чырвоная сволач!

Не зважаючы на злыя выкрыкі, Ландар падаўся па пероне ўздоўж вагонаў з неасветленымі вокнамі, туды, дзе каля слупа з ліхтаром стаяла купка цёпла апранутых людзей: Калмановіч, Кнорын, Селязнёў, Алібегаў, камандзір аховы Вайсдорф.

Ландар падаў руку Калмановічу — сярэдніх гадоў мужчыне ў валёнках, сялянскім кажуху і авечай шапцы, таксама сёння абросламу — і пажартаваў:

— Ну што, у пуць-дарогу, Майсей Іосіфавіч?

— Не вельмі, — маркотна адказаў той. — Усё яшчэ няма паравоза. Расстралялі начальніка станцыі, тагосяго ў дэпо, трэслі іншых — нічога не памагае. Усе клянуцца: ходкія паравозы ў раз'ездзе.

— Сабатаж, — прамовіў Ландар. І да Пятрова: — Хадзем, пазвонім нашым знаёмым у чыгуначны камітэт. Яны павінны памагчы.

Рушылі на станцыю. Яна была пустая і халодная. Пад скупым святлом зайшлі ў кабінет былога начальніка, дзе таксама нікога не было. Толькі над сталом на доўгім дроце вісела лямпа ды на сцяне каля шафкі сіратліва і сумна цікаў стары гадзіннік.

Ландар прысеў на край стала, узяў тэлефонную трубку — тэлефон, на шчасце, працаваў. І калі пачуўся знаёмы прыемны жаночы галасок, ён сказаў:

— Святлана, будзьце ласкавыя, злучыце мяне з чыгуначным камітэтам.

Тэлефаністка злучыла. І досыць хутка.

— Я — Ландар,— прамовіў ён. — Паклічце, калі ласка, Штэймана.

— А яшчэ каго? — пачуўся ў адказ з'едлівы голас. З выклікам пабеларуску. — Беленькага альбо Смірнова?

— Хто вы? — схмурыўся ён.

— Памочнік мінскага каменданта і начальніка гарнізона Адась Аўторак. Так што, калі чаго трэба, гаварыце са мною.

Ландар рашыў не разводзіць лішнія гавэнды, адразу сказаў пра сваё:

— Нам трэба паравоз.

— І ўсё? Чаго так мала?

— Хопіць з нас і гэтага.

— Яшчэ б! Кідаеце на глум, абабралі да ніткі!

— Слухайце! — не вытрываў, павысіў голас Ландар. — Я не жадаю з вамі палемізаваць. Паравоз! І тэрмінова!

— Ёсць паравоз. І не адзін. Але мы можам даць іх толькі з адной умоваю...

— Якая яшчэ ўмова?

— Вярніце нам трыццаць тысяч рублёў.

— Мы не дадзім вам ні капейкі!

— Ну, дык самі цягніце вагоны!

Там, у камітэце, паклалі трубку — тут, на гэтым канцы дрота, у ягонай трубцы раз за разам запіпікала. Назойна, непрыемна. Пунсавеючы ад злосці, Ландар патрымаў крыху трубку, нібы не верачы ў пачутае нахабства, а пасля папрасіў тэлефаністку, каб зноў злучыла яго з былым камітэтам. Але цяпер тая даволі доўга (за гэты час прыйшоў ужо сюды Мяснікоў з Калмановічам) не магла дазваніцца: відаць, той нахабнік перамаўляўся са сваімі, якія, бач, сапраўды ўжо выйшлі з падполля і пачалі самаўпраўнічаць у горадзе. Жыццё ўжо і іх навучыла на ходу падэшвы адрываць.

Аднак ён не паспеў сказаць Мяснікову і Калмановічу пра ультыматум, бо ў гэты час тэлефаністка дала знак, што можна гаварыць па тэлефоне.

— Ландар, — зноў першы назваўся ён. І патрабавальна ўжо: — Неадкладна прышліце прыхаваны спраўны паравоз!

— Хвілінку, — груба перабіў яго ўсё тый жа прыкры, глухаваты бас. — Мы прыйдзем зараз да вас на перамовы. Падбайце, каб нас прапусцілі на станцыю і ахоўвалі.

Той чалавек зноў першы абарваў размову. Ландар, як і дагэтуль, з непрыемным пачуццём хвіліну-другую патрымаў трубку ў руцэ, няўцямна пазіраючы на яе. Адчуў: аж трасе ад абурэння. Па-першае, вунь як ужо размаўляюць, а па-другое, ужо ведаюць, што яны якраз тут, на станцыі.

— Ну, што? — нецярпліва запытаў пунсовы Мяснікоў (можа, расхваляваўся пасля размовы з настойліваю паненкай), узяў з яго рукі трубку і паклаў яе на рычажкі.

— Ідуць на перамовы, — знайшоў сілы ўсміхнуцца. Хоць, мусіць, не вельмі весела.

— Якія перамовы? — выкрыкнуў Мяснікоў, хапіўся за кабур. — Да сцяны сволач!

— На жаль, не паставіш, — уздыхнуў Ландар. І Пятрову: — Ідзіце, сустракайце парламенцёраў.

Той паслухаў, падаўся са станцыі і праз паўгадзіны вярнуўся з незнаёмымі трыма мужчынамі: двое з іх, пажылыя, былі ў цывільнай вопратцы, а трэці, малады, стройны, відаць, нядаўні афіцэр,— у шынялі, але без пагонаў. Усе мелі павязкі на рукавах.

— Адась Аўторак, — казырнуў, басавіта сказаў малады паўвайсковец. — Памочнік каменданта і начальніка мінскага гарнізона. Таксама маю паўнамоцтвы ад Народнага сакратарыята Беларусі, які цяпер, пасля вашага ганебнага ўцёку, выйшаў з падполля і бярэ ўладу ў свае рукі...

— Нас не цікавіць, з якой нары ты вылез і што ты за таракан! — перапыніў яго Мяснікоў. — Давай паравоз ці паставім зараз да сцяны!

Гэты Аўторак самалюбна і з нянавісцю бліснуў бялкамі вялікіх вачэй, пагардліва змераў позіркам невысокага Мяснікова з галавы да ног і даволі стрымана працадзіў праз зубы:

— Я — баявы афіцэр, праліваў кроў на фронце. Па-другое, прадстаўляю законны орган тутэйшай улады. Па-трэцяе, парламенцёр. Дык я рашуча пратэстую супраць хамства, — і, ужо задыхаючыся, ад злосці: — І супраць парушэння ўсіх адпаведных у такіх умовах правілаў...

— Што вы ад нас хочаце? — без выбачэння, але міралюбна запытаў Калмановіч. Чуючы спакойны голас старшыні Саўнаркома, успыльчывы Мяснікоў, закусіўшы ніжнюю губіну, адышоўся ў кут пакоя, пачаў невідушча пазіраць у цёмнае акно.

— Мае калегі — члены новага чыгуначнага камітэта, — вытрымліваў дыпламатычны этыкет, раўніва захоўваў усе адпаведныя працэдуры гэты настырны Адась Аўторак. — Спадар Лазаковіч, — кіўнуў на інтэлігентнага худога мужчыну ў паліто і капелюшы, — ад беларускіх служачых. Пан Збыхальскі, — хітнуў на таксама худога, але трохі маладзейшага мужчыну ў ватоўцы і ботах, — ад польскіх рабочых-бежанцаў. Мы, трое, упаўнаважаны ўручыць вам ультыматум: калі вы хочаце выбрацца адгэтуль жывыя і здаровыя, то павінны вярнуць сто тысяч. Тут жа. Нам.

Расшпіліў гузік на шынялі, прасунуў пад яго руку і дастаў невялікі канверт. Падаў Калмановічу.

— Мы вам ужо ўсё сказалі на гэты конт, — не беручы канверта, прамовіў той. — А слоў сваіх, як ведаеце, мы на вецер не кідаем.

— Тады мы мусім спыніць перамовы, — з выклікам сказаў Аўторак, паклаў на стол свой канверт, казырнуў і па-страявому павярнуўся. За ім моўчкі падаліся і цывільныя.

— Ну, такую тваю! — вылаяўся Мяснікоў. — Дарэмна мы цацкаліся дагэтуль з імі, не выкасілі як след!

— Што будзем рабіць, таварышы? — запытаў Ландар. — Можа, кінем ім адчапное?

— Ні ў якім разе! — заявіў Мяснікоў.— Мы самі не толькі ўмацуем іх, але і зробім у абывацельскіх вачах героямі!

— Але ж і затрымлівацца небяспечна, — паразважаў уголас Ландар. — Увойдзе ў горад Доўбар-Мусніцкі — абкружыць і асадзіць. Не возьме сам, дык датрымае да прыходу немцаў.

І тут, нібы па нейкай дамове, пачуліся далёкія вінтовачныя стрэлы — спачатку хлёсткія, адзінокія, а пасля ўсё часцейшыя і бязладныя. Мусіць, хтосьці страляў у запале і апантанасці. Вось нават захлебястаў кулямёт. Ландар падняў вочы на свайго каменданта — той моўчкі шпарка падаўся на двор. Адтуль нечакана засвістала блізкая станцыйная вадакачка. Неўзабаве ёй у адказ з гнятлівым выццём абзыўнулася некалькі паравозных гудкоў.

— Тэрмінова трэба здабыць паравоз, — задумліва прамовіў Ландар.— Любымі сродкамі.

— Выйсце бачу адно, — рашуча сказаў Мяснікоў. — Яны — нам ультыматум, а мы — ім!

— Які — наш? — запытаў Ландар.

— Навесці гарматы, кулямёты з браневіка на горад і, калі не дадуць паравоза, адкрыць агонь!

— Ты добра ўсвядомліваеш, што раіш? — усклікнуў уражаны такою думкаю Ландар.

— А што параіш ты? Аддаць казну і прыехаць у Смаленск з голымі рукамі? Сустракайце: мы — абласны ўрад, але толькі без капейкі!

Усе змаўчалі, абдумваючы тое, што сказаў Мяснікоў.

— Іншага рэальнага выйсця я не бачу...

Вярнуўся камендант Савета, адразу з парога сыпнуў навіною:

— Ужо на Петраградскай сутыкнуліся беларускія і польскія нацыяналісты. Адны і другія спрабуюць да ўварвання Доўбар-Мусніцкага авалодаць Мінскам. Неўзабаве, таварышы, яны могуць атакаваць і станцыю, наш цягнік. Я ўзмацніў ачапленне, загадаў паставіць на гарышчы станцыі кулямёт, але... У іх, адчуваецца, таксама шмат зброі...

— Дачакаемся! Даперамаўляемся! — прыстрашыў Мяснікоў.

— Не, таварышы, абстрэл горада— гэта самая крайняя мера, — сказаў Ландар. — Агнём мы разбурым не толькі Мінск — найперш веру ў нас.

— А яны нас не пашкадуюць!

— І ўсё ж трэба дабівацца свайго мірным шляхам, — прамовіў Ландар і падаўся да выратавальнага тэлефона.

Але не паспеў падняць трубкі — зноў заявіліся тыя трое з чыгуначнага камітэта.

— Мы вылучаем новыя ўмовы, — казырнуўшы, сказаў знаёмы ўжо Адась Аўторак. — Народны сакратарыят больш дакладна падлічыў, колькі вы за сто дзён свайго панавання вінныя народу. Каля трыста тысяч. Аддасцё цяпер жа — праз паўгадзіны будзеце мець новенькі паравоз, — а пасля знарочыста прыстрашыў: — Перасцерагаю: наша разведка дакладвае, што мінскія ўскраі ўжо займае конніца Доўбар-Мусніцкага...

— А пяцьсот тысяч не хочаце? — ускіпеў Мяснікоў. — Ці мільён?

— Глядзіце самі, — нібы са спачуваннем, а на самай справе з пагрозаю зноў падаў голас паўвайсковец. — Больш мы сюды не прыйдзем, ушчуваць альбо прасіць не будзем. А паколькі мы з Доўбар-Мусніцкім саюзнікі, дык, можа, і ўжывем супраць вас зброю...

Акінуўшы ўсіх позіркам (ці не напужаліся?), Аўторак зрабіў працяглую псіхалагічную паўзу, а пасля, бачачы, што вялікага страху не нагнаў, зноў фарсіста казырнуў і, надаючы сам сабе годнасці, пакінуў станцыю.

— Проста на вачах нахабнеюць!— паматляў галавою Мяснікоў. — А мы цьрымонімся...

— Што ж, кажаш праўду, — пахітаў галавою і Калмановіч. — Калі яны злучацца з рэгулярным польскім войскам, то гэта — ужо не жарты. — Павярнуўся да Мяснікова. — Што ж, перамовы спыняем. Рыхтуй, галоўнакамандуючы, апошнюю тут баявую аперацыю...

— Вось гэта па-дзелавому! — супакоіўся, нават узрадаваўся той і шустра падаўся да Вайсдорфа — начальніка аховы цягніка.

Ландар і Калмановіч замаўчалі. І адзін, і другі ўзбуджана, гнятліва захадзілі. Ландар церабіў сваю бародку, а Калмановіч прасунуў руку пад вопратку і мацаў грудзіну — там, дзе трывожна білася сэрца. А час між тым бег. Вось мінулася поўнач, пайшло на новы дзень.

Зазваніў тэлефон.

Трубку падняў найбольш блізкі да апарата Калмановіч — з падпухлымі ад бяссоння вачыма, але рэзкі, нервовы.

— Я — старшыня Народнага сакратарыята Беларусі, — пачуўся нібы знаёмы хрыплы голас, але на самай справе гэта гаварыў не парламенцёр, а хтосьці іншы. — Мы ставім вам апошні ультыматум: ці вы вяртаеце 500 тысяч, ці мы праз паўгадзіны пачынаем рашучы штурм станцыі і цягніка! Само па сабе зразумела, бой ёсць бой, жыццё ў ім нікому не гарантуецца...

— Чаму — пяцьсот тысяч? А можа, мільён? — паздзекаваўся Калмановіч.

— Мы ідзём на кампраміс. У вашых і сваіх інтарэсах.

— Ясна, — голас у Калмановіча пасталеў. — А цяпер слухайце наш першы і апошні ультыматум. Калі вы праз тыя ж паўгадзіны не падасцё нам спраўны паравоз, мы накрыем горад, вас ураганным агнём з гармат і кулямётаў!

— Варвары!

— Усё! — адчаканіў Калмановіч.— Заўважце час. Трыццаць хвілін вам на ўсё: і на роздум, і на ваша выратаванне.

Калмановіч рашуча паклаў трубку. Ён першы, а за ім і ўсе астатнія выйшлі на перон — тут пачынала ўжо рассейвацца начная цемрадзь і на ўсходзе пульсаваў, набухаў світанак. Цяў мароз, хрумстка рыпеў пад нагамі бела-шэры, сям-там з бліскучымі іскрынкамі снег.

Яны не пайшлі да платформы з браневіком, дзе цяпер мітусіліся байцы, ведаючы, што вайскоўцы на чале з Вайсдорфам і Мясніковым зробяць тое, што трэба, як след. Ландар разумеў: абстрэл Мінска — мусовая крайнасць, але ўсё роўна душой супраціўляўся гэтаму: пабурацца не толькі старажытныя будынкі, але і загіне шмат невінаватых людзей. Маўчаў. Заўважыў: усхваляваны і Калмановіч — раз за разам зыркае на свой гадзіннік і спрабуе ўбачыць, колькі ўжо хвілін прайшло з моманту адліку ультыматума.

— Няўжо не пашкадуюць свой горад, сваіх людзей? — ціха запытаў.

Вось апошнія салдаты схаваліся ў браневіку — у наваколлі стала ціха-ціха, аж вусцішна. Як і перад сапраўдным боем.

Ад платформы з браневіком адарваўся і подбегам пачаў набліжацца сюды чалавек. Мяснікоў. Запыніўшыся, сказаў задыхана:

— Усё. Мы гатовыя.

— Праз дваццаць хвілін можна пачынаць... — ціха прамовіў Калмановіч.

Мяснікоў нічога не адказаў, зноў подбегам пашыбаваў — да платформы.

І тут у напружанай цішыні выразна пачуўся далёкі паравозны гудок, а неўзабаве данеслася ўжо і шпаркае чухканне. Праз хвіліну-другую станцыю асвяціў далёкі пук святла.

— Збаяліся-такі! — усцешыўся Калмановіч.

Як хутка ўбачылі, прыйшло аж два паравозы. Да іх накіраваліся гуртам: Мяснікоў, начальнік аховы Вайсдорф, Ландар і Калмановіч.

— Само па сабе зразумела, залпы адмяняем, — ужо пры пыхлівым паравозе крыкнуў на вуха Калмановічу Мяснікоў. — Калі маем два паравозы, то, лічу, адзін з нашымі людзьмі трэба паслаць наперад і праверыць мост цераз Свіслач.

— Давай, — махнуў са згодаю рукою Калмановіч. І Ландару, з палёгкаю ўздыхнуўшы: — Хадзем у свой вагон. Хоць прысядзем, а то зусім памлелі ўжо ногі.

Як бачылі, праз некалькі хвілін па камандзе Вайсдорфа трое байцоў узабраліся ў кабіну машыніста першага паравоза і загадалі таму выманеўраваць і ехаць да Свіслачы, а другі паравоз у гэты час таксама пачаў манеўраваць, каб стаць наперадзе іхнік вагонаў.

Даволі хутка паравоз, што быў у разведцы вярнуўся — усё, як сказалі, было добра, дык яго, як і другі паравоз, пачалі прычэпліваць да вагонаў.

Ландар увесь гэты час стаяў каля свайго тамбура, хочучы на свае вочы бачыць, што і як робіцца. Хоць салдаты падганялі чыгуначнікаў, і ўсё рабілася без лішняй затрымкі, але ўсё роўна час бег шпарка, а яны ніяк не маглі скрануцца з месца.

Нарэшце свіснуў паравозны гудок. Раз-другі.

— По вагонам! — пачулася гучная каманда Вайсдорфа.

Са станцыі, а таксама і з-за яе пабеглі сюды салдаты з ачаплення. Але не паспелі яны ўсе ўціснуцца ў вагоны, як ужо сюды, на перон, узбеглі цывільныя людзі з вінтоўкамі — відаць, баявыя дружыны гэтага наваяўленага Народнага сакратарыята. Праўда, яны не стралялі, не перашкаджалі садзіцца ў вагоны —канечне ж, іх ахалоджвалі наведзеныя на станцыю стволы гармат і кулямётаў з платформы.

— Таварыш Ландар, — на падножку ўжо ўсчапіўся і Вайсдорф, — праходзьце, калі ласка, у вагон і станьце падалей ад акна. Чорт іх ведае, можа бабахнуць каторы...

Ён паслухмяна падаўся ў вагон — на самым пачатку яго стаяў Калмановіч і ўзіраўся ў акно. Цяпер адступіў, даў яму месца побач з сабою.

У вагоне было цёмна, але цёпла. Як адчуў Ландар, ад цяпла адразу ж запалымнелі шчокі.

Цягнік торгнуўся, заляскаў жалезем, нават нібы пакаціўся назад, а пасля затросся, крануўся і пачаў паціху набіраць ход, адкочвацца ад станцыі і горада, які яшчэ спаў і, канечне ж, не ведаў, што шумела-бурліла на вакзале.

Толькі ён хацеў не тое што сказаць, а падумаць з палёгкаю: «Усё, паехалі нарэшце!», як цягнік нечакана ні то рэзка затармазіў, ні то гвалтоўна тарганўўся, тут жа гучна і адчайна засвістаў паравоз, пачуўся лязгат-трэск, і гэты вагон быццам хіснуўся, быццам нават прыпадняўся — і Ландара, і Калмановіча ды Вайсдорфа аж адкінула ад акна да сцяны купэ.

Цягнік спыніўся.

— Што такое, ёлкі-палкі? — абуральна вырвалася ў Вайсдорфа. Тут жа, займеўшы раўнавагу і абапіраючыся абедзвюма рукамі аб сцены, падаўся на выхад. Ландар — за ім. Калмановіч — услед.

Сышоўшы на расчышчаны ад снегу насып і зноў удыхаючы марознае паветра, Ландар убачыў: іхні вагон мала сказаць закалыхаўся, ён увогуле сышоў з рэек і небяспечна стаў на краі ўзбочыны. Наступны вагон пагрозліва нахіліўся, а вагон з кулямётчыкамі зусім перакуліўся.

— Падстроілі ўсё ж гады крушэнне... — вылаяўся Вайсдорф, прысеў, абгледзеў усё, а пасля падняўся і патлумачыў: — Падымаць вагоны, манеўрываць некалі, таварыш Калмановіч. З хвіліну на хвіліну можа быць і горшае... Раю: людзям з хваста цягніка выйсці, хутка перанесці ў ацалелыя вагоны кулямёты, тое-сёе з харчу і — гайда далей...

— Давайце, — суха адказаў старшыня Саўнаркома Заходняй вобласці.

Вайсдорф падаў каманду — чырвонаармейцы высыпалі з вагонаў і пачалі хуценька пераносіць зброю і скрынкі з харчам, пасля перакулілі нахіленыя вагоны і прычапілі хваставыя. Ландар з Калмановічам тупалі па ўзбочыне, мусіць, абодва аднолькава люта палымнеючы злосцю на станцыйных чыгуначнікаў і на верхаводаў з Народнага сакратарыята — канечне ж, якраз тыя падбухторылі ўчыніць гэтую аварыю.

Падышоў Мяснікоў.

— Можа, смалянём па станцыі на развітанне? — запытаў. — Падзякуем як след за такія праводзіны?

— Не, — коратка кінуў Калмановіч. — Будзем вышэй злачынства і асабістай крыўды...

Праз паўгадзіны, калі пачало ўжо світаць, яснецца наваколле, цягнік зноў крануўся, пакінуў Мінск і хутка паімчаў на Смаленск.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Святлана АЛЕКСІЕВІЧ

Азіраючыся назад, усё, што зроблена, убачана, перажыта, уяўляецца ўжо зусім у іншым святле.

Выйшлі ў свет пад адной вокладкай у выдавецтве «Советский писатель» абедзве мае кнігі: «У вайны не жаночы твар» і «Апошнія сведкі». Для мяне гэта ў нейкім сэнсе вынік працы апошніх гадоў.

З таго, што лічу галоўным, я б яшчэ назвала працу над першым фільмам цыкла, прысвечанага самым трагічным старонкам нашай гісторыі — гадам, якія я б назвала гадамі «сталінскага сацыялізму». У гэтым фільме мы стараемся зразумець драму таго часу, энергію таго часу.

Зараз многія гавораць: маўляў, колькі ўжо можна пісаць пра Сталіна, пра катаў і ахвяры. Лічу, трэба пісаць аб гэтым столькі, колькі патрабуецца, каб адчуць сябе свабоднымі людзьмі ў свабоднай краіне.

Самае моцнае ўражанне — гэта, вядома, паездка ў Афганістан. Сама не будучы на вайне, я напісала пра яе дзве кнігі. І раптам — ваенны самалёт, чужыя горы, нашы параненыя салдаты, пяцігадовы афганскі хлопчык, які лашчыць вуснамі кімсьці падоранае плюшавае мядзведзяня, бо абедзвюх рук у яго няма— адарваны асколкам артылерыйскага снарада, труны, што паляцяць у Саюз, слёзы афганскіх матак, боязь сваёй асабістай смерці, пах натруджанага смяротнага металу і пах чалавечай крыві, што запяклася на сонцы...

Цяжка быць шчаслівым чалавекам, займеўшы такую памяць. Каб пазбавіцца гэтага, адно выйсце — працаваць.

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

Гады, як і людзі, розныя. Адны больш шчаслівыя, другія менш. Адны больш плённыя, другія не дужа. Я б не сказаў, што гэты год для мяне быў багаты на плён: пісаў я мала, друкаваўся яшчэ менш. Гэты год для сябе я хутчэй бы назваў **годам асэнсавання.** Асэнсавання гісторыі, часу, сябе. Было што чытаць, было над чым і пра што думаць. А гэта таксама працэс творчы. Асабліва сёння, калі мы як бы ў другі раз праходзім універсітэт, у якім многія дысцыпліны чытаюцца больш праўдзіва і больш аб'ектыўна, калі ў грамадстве адбываецца пераацэнка каштоўнасцей, многія з якіх аказаліся фальшывымі. Усё гэта прымушае не толькі думаць, але і шмат што мяняць у сабе і ў сваіх адносінах да шмат якіх з'яў. Я не веру людзям, якія лічаць, што ім мяняць нічога не трэба, што ў іх усё ідэальна. Усе мы дзеці свайго часу.

Як і большасць маіх равеснікаў, я з нецярпеннем чакаў XIX партканферэнцыі. Глядзеў, слухаў, чытаў, спадзяваўся. Верыў і веру ў далейшую дэмакратызацыю і гуманізацыю грамадства. Праўда, калі быць шчырым, эйфарыю збілі падзеі, што адбыліся 30 кастрычніка ля Маскоўскіх могілак, якія яшчэ раз пацвердзілі старую ісціну, што на ўсё трэба глядзець цвяроза: новае нараджаецца толькі ў барацьбе са старым.

І яшчэ. У гэтым годзе ў мяне нарадзіўся другі сын. Яго нараджэнне супала з выхадам маёй другой кнігі. У гэтым бачыцца добры знак.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Ігар ЛУЧАНОК

Музычнае жыццё рэспублікі, якая адзначае сваю 70-ю гадавіну, было сёлета багатае на падзеі. Адметна прайшоў фестываль прэм'ер беларускай музыкі «Мінская вясна», у рамках якога адбылося і выязное пасяджэнне Усесаюзнай камісіі па сімфанічнай музыцы Саюза кампазітараў СССР. На высокім міжнародным узроўні праводзіўся ў Віцебску І Усесаюзны фестываль польскай песні, пад час якога была паказана і праграма з музыкі беларускіх кампазітараў. Тады ж вядомы польскі музычны дзеяч Я. Славіньскі і я дамовіліся наконт далейшых кантактаў паміж музыкантамі нашых рэспублік. Адзначылі мы і 50-годдзе Саюза кампазітараў БССР.

Сёлета нашы музыканты, самадзейныя артысты выступалі на розных кантынентах і выконвалі творы, што нарадзіліся на беларускай зямлі. Інструментальны і песенны голас Беларусі гучаў на ўсесаюзных кампазітарскіх пленумах у Горкім, у Адэсе, канцэрт беларускай камернай музыкі адбыўся ў Маскве і там жа — аўтарскі канцэрт Э. Ханка. Опера С. Картэса «Матухна Кураж» прывабіла музычны тэатр Якуціі — там ужо адбылася прэм'ера. І вось — навіна, якую днямі паведаміў мне Анатоль Васільевіч Багатыроў: ягоны Канцэрт для кантрабаса прагучаў у Францыі.

Мне давялося выступаць з творчымі справаздачамі перад савецкімі воінамі, якія служаць у ПНР, у ГДР, удзельнічаць у фестывалі салдацкай песні ў Берліне. Адна з нядаўніх сустрэч са слухачамі ў Мінску была дабрачыннай — усе яе ўдзельнікі перавялі грашовы збор на рахунак дапамогі братняй Арменіі.

Творчасць наша неад'емная ад тых падзей, якімі жывуць рэспубліка, краіна. Праблемы перабудовы хвалююць і нас, творчых работнікаў. Не можа не трывожыць тое, як бюракратычныя бар'еры тармозяць перабудову, як, бывае, «прабуксоўвае» яна ў самых розных сітуацыях. Вось, да прыкладу, каб стварыць у Беларусі такое неабходнае для прапаганды нашага музычнага мастацтва аддзяленне Цэнтрмузінформа, кіраўніцтву саюза давялося доўга і марна блукаць па розных кіруючых інстанцыях, а ў Мінфіне БССР нават сутыкнуцца з чыноўніцкім неразуменнем элементарных праблем культурнага жыцця.

Час сёння цікавы і складаны. Немагчыма заставацца абыякавым да таго, што адбываецца навокал — у рэспубліцы, у горадзе, у справах вялікіх і будзённых. Многае радуе, акрыляе, але нямала падстаў і для засмучэння, і для расчаравання. Мяне засмучае, калі штучна прыніжаецца ў нас аўтарытэт творчай інтэлігенцыі. Хацелася б большага разумення таго, што без удзелу творчай і навуковай інтэлігенцыі перабудова будзе затарможвацца, а калі казаць па шчырасці — проста не адбудзецца. Чаму ў такой далікатнай сферы, якой з'яўляецца кіраванне культурай, духоўным жыццём грамадства, здараюцца — і гэта ўсім вядома — недалікатныя, непаразумелыя сітуацыі?

Відаць, не ўсім нам тут, у Беларусі, хапае агульнай культуры і ўмення карыстацца дабротамі дэмакратыі, правам галоснасці, уладай. Я веру ў тое, што курс на перабудову, узяты Цэнтральным Камітэтам нашай партыі, — адзіна правільны курс для нашага грамадства, я падтрымліваю ідэю перабудовы, я ўсёй душою за яе. Але чаму пры гэтым я павінен не давяраць сваім таварышам — вядомым, аўтарытэтным пісьменнікам, мастакам, вучоным, чаму я павінен сумнявацца ў шчырасці іх жадання паслужыць перабудове? Для мяне, чалавека таксама творчага, гэта вельмі важнае пытанне. Шкада, што ў некаторых адказных асоб адчуваеш не столькі павагу да творчых работнікаў, колькі чыноўніцкае раздражненне. Ім бы толькі выкарыстоўваць творцаў для чарговай кампаніі, для «птушачкі»: маўляў, мерапрыемства праведзена, культурная дзейнасць рухаецца.

Але вярнуся да спраў нашага саюза. Здавалася б, час ідзе наперад, неўзабаве будзем рыхтавацца да чарговага з'езда кампазітараў; але ці многае мяняецца? Мы дасюль залежныя ад Масквы, ад усесаюзнага праўлення ў пытаннях прапаганды беларускай музыкі. Калі праводзіліся буйныя музычныя акцыі ў Францыі, у ЗША, абышлося без беларускіх кампазітараў. Дапусцім, тут свае спецыфічныя цяжкасці. Але чаму ігнаруюць наш саюз, калі міжнародныя музычныя форумы праводзяцца ў межах краіны — у Ленінградзе, у Маскве? Мы б знайшлі, што паказаць у канцэртах.

Радуемся за малодшага нашага калегу У. Солтана, аўтара оперы «Дзікае паляванне караля Стаха», з надзеяй чакаем прэм'еры. Але мы чакаем і іншага, таго, што напісана беларускімі кампазітарамі для тэатра раней, ды чамусьці так і не пастаўлена ў Мінску. 70 гадоў рэспубліцы — хіба не нагода ўспомніць нашы дасягненні ў галіне мастацтва? Чаму кіраўніцтва нашага тэатра оперы і балета (дырэктар В. Букань, галоўны дырыжор Г. Праватораў, члены мастацкага савета) па-ранейшаму не дбае пра творы тых, хто ў розны час рабіў адметнай ягоную афішу: В. Залатарова і Я. Цікоцкага, Д. Лукаса і А. Туранкова, М. Аладава і Р. Пукста, А. Багатырова і Я. Глебава?..

Сёлета ў «ЛіМе» з'явілася рубрыка «Прэстыж роднай мовы». Я гэтае паняцце пашырыў бы: шанаваць і ведаць трэба аднолькава і мову, і музыку свайго краю. І пашану да роднай мовы і роднай песні (а яна, песня, выток усёй нашай прафесійнай творчасці) трэба выхоўваць з маленства. У гэтым зарука прэстыжу і мовы нашага народа, і беларускай музыкі, якія павінны гучаць у суладдзі.

Валерый МАСЛЮК

Год адзначаны для мяне ўдзелам у XIX партыйнай канферэнцыі, працай у СТД БССР як старшыні камісіі па рабоце з творчаю моладдзю (сярод яе вынікаў — стварэнне эксперыментальнага тэатра «Шанц»), здымкамі ў тэлефільме «Я, Іван Дамінікавіч...», дзе выступаю ад імя Купалы, а таксама пачаткам першага семестра акцёрска-рэжысёрскага курса ў БДТМІ, набранага спецыяльна для Рускага тэатра БССР. Але мара і жаданне рабіць той адзіны, толькі свой тэатр аддаляецца, і хутка, баюся, надыдзе момант, калі мая творчасць уступіць у канфлікт з грамадскай дзейнасцю...

На жаль, нам сёння даводзіцца шмат сіл і намаганняў траціць на неўласцівыя для акцёра, рэжысёра, увогуле для мастака функцыі. Мы, вядома, кіруемся высакародным жаданнем змяніць да лепшага свет, займаемся палітыкай, эканомікай, экалогіяй... Але як бы не згубіць за ўсім гэтым — надзённым і патрэбным — мастака.

Музыка

Не таму, што сёння гэта модна

Першае выступленне «Жывіцы» прысвячалася 70-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі

Слова якое мудрае — жывіца: у ім ранішні подых бароў з роснымі ягаднікамі, гаючы водар хваёвай смалы, цяплынь аблашчаных сонцам бурштынавых ствалоў, чысціня лясных крыніц, вечная гамонка дрэў, галасы зямлі, краю...

Слова мілагучнае, слова спеўнае, жыватворнае. Гожае імя атрымалася з яго для новай суполкі музыкаў. Утварылася тая суполка, ансамбль народнай музыкі «Жывіца», па ініцыятыве заслужанай артысткі БССР Валянціны Пархоменкі; «месца прапіскі» — Дзяржтэлерадыё БССР.

Дэбют адбыўся на сцэне рэспубліканскай філармоніі 11 снежня. Люду на канцэрце было шмат, і не толькі з колаў музычных; маладыя навукоўцы, пенсіянеры, дзятва. Ёмістая, размаітая праграма першага выступлення «Жывіцы» — каля паўсотні песень, інструментальных найгрышаў з элементамі сялянскіх абрадаў (нават з «Жаніцьбай коміна»!), са скокамі, жартамі, прыпеўкамі. Яна, гэтая праграма, суправаджалася авацыямі, захопленым рознагалосым «брава!»; артысты часта рабілі вымушаныя паўзы, каб прыняць кветкі ад гледачоў, каб перачакаць хвалю аглушальных воплескаў пасля спеваў ці полькі — дый зайграць-заспяваць далей.

А спяваюць, іграюць яны тое, што «падслухана», запісана ад людзей, якія жывуць у Паставах і ў Мазыры, на Веткаўшчыне і на Піншчыне, на хутары Сакаўшчына пад Маладзечнам і ў вёсцы Рачэнь Любанскага раёна... Спяваюць, іграюць з такім жарам, імпэтам, з такою душою — быццам сваё ствараюць, быццам сэрцам сваім дзеляцца. Але чаму, урэшце, «быццам»? Гэта ж уся музыка і ёсць — сваё, крэўнае, сэрцам прачутае, пражытае. Яны і майстры народных выканаўцаў шануюць, вывучаюць. І самі фальклор апрацоўваюць. Яны гэтай музыкай жывуць.

Саліст ансамбля А. КАЗАК і заслужаная артыстка БССР В. КАРЭЛІКАВА.

Жывое мастацтва «Жывіцы» —гэта не тыя, амаль пяцьдзесят гадоў вядомыя праграмы народных танцавальных ці харавых калектываў, якія «захоўвалі» фальклор, «засушвалі» некалькі дзесяткаў мелодый і ператваралі іх у музейную калекцыю, цікавую найперш для замежных турыстаў. «Жывіца» не прэпарыруе і не кансервуе фальклор, дае адчуць гледачам сінкрэтычную прыроду народнага мастацтва, дзе спляліся зыкі вяснянкі, застольныя досціпы, суровы рытм рэкруцкай песні, гамонка сватоў, галашэнне нявесты, прымхі паганскіх часоў, каленцы кадрылі і полькі...

Немагчыма адвесці вачэй ад гэтых дзяўчат і хлопцаў, такіх жвавых, дасціпных, ладных. І пяюць, і на некалькіх інструментах іграюць, і да скокаў

(Пачатак на стар. 3).

«Пра тое, чым жывуць людзі...»

ПЕРШЫ АДРАС — плошча Веры Харужай, кіёск № 30. Месца — бойкае, люднае: паблізу — Камароўскі рынак, прыпынак грамадскага транспарту. Падышлі мы да кіёска ў сем гадзін раніцы, калі ён толькі што адкрыўся. Акуратнымі стосамі раскладзены на прылаўку газеты, часопісы. А вось «ЛіМа» за шыбінамі вокнаў чамусьці не відаць. Сваё законнае месца сярод іншых перыядычных выданняў ён заняў толькі пасля таго, як чарговы пакупнік, зусім яшчэ малады чалавек, здзіўлена запытаў у кіяскёркі: «А што, хіба сёння «ЛіМа» няма?» Нашага чытача просім на хвіліну затрымацца, даць нам кароткае інтэрв'ю.

Павел **Алейнікаў** працуе інжынерам на заводзе імя Арджанікідзе, летась скончыў факультэт прыкладной матэматыкі БДУ імя У. І. Леніна.

— Да сёлетняга года «ЛіМа» не чытаў, — гаворыць ён, — а цяпер не прапускаю ніводнага нумара, бо менавіта на яго старонках знаходжу адказы на многія пытанні, якія хвалююць мяне. Я — беларус, але толькі нядаўна зразумеў, што павінен ведаць гісторыю свайго краю і народа, яго культуру, мову. Хачу ведаць, чым жыве сёння моладзь, наша творчая інтэлігенцыя, і для сябе знаходжу на лімаўскіх старонках цікавыя публікацыі пра нефармальныя аб'яднанні, пра іх удзел у адраджэнні нашай гістарычнай спадчыны. Мне думаецца, папулярнасць штотыднёвіка вырасла таму, што ён імкнецца даваць аб'ектыўную ацэнку падзеям, якія адбываюцца ў наш час — час галоснасці, дэмакратызацыі грамадства, плюралізму думак. Праўда, здаецца мне, што «ЛіМ» часам доўга распрацоўвае адну і тую ж тэму, забываючыся на тое, што навокал шмат іншых тэм і праблем, якія таксама патрабуюць увагі...

Пасля публікацыі ў нашай газеце артыкула З. Пазняка і Я. Шмыгалёва «Курапаты — дарога смерці» стаў купляць «ЛіМ» і вадзіцель І. Бяляй, які працуе ў Міністэрстве сувязі БССР. Ігар Георгіевіч вельмі спяшаўся, таму літаральна на хаду выказаў пажаданне друкаваць больш матэрыялаў, звязаных з дзейнасцю «Мартыралога Беларусі», «Талакі», іншых так званых нефармальных аб'яднанняў.

— І яшчэ, — дадаў ён на развітанне, — хацелася б, каб «ЛіМ» можна было набыць не толькі ў сем ці восем гадзін раніцы, але і на працягу дня. Бо часта яго ў кіёсках не знойдзеш, калі крыху спазнішся...

Мы насцярожыліся: зноў тыя ж чатыры ці пяць экземпляраў на кіёск? Улучыўшы вальнейшую для гаспадыні кіёска хвіліну, загаварылі з ёй. Людміла Паўлаўна Халіе паведаміла, што «ЛіМа» яна апошнім часам атрымлівае па 40 экземпляраў. І растлумачыла, усміхнуўшыся:

— І што цікава, дык гэта тое, што разыходзіцца «ЛіМ» вельмі хутка, за нейкія дзве гадзіны.

Прыемна было чуць гэта, аднак жа — што, сапраўды, рабіць таму чытачу-пакупніку, які «крыху спазніцца»?

Валянціна Міхайлаўна **Ляўко**, гаспадыня кіёска № 254, што каля Акадэміі навук на вуліцы Сурганава, быццам угадала гэтыя нашы думкі, бо паскардзілася:

— Цэлы дзень пытаюцца, ці ёсць «ЛіМ». Стамлюся адказваць, што яго ўжо раскупілі. Дваццаці экземпляраў, якія я атрымліваю, хапае на пятнаццаць хвілін работы. А ў мяне тут і Акадэмія навук, і два інстытуты, і Дом друку... Я і сама заўсёды чытаю ваш «ЛіМ» і разумею незадаволенасць пакупнікоў, якія не могуць набыць цікавую газету. Дык чаму б не даць столькі, каб хапіла ўсім, каб я не адмаўляла пакупнікам? З задавальненнем перайшла б на гаспадарчы разлік, каб і людзі не абураліся і самой каб атрымліваць асалоду ад працы, каб я магла прадаваць не толькі праязныя талончыкі і паштоўкі, а столькі перыядычных выданняў, колькі іх спатрэбіцца пакупнікам...

Старанных, ініцыятыўных людзей мы сустракалі ў многіх кіёсках «Саюздруку».

Прынамсі, у кіёсках № 295, што на скрыжаванні вуліц Якуба Коласа і Сурганава (кіяскёрка **З. Р. Зарэцкая**), № 35 на плошчы Леніна **(Т. С. Кокіна)**, гасцініцы «Мінск» **(А. А. Балматава)**, № 11 каля Галоўпаштамта на Ленінскім праспекце **(Н. А. Яцына)**, № 1 на плошчы Перамогі **(А. М. Трушына)**, № 2, што ў інстытуце замежных моў **(В. М. Ерахавец)**, дзе мы пабы-

На сцэне — «Жывіца».

Лаўрэат усесаюзнага і міжнароднага конкурсаў заслужаная артыстка БССР В. ПАРХОМЕНКА.

спрытныя: тут табе і полька ляхавіцкая, і вярхлецкая, і варапаеўская, і «Букецік», і «Падыспань», і «Груздаўская кадрыля».

Немагчыма не заўважыць вынаходлівасць інструментальнай партытуры (музычны кіраўнік А. Балотнік, апрацоўкі, апроч яго, рабілі артысты «Жывіцы» У. Каштальян, В. Людчык, В. Тарабука і кампазітар А. Рашчынскі): ці не кожны нумар праграмы нясе адметную гукавую фарбу. То на фоне цымбалаў «закукуе» акарына і жалейка павядзе знаёмы матыў (уступная кампазіцыя «Адкуль пайшла песня»), то пачнуць гарэзаваць у карагодзе скрыпка і бубен, то дзве скрыпкі і дзве саломіны, аздобленыя жытнёвымі каласамі, абвесцяць прыход лета. Далучацца да песень ліра, дудкі, басэтля. У польцы «Суботка» бубен «прыдбае» калатушачку і металічны трохкутнік заценькае срэбным сваім галаском, а ў «Вясельным маршы» паявіцца кларнет. І колькі пройдзе адмысловых полек — з бёрдамі, з гуслямі, з гугнявым скурана-футраным «бугаём», з маленькім званочкам, нават — з маслабойкаю! Пачуеш звон бразготак і цокат каробачкі («Шэрая лашадачка»), класічную флейту і свісцёлку-«салавей» (вакальныя дуэты «Устану, устану...», «У садзе гуляла»).

Многія з гэтых інструментаў унікальныя, зробленыя народнымі майстрамі акурат для музыкантаў «Жывіцы», якія ці не ўсе — мультыінструменталісты.

Так, спраўныя музыкі ў ансамблі, і як тут не ўспомніць кожнага! Завіхаецца з бубнам у руках заслужаная артыстка БССР Валянціна Карэлікава. Зухавата, з агнём грае першы скрыпач, лаўрэат рэспубліканскага конкурсу Васіль Тарабука: ледзь толькі смык не ператрэсца! Упэўнена мяняюць цымбалы на гуслі Ганна Лікіна і Вольга Строк; баян, гармонік, ліру пабачыш у руках Аляксандра Балотніка; дудары Аляксандр Цыбулька і Пятро Каваленка валодаюць, адпаведна, кларнетам і флейтай. Скрыпач Уладзімір Каштальян яшчэ і ўваходзіць у сцэнічны вобраз цельпуканатага хлопца Змітрака. Наогул, усе яны — і альтыстка Алена Бабровіч, і лаўрэат міжнароднага конкурсу баяніст Віктар Людчык, і ўдарнік Алег Рослік, і Васіль Станкевіч, які іграе на басэтлі і кантрабасе, — удзельнікі своеасаблівага музычна-сцэнічага дзеяння.

Нарэшце, пра салістаў Валянціну Пархоменку і Аляксандра Казака. «Жывіцы» яшчэ, як той казаў, і ў думках не было, а іх вакальны дуэт ужо добра ведалі аматары беларускай народнай песні. Пісаў пра іх і і «ЛіМ». І магло, вядома, стацца так, што ўвесь маляўнічы музычны свет «Жывіцы» ўспрымаўся б не больш як фонам для выступлення дзвюх «зорак». Магло — ды, на шчасце, мастацкі кіраўнік ансамбля В. Пархоменка дбала пра тое, каб поруч з ёй працавалі таленавітыя аднадумцы, — вось мы і пабачылі на сцэне цэлае сузор'е талентаў.

Цудоўна, што мае «Жывіца» сапраўднага мастацкага лідэра. Хто сёння змог бы, напрыклад, праспяваць гэтак пранікнёна, артыстычна, як В. Пархоменка, звонкую «Вяснянку», трагічныя па змесце «Ой жа, мама, маменька» і «Адлятае мой саколік», жартоўную «А я ў печы не паліла» (у дуэце з А. Казаком)?..

Дарэчы, перад пачаткам таго канцэрта Ніл Гілевіч, які ўступным словам вітаў падзею, нараджэнне «Жывіцы», шчыра і хораша разважаў пра загадкавасць таленту Валянціны Пархоменкі. Спявачка, гаварыў ён, прываблівае і характаром голасу, і веданнем песні, і тым, што жыве ў песні. Пяе народныя песні не таму, што гэта сёння нейкім чынам выгадна, што гэта будзе падтрымана, — пяе, бо не можа іх не спяваць.

Яно так. І зусім натуральна, што менавіта вакол яе згуртаваўся калектыў маладых аднадумцаў, сапраўдных музыкантаў, гэтаксама, як і яна, захопленых ідэяй адраджэння незлічоных меладыйных скарбаў народа. Хай толькі іх выступленні не будуць рэдкія, і тады мастацтва «Жывіцы» зойме грунтоўнае месца ў нашым духоўным жыцці.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Май ДАНЦЫГ

Гэты год запомніцца мне ў першую чаргу актывізацыяй грамадскай думкі і як вынік — ажыўленне культурнага жыцця. Нарэшце стала агульнапрызнанай тая ісціна, што кожная культура каштоўная сваёй самабытнасцю. Гэта выявілася, на маю думку, у стварэнні нацыянальных культурна-асветніцкіх таварыстваў — палескага, польскага, яўрэйскага. Сам я — член апошняга.

Стварэнне гэтых суполак будзе спрыяць развіццю культуры Беларусі ўвогуле.

Сённяшні час у мастацтве многім нагадвае мне гады так званай «адлігі», часы станаўлення «суровага стылю» (гэта была сапраўдная рэвалюцыя ў пластычных мастацтвах). Дваццаць гадоў назад я шукаў вобраз часу ў панарамных краявідах, шматфігурных сюжэтных карцінах, прысвечаных драматычным падзеям ваеннай пары.

Сёння я спрабую ўбачыць рысы часу ў тварах канкрэтных людзей. Думаю, што партрэт хоць і лічыцца камерным мастацтвам, можа даволі выразна выяўляць сацыяльную пазіцыю мастака.

Маё стаўленне да апошніх падзей у сацыяльным жыцці рэспублікі я выказаў партрэтамі Анатоля Анікейчыка, Алеся Адамовіча і Васіля Быкава, што экспанаваліся на Рэспубліканскай выстаўцы жывапісу.

Я памятаю, як калісьці «адліга» змянілася брэжнеўшчынай. Гэта нам перасцярога! Перабудова сама сабою неабарачальнай не стане. Тут патрэбна ўдумлівая праца ўсяго грамадства і кожнага грамадзяніна паасобку.

Генадзь ДАВЫДЗЬКА,

акцёр Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы

Сёлетні год — бурлівы, мітуслівы, з рэзкімі перападамі надвор'я і палітычных абставін — амаль зусім адабраў рэшткі вольнага часу, пабольшаў эканамічную, сацыяльна-бытавую залежнасць і прыніжанасць... Ён жа надаў упэўненасці (ці, не дай божа, ілюзіі ўпэўненасці), што і ад мяне нешта залежыць, што і я магу нешта зрабіць, каб хоць дзеці нашы мелі магчымасць жыць у прававой дэмакратычнай дзяржаве. Прыйшла свядомасць, усталявалася ўласная грамадзянская пазіцыя, крытычнае, цвярозае разуменне часу (усім Купалавым тэатрам мы віталі ўтварэнне «Мартыралога Беларусі» і далі ў яго фонд першы дабрачынны спектакль). Аднак шлях да разумення Ісціны (як філасофскай катэгорыі) чамусьці стаў цяжэйшы...

Адбыўся (упершыню) мой творчы вечар. Быў «браны сакратаром партбюро тэатра і надрукаваў лірычныя вершы ў часопісе «Крыніца». Знайшоў агульную мову з дачкою Янінаю і страціў узаемаразуменне з цэлым шэрагам адказных работнікаў...

валі. А галоўнае, нідзе не адчулі непрыязнага стаўлення да беларускіх выданняў, з чым сутыкаліся год назад.

ЧЫМ ВЫТЛУМАЧЫЦЬ гэтыя станоўчыя зрухі? Адказ на пытанне — у словах чытачоў, з якімі нам удалося пагутарыць тым суботнім ранкам. Мы пачулі ад іх нямала добрага ў адрас нашага штотыднёвіка. Ды, зрэшты, шукалі мы сустрэч з чытачамі не дзеля гэтага. Куды важней нам было пачуць чытацкія прапановы, заўвагі, пажаданні, пачуць ацэнку зробленага рэдакцыйным калектывам і ўведаць, што, на іх думку, намі яшчэ не зроблена, разам з імі пашукаць выхаду на новыя тэмы і рубрыкі, разам пашукаць большай нашай з імі паразумеласці, (што толькі і можа быць асноўнай умовай таго, каб чытач не размінаўся з газетай). Рады, што чытачы выявілі сябе самымі шчырымі, зацікаўленымі, прынцыповымі і сур'ёзнымі нашымі дарадцамі.

Аляксандр Сяргеевіч **Краськё**, дацэнт БПІ:

— На нашай кафедры тэарэтычных асноў электронікі, «ЛіМ» чытаюць амаль усе. І не толькі выкладчыкі, а і студэнты. Нас, «тэхнароў», таксама цікавяць пытанні мовы, літаратуры, гісторыі Беларусі. І «ЛіМу» абавязкова трэба працягваць гаворку пра гэта, гаворку сур'ёзную, паслядоўную, прынцыповую. Падзеі 30 кастрычніка ў Мінску ўскалыхнулі ўсіх нас, паказалі, што з адміністрацыйна-апаратнай бюракратыяй трэба змагацца рашуча і бескампрамісна. Публікацыі, якія паявіліся ў друку пасля гэтых падзей, кропак над «і» не расставілі. Вось чаму вельмі важна мець «ЛіМу» сваю пазіцыю, весці сваю, скажу так, генеральную лінію, абапіраючыся на думку чытачоў. «ЛіМ», па-мойму, імкнецца гэта рабіць. А яшчэ — больш увагі варта аддаваць сацыяльным пытанням і праблемам экалогіі...

Мікалай Аляксандравіч **Жучонак**, майстар механічнага завода імя Вавілава:

— Мне хацелася б, каб на старонках «ЛіМа» было больш матэрыялаў пра выкрыццё сталінскіх рэпрэсій на Беларусі. Гэта баліць усім. Спыняць гаворку пра гэта нельга. Сталіншчыну, яе злачынствы трэба выкрыць да канца. А што з Курапатамі? Здаецца, тэму гэтую вы да канца не давялі?..

Ніна Мікалаеўна **Скуратовіч**, санітарка 1-й клінічнай бальніцы:

— «ЛіМ» чытаем усёй сям'ёй. Муж працуе ў друкарні, гэта ён далучыў нас да вашай газеты. А што пажадаць газеце? Амаль не бачу на старонках «ЛіМа» матэрыялаў па праблемах медыцыны. Можа, гэта не ваша спецыфіка? Але калі вас людзі чытаюць, дык, мусіць, трэба пісаць пра ўсё, чым яны жывуць...

Людміла **Навіцкая**, вядучы інжынер Міністэрства аўтатранспарту БССР:

— Трэба як мага больш грунтоўна асвятляць праблемы экалогіі. Гэта праблемы веку. Наша ж рэспубліка ў дадатак перажыла яшчэ і Чарнобыль. А з вашых публікацый мала можна ўведаць пра тое, як цяпер жывецца там людзям, ці адродзіцца калі нармальнае чалавечае жыццё ў забруджаных рэгіёнах. Хай бы выступіў у «ЛіМе» галоўны санітарны ўрач рэспублікі ды без усялякіх недагаворак растлумачыў сітуацыю...

Галіна **Хачанка**, інжынер спецыялізаванага ўпраўлення «Белсантэхмантаж» № 2:

— Найперш шукаю ў штотыднёвіку артыкулы па мастацтве. Знаходжу не ўсё, што хацелася б. Сачу за гаворкаю па праблемах адраджэння мовы. Сама беларуска, а размаўляю на роднай мове кепска. Пайшла б на курсы па вывучэнні роднай мовы, але дзе яны, такія курсы? З мужам і сынам дома вучымся размаўляць па-беларуску. Сыну шэсць гадоў, хацелі б аддаць у беларускую школу, але ў нашым раёне яе няма. Ды і нідзе няма. «ЛіМу» трэба яшчэ больш настойліва змагацца за тое, каб побач з рускай школай была і беларуская. Абрыдла адчуваць сябе непаўнацэннай. Хай бы хоць дзеці нашы не зведалі гэтага. Пакуль жа нават і кніжак класікаў у перакладзе на беларускую мову вельмі мала. Мова — не перашкода, як сёй-той лічыць. Вунь выйшаў «Замежны дэтэктыў» па-беларуску і не залежыўся ў кнігарнях...

ВОСЬ ТАКІЯ яны былі, нашы сустрэчы ля кіёскаў. Сустрэчы гэтыя радавалі (не ў прыклад мінулагоднім), бо відавочна пацвярджалі, што колькасць прыхільнікаў «ЛіМа» апошнім часам павялічваецца (дарэчы тут будзе сказаць, што тыраж штотыднёвіка ў параўнанні з сёлетнім вырас з 13 да 19 — амаль на шэсць тысяч экземпляраў). Напрыклад, кіёск ля Галоўпаштамта цяпер атрымлівае 60 экземпляраў «ЛіМа», замест 12 на пачатку года...

Тым не менш... Рэйд мы наладзілі, як і мінулагодні раз, па сталічных кіёсках, гаварылі, бралі інтэрв'ю ў жыхароў Мінска. А як у правінцыі? Прыпомніўся ліст аднаго нашага чытача з Віцебска пад красамоўнаю назваю «Ці дайшла да нас перабудова?», які не так даўно быў змешчаны ў штотыднёвіку. На пастаўленае ў загалоўку пытанне адказ у лісце быў адназначны: пакуль што не надта дайшла. Прыпомніўся і другі ліст, які прыйшоў у рэдакцыю днямі. Яго напісаў наш чытач з Лепеля, журналіст Уладзімір Шушкевіч. Ліст такога, зусім не радаснага зместу: «Зазірнём у суботу раніцай у кіёскі «Саюздруку». У Лепелі з чатырох такіх гандлёвых кропак толькі ў кіёску гідрамеліярацыйнага тэхнікума знайшоў «ЛіМ». Будучы ў камандзіроўцы ў Наваполацку, пачуў ад кіяскёркі, што прадае перыёдыку на аўтавакзале: «ЛіМ» наогул да яе ў кіёск не паступае. Не было штотыднёвіка і ў кіёсках на галоўнай гарадской магістралі Наваполацка — вуліцы Маладзёжнай. Дарэмнымі аказаліся мае блуканні ад кіёска да кіёска ў пошуках «ЛіМа» і ў цэнтры Віцебска. Толькі за горадам, у кіёску абласной бальніцы, пашанцавала — «ЛіМ» туды дастаўляецца рэгулярна ў колькасці... аднаго экземпляра». Дзе гарантыя таго, што ў іншых абласцях і раёнах Беларусі лепшае становішча? Няма такой гарантыі.

А ўслед за гэтым згадвалася і тое, што па-ранейшаму, як і год назад, нейкая вельмі ж скупая, непрадуманая, выпадковая інфармацыя аб змесце чарговага нумара «ЛіМа», якую робіць радыё ў сваіх ранішніх аглядах друку; і тое, што выдавецтва і друкарня каторы год так і не вяртаюць «ЛіМу» ягоны дзень выхаду ў свет — пятніцу, што ён усё яшчэ прыходзіць да чытача на наступны дзень, у суботу.

НА ГЭТЫМ можна было б паставіць кропку, калі б не адзін нечаканы, нават выпадковы званок. Па суботах рэдакцыя штотыднёвіка не працуе. Але нас падганяў час, і таму мы адразу ж пасля рэйду па кіёсках пайшлі ў рэдакцыю, каб там, у цішыні і спакоі, па гарачых слядах напісаць гэты свой рэпартаж. І вось тут нечакана зазваніў тэлефон. Званіў доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава Віктар Аляксандравіч Іпацьеў.

— Ага, дык вы ўсё ж працуеце ў суботу? — папытаў ён, назваўшыся. — А я званю ды сумняваюся, выхадны ў вас ці не выхадны... Званю вось з якой нагоды. У сённяшнім «ЛіМе» толькі што прачытаў артыкул Васіля Хомчанкі «Армваенюрыст». У ім згадваецца імя і майго дзеда — акадэміка-генетыка Вавілава. Хацеў бы мець каардынаты аўтара, каб сустрэцца з ім і пагутарыць...

Мы не стрымаліся і папыталі ў Віктара Аляксандравіча, якой бы ён хацеў бачыць нашу газету ў 1989 годзе. У адказ пачулі:

— Асабіста мне не хапае на старонках «ЛіМа» матэрыялаў пра лёс беларускіх вучоных-генетыкаў. У прыватнасці, пра лёс Антона Рыгоравіча Жэбрака, які быў вучнем акадэміка Вавілава. А лёс Паўла Пракопавіча Рагавога, які стварыў першую кафедру лясного глебазнаўства і геалогіі і склаў першы падручнік па глебазнаўстве на беларускай мове? Ён варты таго, каб пра яго ведалі не толькі ў былым Беларускім лесатэхнічным, цяпер — тэхналагічным інстытуце... Дарэчы, кафедру тую зараз чамусьці закрылі, і гэта — вялікая памылка, якую трэба выпраўляць. Трэцяя ж частка глебаў Беларусі знаходзіцца пад лесам. А цяпер наогул сітуацыю ў сувязі з радыяцыйнай абстаноўкай трэба асабліва пільна вывучаць, кантраляваць пастаянна... А мае пераднавагоднія пажаданні «ЛіМу» — быць і надалей цікавым, нестандартным выданнем!..

Пагадзіцеся, што чуць гэта, зноў жа, было прыемна. Але, як пажадаў нам у пераднавагодняй віншавальнай паштоўцы ўрач з Віцебска Міхась Паўлаў, — «галоўнае, не страціць набытых пазіцый, не скаціцца ў шэрасць і бяззубасць».

Марыя ГІЛЕВІЧ,
Людміла КРУШЫНСКАЯ,
спецыяльныя карэспандэнты «ЛіМа».

З паэтычнай пошты

Марыя БАРАВІК

Прызнанне

Было — злякнулася спярша.
Затым збалелася душа.
Збалелася за сінь пралесак.
Стаптаных на паляне лесу;
І зліўся з болем позірк сіні
На пакалечанай рабіне.
Збалелася за хлапчука,
Чыя азартная рука
Пусціла сілу камяня
Ў сабаку на пачатку дня;
І за вавёрку на сасне,
Што скардзіцца на нас вясне.
Збалелася за гнёзды птушак,
За пакалечаныя душы,
За дабрыню, за чысціню,
За вышыню, за цішыню,
За памяць учарашняй явы,
Ад сораму людской няславы,
Ад жудасці, што нейкі нелюдзь
З людзьмі зямную сцежку дзеліць.
Збалелася ад пышнай фразы,
Ад чэрствасці людской, абразы...
Збалелася за дождж і снег
Пасля чарнобыльскай вясны,
За новы погляд, новы смех,
За гэту спробу навізны.
Збалелася за чалавека,
За шчырасць дня, за праўду века.
Не суцяшай мяне. Спярша
Скажы: загоіцца душа?..

●

Такую думку зварушу:
Адзін гаворыць: «Задушу!»
Другі: «Як ратаваць душу?»
А трэці ціха: «Затушуй!..»
Але ў чацвёртага ёсць сказ...
І той, чацвёрты, — сярод нас.

●

...А ці бывае, што ў грамадзе
Душа, як промень, адна ідзе?
А ці бывае, што грамада
Шуміць бяздумная, як вада?
Куды ні глянеш — як бачыць вока —
Здаецца светла... ды адзінока.

Забыліся

Забыліся
Аблічча сваё?..
Якое?
Забыліся, дзе выснова —
Збіваемся на чужое,
На думку чужую, слова,
На песню чужую, моду,
Забыліся, хто наш продак...
Нехта даўно гатовы
Збавіцца роднай мовы,
І на ставе радаслоўнай
Вісець галінкай умоўнай.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

●

Мая цешча,
Вясковая палеская бабуля,
Ніяк не магла вымавіць слова
«радыяцыя».
Яна кпіла з тых, хто не еў парэчкі,
Не хадзіў у лес па грыбы...
А я не мог даўмецца, чаму гэта яна,
Баючыся перуна і благога вока,
Злой замовы і страшнага сну,
Не палохаецца такой небяспечнай
пачвары,
Што затаілася ў дзвюх гадзінах язды
ад яе вёскі?

Затое мой васьмігадовы Максім,
Які так прасіўся ў госці да бабулі
(Бо дзе ж ты ў горадзе
ўбачыш жывога пеўня,
Вепрукоў у хлеўчуку і казу Зорачку),
Уздыхнуўшы, бы дзядок, з
разуменнем
І зусім не дзіцячым выразам твару,
Вельмі выразна і гучна сказаў тое
слова,
Што ніяк не магла вымавіць бабуля.

Такія разумныя нашы дзеці!
Столькі ведаюць складаных вучоных
слоў,
Хутка ўсе пасядуць за камп'ютэры.
Але чаму я з такім болем і трывогай
пазіраю на іх,
Узгадваючы вачаняты маленькіх
палешукоў
У санаторыях і піянерлагерах усёй
рэспублікі?

Фрэска

Жоўтая вохра, блакітная вохра,
Сіні з зялёным—зямля-вада.
Вочы жанчыны — бы вечнасці вокны.
Што у іх? Пяшчота, туга ці нуда?

Хто з нас спытае, калі будзе позна?
Тынк на падлозе
раструшчаны ў пыл...
Вера з нявер'ем. Пранізлівы позірк
Даўняе фрэскі. Паўзмрок і слупы.

Язэп Драздовіч

Сусвету зорнае рыззё
Здалёку ў твар зямлі глядзіцца.
І цяжка позірку прабіцца
Праз ночы вязкі чарназём.

То вечнасць свой узносіць знак
Нібы штандар над полем голым.
І нараджаецца мастак
У целе, змучаным і кволым.

Людміла ЗАБАЛОЦКАЯ

●

У жоўты прысмерак апошні
Стамлёна смягне ціхі клён.
І я іду па змоклай пожні —
Знікае сон, знікае сон.
Ля вежы даўняе Нясвіжа,
Дзе стыне смердаў даўкі плач,
Сабака ў лужы месяц ліжа,
Над ім глюгаціцца крумкач.
І ў пераемнасці стагоддзяў
І ў іх з'яднанасці спаўна,
Адзіны месяц узыходзіць
І дзён нязбытных навізна.
І ўсё ж не верыцца дагэтуль,
Што чалавечы век, як тло.
Нібы па мігатлівым свеце
Ні нас, ні продкаў не было.
Начны Нясвіж. Наўкол бязлюдна,
Святло струменіцца з акон.
Крычыць шкаляр з стагоддзяў:
«Будны!»
І крыху сцішана: «Сымон...»

●

Чаромхавы пошум над даўняй магілай,
Амаль з дзірваном зараўняўся грудок
І травам ашэрхлым і травам пахілым,
Вызірваць з сівых недаступных гадоў.
І быць сувязным між жывымі і тымі,
Хто згас і не ўскрэсне ніколі. Ні ў кім.
Імёны гучаць нібы ў горкай пустыні:
Сямён, Анатоль, Мікалай і Яўхім.
Аўгіння, Марыя, Мікола, Матруна...
Прамаці, прабацькі ляжаць між
крыжоў.
Былі вы як гулкія моцныя струны...
Цяпер плывіце да мяне з міражоў.
Вас кожнаю кропляй крыві адчуваю,
Грыпіна, Надзея, Агапа, Азар...
З вас кожны ўва мне хоць на міг
ажывае,
Нібыта маланка між стомленых хмар.
За радай да вас я іду і спагадай.
Адна, як цявінка на гэтай зямлі.
І роду майго запусцелае ляда
Чаромхай над даўняй магілай баліць.

Валянцін ТАРАС

Смех

А праўду гаварыў мудрэц,
што слёзы смехам адальюцца!..
Мінуламу тады канец,
калі з мінулага смяюцца.
Калі і самы грозны бог
ужо не бог — чурбан пацешны,
і грозны цар, як цар Гарох,
зусім не страшны — толькі смешны.
Ды плойма ўсіх пачвар былых
вярнуцца зноўку мае шанцы,
калі забудзем рогат тых,
хто страціў розум на Лубянцы.
Так, смех з мінулага — не грэх,
ды толькі на цвярозы одум,
каб новым трыццаць сёмым годам
нам не адліўся гэты смех.
Хай чуйна слухаюць усе
той рогат вязняў, стрэлаў рэха...
Над забыццём людскім ад смеха
усю Гісторыю трасе.

●

Сталінізм памірае марудна,
і, смяротны адолеўшы сум,
ён спрабуе напяліць няўклюдна
на сябе гарбачоўскі касцюм.

Ён у новыя бухае звоны,
і зацята сціскае ў руках
наш нібыта, чырвоны, чырвоны,
а на справе — «андрэеўскі» сцяг.

Ці не тым прасцірадлам пажоўклым
у нядзельны кастрычніцкі дзень
сталінізм навісаў над натоўпам,
як мінулага нашага цень?

Што яму перад смерцю патрэбна?
Усіх апырскаць атрутнай сліной...
Сталінізм памірае ганебна —
ад уласнай атруты сваёй!..

Мікола ТРАФІМЧУК

Трыванне

Матуля ў слязах
над апошнім сваім караваем.
Трываю.
Замест туманоў
ходзіць стронцый нябачна над краем.
Трываю.
Трывога мяне
ад дзяціннай зямлі адрывае.
Трываю.
Руку сваю робат
на клавішы пуску трымае.
Трываю.
О, кардыяграмы
імкліва-крывая!
Трываю.

Надзённае

Па халтуры спраўляю хаўтуры.
Хто са мною? Не ўсе са мной...
Ёсць прыслужнікі кан'юнктуры.
А яны за шаблон — сцяной.

Трэба выступіць — ёсць каноны,
трэба выйсці — як па струне...
Трэба знаць, у якія біць звоны,
гваздануць — па чыёй спіне.

Ах, як добра, як добра ведаць,
свой пільнуючы важны чын,
дзе,
калі,
колькі,
з кім
паабедаць,
што каму па нутру, па плячы...

Іх эпоха карміла-паіла.
І паверылі самі сабе:
«Мы і ёсць тая самая сіла,
што гартуецца ў барацьбе...»

Сумна, шэра ў жыцці ардынарным.
І прамовы, і песні — шаблон.
Ды затое святкуе бяздарнасць.
Нават таленты б'юць ёй паклон.

Разлілося паводкаю свята.
Нават стаў ужо верыць народ,
што ўсяго ў нас багата-багата,
хоць нястача яшчэ і няўрод.

Ды народу з дарогі не збіцца!
Запрыкмеціў дасціпны дзядок,
як бяздарнасць ідзе пахмяліцца
ў свой, на чорныя будні, скляпок.

У вянок Уладзіміру Высоцкаму

Мы родам з дзяцінства.
ды з розных мясцін.
Адмераны кожнаму лёсы...
І розныя мы.
Нехта з нас —
сукін сын,
а нехта —
зямлі і нябёсаў...
Айчыны сыны!
Вас найбольш паміж нас.
Рубцамі пазначаны душы...
Бо дыхае смерцю не толькі вайна,
а зайздрасць
і раўнадушша.
Дварняжкі,
аўчаркі,
лягавыя псы
служылі аддана...
Парода!
І толькі да скону
Айчыны быў сын
на варце сумлення народа.
Ён родам з народа.
Пра тое і спеў...
Цярплівы ён быў — на здзіўленне!
Таму ён між нас
надрываўся, хрыпеў,
што цяжкая ноша — сумленне.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Міхаіл ФІНБЕРГ,
мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі

Нашаму аркестру ў жніўні споўніўся год. Звычайна для новага мастацкага калектыву першы год — гэта час інтэнсіўнай рэпетыцыйнай работы, назапашвання рэпертуару, творчага станаўлення. Тым больш прыемна, што і за гэты час калектыў набыў папулярнасць у краіне, яго ведаюць ужо і за мяжой.

Аркестр неаднаразова выступаў у Дзяржаўнай цэнтральнай канцэртнай зале: быў удзельнікам Міжнароднага джазавага фестывалю ў Маскве, суправаджаў аўтарскія канцэрты І. Лучанка, праведзеныя насустрач юбілею нашай рэспублікі, і аўтарскія канцэрты Ю. Саульскага, прысвечаныя 60-годдзю гэтага вядомага савецкага кампазітара. Аркестр правёў шматлікія рэпетыцыі і канцэрты І Усесаюзнага фестывалю польскай песні ў Віцебску. Удзельнічаў у двух усесаюзных фестывалях — «Чырвоны гваздзік» у Іванаве і «Дні інтэрнацыянальнай дружбы» ва Ульяноўску, а таксама ў пленуме праўлення Саюза кампазітараў СССР, які праходзіў у Горкім. Наш аркестр быў адзіным прадстаўніком Беларусі, запрошаным на фестываль «Маскоўская восень».

Вялікія канцэрты беларускай песні і эстраднай музыкі мы правялі ў рамках фестывалю «Мінская вясна» і юбілейнага пленума праўлення СК БССР. Зразумела, рэгулярна вандруем з канцэртамі па гарадах Беларусі.

Напружаная штодзённая праца дазволіла за сёлетні год падрыхтаваць 19 новых праграм (гэта апроч зробленага да фестывалю польскай песні), запісаць тры пласцінкі на фірме «Мелодия».

Калі гаварыць пра планы на год 89-ы, трэба ўспомніць сёлетні добры пачатак нашых творчых кантактаў з Польшчай. Аркестр правёў гастрольнае турнэ па польскіх гарадах. Атрымаў запрашэнне на папулярны міжнародны песенны фестываль у Сопаце — паедзем туды наступным летам у якасці акампануючага калектыву. Мяне як дырыжора запрасілі ў Лодзь зрабіць запісы з тамтэйшым аркестрам тэлебачання і радыё — будзем абавязкова запісваць беларускую музыку: Я. Глебава, І. Лучанка і інш.

За гэты год аркестр адзначаны некалькімі дыпломамі: як лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу артыстаў эстрады, як лаўрэат джазавага фестывалю ў Маскве, за работу на фестывалі польскай песні. Гэта шмат у чым заслуга музыкантаў аркестра, выдатных майстроў свайго жанру, вядомых далёка за межамі Беларусі: В. Шчарыцы, В. Бармы, Г. Грачухіна, С. Анцішына і інш. Заслужаны артыст БССР, піяніст і кампазітар А. Шпянёў на фестывалі ў Віцебску быў названы лепшым аранжыроўшчыкам, прызнанне атрымаў ён і ў Маскве. Папулярнасць у слухачоў маюць нашы вакалісты Я. Паплаўская, А. Ціхановіч, М. Скорыкаў, І. Афанасьева, А. Саўленайтэ.

Не хацелася б, каб у чытачоў склалася ўражанне, быццам мы выхваляемся сваімі дасягненнямі і ў захапленні ад усяго зробленага. Гэта далёка не так. Свае недахопы мы адчуваем і ведаем, гаворым пра іх штодня на рэпетыцыях. Пры дапамозе Міністэрства культуры БССР і мастацкага кіраўніцтва Белдзяржфілармоніі імкнёмся вырашаць спецыфічныя задачы, што паўстаюць перад Дзяржаўным канцэртным аркестрам Беларусі.

А галоўны наш клопат — стварэнне новых праграм на аснове беларускага рэпертуару. Сёлета мы «рызыкнулі» сыграць у адпаведнай аранжыроўцы музыку тых беларускіх аўтараў, што дасюль не мелі дачынення да нашага жанру: скажам, старэйшых А. Багатырова, У. Алоўнікава. І, кажуць, гэта надало адметнасць выступленню аркестра. Але мы чакаем цікавых новых п'ес. І найперш ад кампазітарскай моладзі. Нашы вядучыя салісты маюць аўтарытэт як майстры-віртуозы, у цэлым жа мастацкі аўтарытэт калектыву залежыць ад свежых рэпертуарных набыткаў, вартых выканаўчага ўзроўню аркестра. Таму з трывогай, чаканнем і надзеяй думаеш пра беларускіх кампазітараў, якія прыйдуць да нас у новым годзе з новымі творамі. Яны, у рэшце рэшт, будуць вызначаць аблічча Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі.

РЭПАРТАЖ У НУМАР

«ПА НЁМАНУ ПЕСНЯ ПЛЫВЕ...»

Ю. МІЦКЕВІЧ чытае ўрывак з паэмы «Новая зямля».

«Вытокі нашага любага Нёмана пачынаюцца на Беларусі. Гэта рака — сімвал добрасуседства і сяброўства беларусаў і літоўцаў». Словы гэтыя належаць вядомаму літоўскаму паэту, даўняму сябру беларускай літаратуры Зўгеніусу Матузявічусу. Яму належыць і прыведзены вышэй паэтычны радок, які супрацоўнікі коласаўскага музея ўзялі дэвізам да выстаўкі, падрыхтаванай для паказу ў Літве. Выстаўка, прысвечаная найбольш характэрным старонкам жыцця і творчасці Якуба Коласа, адкрыта днямі ў памяшканні каўнаскага Літаратурнага музея пісьменнікаў Літвы (яго тут называюць яшчэ Домам Майроніса—па імю вядомага літоўскага паэта і грамадскага дзеяча). Арганізацыяй выстаўкі займаліся непасрэдна супрацоўнікі навукова - экспазіцыйнага аддзела музея Я. Аляксеева і М. Далідовіч, над яе афармленнем працавалі мастакі Т. Голубева і В. Ламака. Як дзейсны элемент афармлення выкарыстаны выказванні пра Коласа В. Быкава, Ю. Марцінкявічуса, К. Корсакаса...

Член прэзідыума праўлення СП БССР А. Вярцінскі, паэт і журналіст, сакратар каўнаскага аддзялення СП Літвы П. Палілёніс, літоўскі літаратуразнаўца і перакладчыца з беларускай А. Лапінскене гаварылі, пад час адкрыцця выстаўкі, пра неўвядальнае значэнне творчай спадчыны Коласа, пра багатыя традыцыі дружбы і супрацоўніцтва літаратараў братніх рэспублік, пра сумесныя выданні, якія ўбачылі свет на працягу сёлетняга года, — калектыўны зборнік нарысаў і эсэ «Наш Нёман» і манаграфічную працу А. Лапінскене і А. Мальдзіса «Перазовы сяброўскіх галасоў. Беларуска - літоўскія літаратурныя ўзаемасувязі са старажытнасці і да сённяшніх дзён». Сказаўшы, што літоўскі чытач атрымаў нядаўна ў перакладзе на сваю мову «Казкі жыцця», А. Лапінскене ў той жа час зазначыла, што даўно наспела патрэба выдаць па-літоўску «Новую зямлю». Дырэктар каўнаскага Літаратурнага музея А. Лаўрайціс, генеральны дырэктар аб'яднання літаратурных музеяў Ю. Варанкоў, дырэктар музея Якуба Коласа З. Камароўская гаварылі пра неабходнасць супрацоўніцтва і абмену вопытам паміж музеямі. Паэтэса А. Канапелька звярнулася да прысутных з вершаваным словам. Сваяк песняра, навуковы супрацоўнік філіяла коласаўскага музея ў Мінералеўшчыне Ю. Міцкевіч прачытаў урывак з паэмы «Новая зямля». У зале прагучалі беларускія мелодыі ў выкананні нашай знакамітай цымбалісткі Т. Чанцовай...

Мяркуецца, што выстаўка «Па Нёману песня плыве...» — параўнаўча невялікая па колькасці экспанатаў, але ёмістая па змесце, з густам афармленая, — праз нейкі час «пераедзе» ў Вільнюс, у горад, з якім звязана нямала старонак творчага і асабістага жыцця Якуба Коласа.

Тэкст і фота Ул. КРУКА.

Першая імправізаваная экскурсія. Вядзе яе загадчык сектара літаратурнага музея Я. Коласа Я. АЛЯКСЕЕВА.

Дырэктар літаратурнага музея Я. Коласа літоўскі літаратуразнаўца і перакладчыца А. ЛАПІНСКЕНЕ. З. КАМАРОЎСКАЯ і з беларускай мовы

ЮБІЛЕЮ ПАЭМЫ

У Доме літаратара адкрылася мастацкая выстаўка, прысвечаная 465-й гадавіне з дня выдання паэмы Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». На пачатку экспазіцыі словы вялікага паэта, так сугучныя нашаму часу: «Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела...» На выстаўцы вядомыя творы—палатно «Вітаўт Вялікі» А. Марачкіна і ілюстрацыі да п'есы А. Петрашкевіча «Напісанае застаецца», выкананыя М. Басалыгам; ілюстрацыі А. Кашкурэвіча да «Песні пра зубра», выдадзенай у 1973 г., і Я. Куліка да юбілейнага выдання 1980 г.; плакат У. Васюка і графічны аркуш У. Басалыгі з партрэтнымі выявамі Міколы Гусоўскага. Шрыфтавыя кампазіцыі, прысвечаныя паэту і ягонай славутай паэме, прадставілі У. Гладкевіч, А. Зуева, В. Туміловіч, А. Карповіч, А. Кошалеў, Ю. Рыжыкаў.

А ў вялікай зале адбыўся спектакль—драматычная кампазіцыя паводле «Песні пра зубра». Выканаўца—А. Свістуновіч.

НАШ КАР.

НА СЦЭНЕ ТЭАТРА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ

Спектакль Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР «Клоп» завяршыў фестывальны паказ у Маскве адметных работ сцэнічных калектываў краіны. (Паказ прайшоў на пачатку снежня ў Тэатры дружбы народаў). Як паведамілі нашаму карэспандэнту ў Міністэрстве культуры БССР, «Клоп» прывабіў увагу гледачоў і сталічнай крытыкі. Не абышлося без супярэчлівых ацэнак, але ў цэлым прадстаўнікі СТД СССР, крытыкі, музыказнаўцы павіншавалі беларускую трупу з творчым поспехам. Спектакль «Клоп» (рэжысура В. Цюпы, музычны кіраўнік А. Сасноўскі, мастак У. Жданаў) даў падставу гаварыць пра цікавы напрамак у творчым жыцці калектыву, вызначыць шмат станоўчага ў прафесійным майстэрстве акцёраў Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР.

ТВОРЧЫ ВЕЧАР КАМПАЗІТАРА

Творчы вечар народнага артыста СССР Яўгена Глебава сабраў у Доме літаратара шмат прыхільнікаў яго яркага таленту. Сабраліся як паклоннікі «сур'ёзнай» музыкі, так і тыя, каго радуе і хвалюе музыка лёгкая. Як вядома, Я. Глебаў з аднолькавым поспехам выступае ў самых розных жанрах.

Дарэчы, пра гэта і нагадалі на вечары рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага, кіраўнік народнага аркестра БССР імя І. Жыновіча М. Казінец, кінарэжысёр Ю. Цвяткоў, драматург А. Дударaў.

На вечары прагучалі некаторыя творы кампазітара, паказаны дакументальны фільм «Яўген Глебаў», а таксама фрагменты са стужак, да якіх ён напісаў музыку.

НАШ КАР.

ПА П'ЕСЕ А. ДУДАРАВА

У Доме літаратара з поспехам прайшла прэм'ера новай п'есы А. Дударава «І быў дзень»» («Звалка») у пастаноўцы тэатра-студыі «Золак», якім кіруе Г. Прыма.

У «Золаку» сабраліся людзі самых розных прафесій—архітэктары, выхавацелі, рабочыя... Ролі ў спектаклі выконваюць А. Свістуновіч, В. Крапіўка, С. Гурыновіч, Н. Каменка, В. Гурыновіч, А. Драздоўскі, А. Крышкін, В. Сташэўскі, Л. Стомава.

Афармленне новага спектакля дапамаглі зрабіць шэфы з Рускага тэатра БССР. Творчая садружнасць прафесійнага тэатра і самадзейнага калектыву, якая пачалася з работы над спектаклем «Маці ўрагану» У. Караткевіча, атрымала працяг і ў новай пастаноўцы. Золакаўцы ўдзячны галоўнаму рэжысёру горкаўцаў В. Маслюку, які дапамагае аматарам.

І яшчэ адна рыса, якая характарызуе «Золак», — дабрачыннасць. Дабрачынныя спектаклі ўжо можна назваць добрай традыцыяй тэатра. Першы такі спектакль, «Маці ўрагану», які адбыўся ў Гродне, сыграны ў фонд будаўніцтва помніка Кастусю Каліноўскаму. У снежні прайшлі два дабрачынныя спектаклі «І быў дзень», сродкі ад якіх пералічаны на рахунак 700412 і ў піянерскі лагер «Зубраня», дзе цяпер жывуць армянскія дзеці.

16 студзеня ў 19 гадзін у Доме літаратара тэатр-студыя «Золак» дае дабрачынны спектакль «І быў дзень», сродкі ад якога будуць пералічаны ў дзіцячы фонд.

А. РУНЕВІЧ.

ПРЭМІІ ЧАСОПІСА «НЁМАН»

Рэдакцыйная калегія часопіса «Нёман» адзначыла літаратурнымі прэміямі лепшыя творы, апублікаваныя на працягу 1988 года.

Прэміі прысуджаны: па прозе—Эрнесту Ялугіну за дакументальную аповесць «Пасля небыцця», Івану Пташнікаву за апавяданне «Львы»; па паэзіі—Міхаілу Шэлехаву за цыкл вершаў «Станцыя кахання»; па публіцыстыцы—А. Ф. Кавалёву за біяграфічную аповесць «Звон мой—праўда» і Анатолю Казловічу за нарыс «Даруй, дом безымянны»; па крытыцы—Анатолю Сідарэвічу за літаратурна-крытычныя нататкі «Экскурс у гісторыю...» і Рыгору Шкрабе за артыкул «Шмат праўды не бывае».

УСМЕШКА КАРЫКАТУРЫСТА

Малюнак А. ПАПОВА.

Анкета «ЛіМа»

ГОД СЁЛЕТНІ І ГОД НАСТУПНЫ

Аляксей МАРАЧКІН

Для мяне як мастака, што цікавіцца гісторыяй, гэты год асаблівы. Ён быў адзначаны святкаваннем 150-й гадавіны з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага, 100-годдзя Язэпа Драздовіча, 110-й гадавіны Казіміра Малевіча. Гэтым юбілеям прысвячаліся мастацкія выстаўкі. Такім чынам быў зроблены значны крок у творчым асэнсаванні нашай гістарычнай спадчыны.

Не магу не прыгадаць і шмат публікацый у рэспубліканскім друку па пытаннях гісторыі — далёкай і блізкай. Полацкая дзяржава, Вялікае княства, час уваходу Беларусі ў склад Расійскай імперыі, няпростае пытанне ўтварэння сацыялістычнай дзяржаўнасці на Беларусі і сталінскі генацыд — па ўсіх гэтых пытаннях існуе сёння самае малое дзве думкі. Гэта яшчэ далёка не плюралізм, але ўжо ніхто не стане сцвярджаць, што ён валодае манаполіяй на ісціну.

1988 год — гэта стварэнне культурна-асветніцкага таварыства «Мартыралог Беларусі». Да гонару Саюза мастакоў Беларусі адзначу, што наша творчая суполка выступіла адным з заснавальнікаў гэтай арганізацыі.

Саюз мастакоў адгукнуўся і на бяду братняга армянскага народа. А бяда гэтая высветліла нашы ўласныя праблемы, і ў першую чаргу—праблему Чарнобыля. Мы дагэтуль не маем карты радыёактыўнага забруджання Беларусі. Невядома, чаго каштавала нашай рэспубліцы чарнобыльская катастрофа ў экалагічным, эканамічным, культурным сэнсе, як яна адаб'ецца на генетычным фондзе нацыі, на будучых пакаленнях. Людзі хацелі б быць упэўненымі, што будаўніцтва Віцебскай АЭС сапраўды спынена...

Мінулы год прынёс нам радасныя хвіліны і пакінуў праблемы, якія трэба вырашаць.

Вітаўтас ГРЫГАЛЮНАС,

галоўны рэжысёр тэатра студыі «Дыялог»:

Стольні было размоў і, нарэшце, дачакаліся: у рэспубліцы адкрыўся шэраг тэатраў-студый.

Для нас 1988 год быў адметны: упершыню за 5 гадоў жыцця мы «асмеліліся» вынесці спектаклі на суд шырокага гледача, паказваючы свае работы на многіх пляцоўках. Наш «Дыялог» — адзіны тэатр-студыя з іншай рэспублікі, які быў запрошаны на фестываль тэатраў-студый «Каўнаская рампа». Былі ў Маскве на вялікай творчай сустрэчы тэатраў-студый краіны. Запомнілася паездка на міжнародны фестываль у Венгрыю, у якім прынялі ўдзел калектывы з 8 краін свету і дзе мы паказалі спектакль «Чыкагскае бяздонне» Р. Брэдберы. Прысутнічаючы пры падрабязным аналізе паказаных спектакляў, мы зразумелі, што такое сучасны тэатр і глядач, якія існуюць зараз тэндэнцыі развіцця тэатральнай культуры.

Верым у многае. У тое, што ў 1989 годзе гасразліковыя тэатры-студыі, нарэшце, стануць на ногі і заявяць пра сябе. Што тэатральнае мастацтва знойдзе свайго гледача. Што тыя, хто павінен клапаціцца пра жыццё тэатраў-студый, можа, заўважаць, колькі ў нас сабралася розных праблем...

Таварыш Змітро

Некалькі старонак з кнігі аднаго лёсу

«КАМЕНДАНТ Ваяводскай Дзяржаўнай Паліцыі. Следчае ўпраўленне ў Любліне.

...паведамляю... што затрыманы следчым аддзелам у Вільні дзеяч КПЗБ, які прад'явіў фальшывыя дакументы на прозвішча Яблонскага І., завецца Малец Іван, сын Васіля і Кацярыны, нар. у 1907 г. у Мольнічах Навагрудскага павета... дня 3.03. 1923 быў затрыманы па падазрэнні ў антыдзяржаўнай дзейнасці ў Навагрудку».

Гэта вытрымка з арыгінальнага дакумента пад № 281, які захоўваецца ў Цэнтральным архіве ЦК ПАРП у Варшаве. Дзеяч Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў Камуністычную партыю Польшчы на правах аўтаноміі, Іван Васільевіч Малец задаў-такі тады працы паліцыі панскай Польшчы. Цэлы месяц ён упарта патрабаваў называць яго «пан Яблонскі». Цэлы месяц ён процістаяў дзяржаўнай машыне з яе адпрацаваным апаратам вышуку і застрашвання, процістаяў вытанчанаму псіхалагічнаму тэрору і грубай сіле.

Іван Васільевіч працягвае мне фотаздымак, зроблены ў 1933 г. у Вільні. Нават цяпер, праз пяцьдзесят пяць гадоў, на здымак нельга глядзець без унутранага хвалявання. Разбіты да крыві твар маладога чалавека — вынік работы турэмшчыкаў. Больш паўвека прайшло. А ўспаміны ўсё яшчэ жывыя, яркія, быццам толькі ўчора ўсё было...

Мой субяседнік — Іван Васільевіч Малец, у мінулым першы сакратар ЦК камсамола Заходняй Беларусі.

— У сям'і было нас 9 чалавек,— расказвае Іван Васільевіч.—Працавалі ўсе змалку, ды хлеб на стале быў не заўсёды.

У бацькі галоўная мара была — каб сыны атрымалі адукацыю. Сам ён умеў толькі распісацца. Спачатку давялося Івану вучыцца ў заезджага гімназіста, які вучыў мясцовых сялянскіх дзяцей па чарзе — пераходзячы з хаты ў хату — за ежу і прытулак. Потым разам з братам Міхалам, на два гады старэйшым за Івана, вучыліся ў польскай гімназіі ў Навагрудку. У 1924 годзе Міхал, а ў наступным Іван уступілі ў камсамол. Дарэчы, адным з арганізатараў першых камсамольскіх ячэек на Навагрудчыне быў дзядзька Івана — таксама Іван. Былы падпаручнік царскай арміі, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, ён умеў захапляюча расказваць пра Леніна, пра бальшавікоў, пра Саветы.

З шостага класа гімназіі Іван Малец быў выключаны за рэвалюцыйную дзейнасць. Яму было з каго браць прыклад.

— Наша вёска Мольнічы,— успамінае Іван Васільевіч,— у дваццатыя гады была адным з цэнтраў рэвалюцыйнай барацьбы на Навагрудчыне. А браты Мальцы—яе актыўнымі ўдзельнікамі.

Старэйшы з братоў Антон Малец уступіў у Кампартыю ў 1924 годзе. У 1926-ым ён ужо сакратар Навагрудскага райкома КПЗБ. Іван Васільевіч любіць успамінаць дзёрзкі ўчынак Антона, які запомніўся яму яшчэ ў дзяцінстве. Неяк напярэдадні рэлігійнага фэсту брат узяў стос рэвалюцыйных адозваў, вядро клею і ноччу, у грымотную навальніцу, пайшоў на могілкі. Як жа былі ўражаны раніцай прыхажане і святары, калі ўбачылі на капліцы бальшавіцкія адозвы. Па навакольных вёсках пайшла гуляць пагалоска, што ноччу прыляталі з-за мяжы бальшавікі на самалёце.

Антон Малец прападзе без вестак у бітве пад Масквой. Міхал Малец, перакананы камуніст, будзе арыштаваны ў Маскве ў 1938 г. і рэабілітаваны пасмяротна ўжо ў нашы дні.

Загіне ў Вялікую Айчынную і малодшы брат Івана Васільевіча Мікалай.

Стрыечны брат будзе ў 32-м годзе павешаны польскімі ўладамі за ўдзел у сялянскім паўстанні.

У 1927 годзе Іван Васільевіч уступае ў члены КПЗБ. Разам з братам Міхалам яны становяцца «тэхнікамі» ў Навагрудскім райкоме партыі. У іх абавязкі ўваходзіць забеспячэнне явачнымі кватэрамі, транспартам і г. д.

Вельмі хутка братоў чакалі сур'ёзныя выпрабаванні.

У 1927 годзе Кампартыя Заходняй Беларусі на паўлегальнай аснове прыняла ўдзел у выбарах у польскі сейм. Разам з іншымі левымі сіламі камуністы стварылі блок «Змаганне», які выступіў са сваёй палітычнай платформай і меў афіцыйную «лісту выборчу» (спіс для галасавання).

Напярэдадні выбараў польская паліцыя нанесла КПЗБ моцны ўдар. Пракацілася хваля арыштаў. Толькі на Навагрудчыне было арыштавана за адну ноч 250 чалавек — у тым ліку члены райкома. Былі затрыманы таксама Антон Малец і дзядзька Іван.

Чыніліся перашкоды ў друкаванні і распаўсюджанні платформы «Змагання». У навагрудскай друкарні паліцыяй быў арыштаваны і апячатаны ўвесь аддрукаваны тыраж камуністычнага выдання. Але ноччу камсамольцам удалося яго выкрасці.

«Змаганне» сабрала на Навагрудчыне амаль 75 тысяч галасоў, а так званая «ўрадавая большасць»— прыкладна на 20 тысяч меней. І ў цэлым выбары прайшлі, можна сказаць, паспяхова для камуністаў і левых сіл. У сейме была створана пасольская група «Змаганне», якая адстойвала інтарэсы працоўных і перадавой інтэлігенцыі Заходняй Беларусі.

— Гэты поспех стаў магчымы,— лічыць Іван Васільевіч, — дзякуючы агромністай прапагандысцкай рабоце камуністаў, перш за ўсё на вёсцы.

Схільнасць да прапагандысцкай работы ў Івана Васільевіча была заўсёды з таго часу, як ён свядома выбраў свой жыццёвы шлях і звязаў яго з партыяй Леніна. Работа гэтая прыносіла яму сапраўдную асалоду.

— Мы, камуністы, лічылі, што палітычная сталасць чалавека вызначаецца яго адносінамі да Савецкага Саюза. І нашым святым абавязкам было несці праўду людзям — пра СССР, пра Савецкую Беларусь. Людзі верылі нам, чакалі нас, чакалі вестак з Усходу.— — Так гаворыць Іван Васільевіч Малец.

І тут, відаць, неабходна зрабіць адно адступленне. Напэўна, можна было б абвінаваціць былых членаў КПЗБ у тым, што яны расказвалі людзям не ўсю праўду, асабліва ў трыццатыя гады. На жаль, ахвотнікаў вінаваціць сваіх бацькоў і дзядоў ва ўсіх магчымых і немагчымых грахах сёння хапае. Але ж варта задумацца — у чым мы вінавацім гэтых людзей? У тым, што яны не ведалі ўсёй праўды? Дык яе не ведалі нават многія члены ЦК ВКП (б).

Іван Васільевіч Малец і яго паплечнікі рабілі тады тое, што ім падказвалі рэвалюцыйныя перакананні — свае, выпакутаваныя, а не пазычаныя!— што падказваў жыццёвы вопыт і партыйны абавязак.

Ды і не было ўсё так адназначна, як гэта цяпер часам здаецца. Яшчэ нядаўна мы любілі паўтараць, што дарэвалюцыйная, а таксама і заходнебеларуская вёска была адсталай, забітай, ведала толькі галечу і голад. Погляд, зразумела, прымітыўны, далёкі ад рэчаіснасці. Аднак, калі мы гаворым сёння пра тую ж Заходнюю Беларусь, не трэба забывацца і на тыя зусім рэальныя гістарычныя і палітычныя абставіны, якія мелі месца ў той час. Іван Васільевіч неаднойчы падкрэсліваў у гутарцы, што нянавісць да польскага прыгнёту была паўсюднай у народзе. І на гэта ў беларускага мужыка былі падставы. Польскі ўрад свядома праводзіў палітыку «асадніцтва»: лепшыя землі ў «крэсах» аддаваліся тым, хто вызначыўся ў баях супраць Чырвонай Арміі, хто верна служыў Пілсудскаму. І гэта ва ўмовах малазямелля сялян Заходняй Беларусі.

Эканоміка ўсходніх раёнаў буржуазнай Польшчы, сама па сабе недастаткова развітая, яшчэ і расхіствалася ў міжваенны перыяд частымі крызісамі. У выніку ў гарадах узнікла масавае беспрацоўе. Маладое пакаленне вымушана было заставацца ў вёсках, якія былі перанаселены. Гэта цяжка ўявіць у нашых цяперашніх умовах!

Зразумела, інтэнсіўна адбывалася сацыяльнае расслаенне ў вёсцы. Паводле расказаў бацькі Івана Васільевіча, у іх роднай вёсцы на пачатку 30-х гадоў далёка не ва ўсіх заставаўся хлеб нават да новага года. А ў многіх сем'ях гадамі не бачылі ні кавалачка сала. Не таму, што не гадавалі свіней, а таму, што прамысловыя вырабы, асабліва сельгастэхніка, каштавалі з кожным годам усё даражэй. І каб зарабіць хоць трохі грошай, везлі таго парсючка на рынак.

Адукацыя для большасці сялян была амаль недаступнай раскошай, асабліва вышэйшая. А тут яшчэ антыбеларуская палітыка ўлад, якія ўсімі сіламі імкнуліся закрываць беларускія школы, гурткі, забаранялі вывучаць родную мову, выдаваць кнігі на ёй.

Можна сабе ўявіць, як жа ўражвалі сялян Заходняй Беларусі расказы аб тым, што зямля ў БССР належыць сялянам, што дзяржава дапамагае ім тэхнікай, насеннем, што ў Беларускім універсітэце бясплатна вучацца сялянскія дзеці, што паўсюль працуюць беларускія школы, выдаюцца кнігі і газеты на роднай мове.

Праўда, ужо ў канцы дваццатых гадоў супраць беларускай інтэлігенцыі, а потым і супраць сялян, супраць усіх працоўных пачнуцца масавыя рэпрэсіі. Адзін за адным будуць знікаць відныя палітычныя і дзяржаўныя дзеячы, стваральнікі і арганізатары Кампартыі Беларусі — старэйшай сястры КПЗБ. Але члены КПЗБ, як і большасць камуністаў, будуць верыць, што ў Савецкім Саюзе ўзмацняецца з кожным годам класавая барацьба, што знішчаюць толькі ворагаў народа, будуць верыць у геній Сталіна — бацькі і настаўніка ўсіх народаў. Паверацъ і ў змову Тухачэўскага з нямецкімі генераламі і ва ўсе астатнія «змовы» і судовыя працэсы. І толькі ў арышт генеральнага сакратара Кампартыі Польшчы, члена прэзідыума выканкома Камінтэрна Ленскага ў 37-м не паверацъ. ЦК КПЗБ нават распаўсюдзіць адозву з заклікам не верыць паведамленням пра арышт палымянага барацьбіта за інтарэсы польскага рабочага класа, лічыць іх правакацыяй польскай «охранки». Сам Ленскі будзе абвінавачаны ў той жа час НКУС у тым, што ён агент дэфензівы. І гэта будзе толькі пачатак. Хутка будзе абвінавачана ў здрадніцтве ўся Кампартыя Польшчы. Рашэннем Камінтэрна пад уціскам Сталіна яна будзе распушчана. А разам з ёй будзе распушчана і КПЗБ.

●

У 1927 годзе толькі што выбраны сакратар Навагрудскага РК КПЗБ Іван Васільевіч Малец нічога гэтага, зразумела, не ведае і ведаць не можа. Напярэдадні ў яго — нелегальная работа ва ўмовах праследавання камуністаў, усіх левых сіл, арышты і турмы.

— Мы ўсе ведалі, што турма — непазбежны этап у жыцці рэвалюцыянера,— гаворыць Іван Васільевіч.— У душы кожны з нас рыхтаваўся да турмы. Мы ведалі з расказаў старэйшых таварышаў, што нас чакае там. Трапіць у заключэнне было не самае страшнае. Страшна было прайсці паліцыю і «охранку». Галоўнае — не зламацца на допытах. Спецыялісты ў дэфензіве былі не горш за гестапаўскіх.

Іван Васільевіч двойчы паспытаў польскіх турмаў. З 33-га па 36-ы год Малец правёў у Лукішках.

— Камуністы сядзелі ў камерах-адзіночках «шахматным парадкам»,— расказвае Іван Васільевіч.— Гэта значыць, што ў суседніх камерах, нават знізу і зверху маглі сядзець толькі «крымінальнікі». І тым не менш «палітычным» удалося наладзіць пастаянныя сувязі паміж сабой. Нелегальна існаваў турэмны камітэт, які неўзабаве ўзначаліў Малец. Афіцыйна ён быў прызначаны старастам камуны.

У час адной з прагулак Іван Малец сустрэўся з Максімам Танкам, якога ведаў раней па камсамольскай і партыйнай рабоце Танк крадком перадаў таварышу турэмны часопіс «Краты» са сваімі вершамі. Часопіс пісаўся ад рукі на палове вучнёўскага сшытка. З таго часу сяброўскія сувязі Івана Васільевіча і Максіма Танка не парываліся ніколі. Сёння на стале ў Івана Васільевіча ляжыць новы томік лірыкі народнага паэта з надпісам: «Дарагому Івану Васільевічу Малецу з нязменнай пашанай і любоўю. Максім Танк. 5. XII. 87».

Пасябраваў Іван Васільевіч і з іншымі пісьменнікамі-палітвязнямі — Піліпам Пестракам, Валянцінам Таўлаем. Нейкі час сакамернікам Івана Мальца быў Іонас Каросас (Ян Карась) — у будучым першы сакратар Саюза журналістаў Літоўскай ССР, а ў той час студэнт Віленскага універсітэта.

Тут, у Лукішках, былі свае «універсітэты». І не толькі ў пераносным сэнсе. Акрамя «Кратаў», тут падпольна выходзіў таксама тэарэтычны часопіс «Политзак». Паперу здабывалі ў крымінальнікаў у абмен на махорку. Тайную сувязь з воляй падтрымлівалі пастаянна. У бібліятэцы можна было атрымаць віленскі «Кур'ер цодзенны», але... з акуратна вырезанымі паведамленнямі на палітычныя тэмы. Тым не менш палітінфармацыя ў турме распаўсюджвалася.

Мальца, як старшыню падпольнага турэмнага камітэта і старасту камуны, паважалі ўсе вязні.

— Дысцыпліна сярод «палітзакаў» была выключная,— успамінае Іван Васільевіч.— Напрыклад, у дзень перадач мы паведамлялі праз турэмную «сігналізацыю», каму і якая прызначана перадача. Белы хлеб адпраўлялі хворым. І ні разу не было так, каб перадача да нейкага не дайшла. Ніводнага крадзяжу нават з боку крымінальнікаў!

Пра тое, што «палітычныя» заставаліся ў турме сілай, з якой нельга было не лічыцца, сведчыць і такі эпізод. Аднойчы Мальцу спатрэбілася перадаць шыфроўку ў акруговы камітэт партыі. Нягледзячы на меры канспірацыі, вартаўнік падгледзеў момант, калі Іван Васільевіч пад прыкрыццем свайго сакамерніка Каросаса пачаў пісаць, уварваўся ў камеру і кінуўся на вязня. Малец спрабаваў праглынуць паперку. Тады вартаўнік пачаў раздзіраць яму рот. На дапамогу таварышу кінуўся Каросас і скруціў ката. За гэта абодва вязні былі адпраўлены ў карцэр.

Турэмны камітэт аб'явіў агульны пратэст. Усе без выключэння адмовіліся ад сустрэч з блізкімі, перасталі прымаць перадачы. Бацькі некаторых вязняў паскардзіліся ў пракуратуру. У рэшце рэшт звесткі пра інцыдэнт у турме з'явіліся ў дэмакратычным друку, у тым ліку замежным. Справа пачала прымаць нечаканы для ўлад паварот. У турму вымушаны быў прыехаць пракурор. Усе спробы гаварыць з кім-небудзь з «палітзакаў», акрамя Івана Мальца, скончыліся для яго нічым. Вязні адмаўляліся адказваць на пытанні. У рэшце рэшт пракурор быў вымушаны ўступіць у перагаворы з «зачыншчыкам», старастам камуны. На пытанне: «Якія ёсць просьбы?»— Малец адказваў так: «У камуністаў

І. В. МАЛЕЦ — вязень турмы на Лукішках у Вільні. 1933 год. Здымак публікуецца ўпершыню.

просьбаў няма. Мы патрабуем!» Некаторыя з патрабаванняў былі выкананы. А вартаўніку, які пабіў Каросаса, вязні аб'явілі байкот, і той, уявіце сабе, не вытрымаў агульнай пагарды і праз нейкі час быў пераведзены ў іншую турму, далей ад Вільні.

Вось так салідарнасць і партыйная дысцыпліна перамагалі часам адладжаны карны апарат.

●

З асаблівым пачуццём успамінае Іван Васільевіч гады, праведзеныя ў Маскве. У 1928 годзе па рашэнні сакратарыята ЦК КПЗБ ён з братам Міхалам і яшчэ адным таварышам па партыі перайшоў граніцу панскай Польшчы. Некаторы час Малец вучыўся на апошнім курсе рабфака пры Горацкай сельгасакадэміі, а ў 1929 годзе ЦК накіроўвае братоў у Маскву, у Камуністычны універсітэт нацыянальных меншасцяў Захаду. Неўзабаве Іван узначаліў камсамольскую арганізацыю універсітэта, у якім налічвалася 14 факультэтаў. Камсамольцы універсітэта шэфствавалі над афіцэрскай школай ВЦВКа, і камсоргаў нярэдка запрашалі ў Крэмль. Там адбываліся незабыўныя сустрэчы. Іван Малец і яго сябры сустракаліся з Н. К. Крупскай, Л. А. Фоцієвай, А. Д. Стасавай, В. П. Лепяшынскай, з захапленнем слухалі іх расказы пра Уладзіміра Ільіча, былі сведкамі выступленняў наркома асветы А. В. Луначарскага, наркома аховы здароўя М. А. Сямашкі, дзеячаў міжнароднага камуністычнага руху К. Цэткін, В. Піка, В. Ульбрыхта.

У чырвонай зале МГК сябрам-студэнтам давядзецца слухаць Маякоўскага.

— Мы не разумелі і не любілі яго паэзіі,—з усмешкай успамінае Іван Васільевіч,—але яго выступленне, манера трымацца, моц голасу, абаянне асобы зачаравалі нас. І ўсё ж мы вырашылі пасля яго выступлення пайсці і прынцыпова, па-камсамольску сказаць паэту, што рабочыя яго вершаў не разумеюць і не прымаюць. Уладзімір Уладзіміравіч, з усмешкай выслухаўшы нас, прапанаваў тут жа паехаць разам з ім на завод, каб мы пабачылі, як прымаюць яго рабочыя. Тым не менш мы стаялі на сваім: яго паэзія незразумелая, чужая для народа. Уладзімір Уладзіміравіч, здаецца, пакрыўдзіўся на нас. Цяпер пра тую недарэчную сустрэчу ўспамінаць і смешна, і сорамна...

Надараліся сустрэчы зусім з іншымі людзьмі. З Вышынскім, напрыклад, даводзілася Івану Васільевічу сядзець разам у прэзідыуме. Тагачасныя слухачы камуністычнага універсітэта бачылі ў Вышынскім, безумоўна, не таго вылюдка, якім той быў на самай справе і пра злачынствы якога мы цяпер ведаем, а бліскучага аратара, высока эрудзіраванага акадэміка права з інтэлігентным абліччам.

Доўга заставацца ў Савецкай Расіі ў Івана Васільевіча магчымасці не было. Не змог ён скончыць і універсітэт. «Таварыш Змітро»— такі ў яго быў партыйны псеўданім — зноў адпраўляецца ў Заходнюю Беларусь.

У час III канферэнцыі камсамола Заходняй Беларусі Малец быў выбраны членам сакратарыята ЦК, а потым першым сакратаром ЦК. Працуе на камсамольскай і партыйнай рабоце ў Беластоку, Гродне, у Вільні. Пасля арышту і турмы жыве ў Лодзі. Увесь час цягнула з'ездзіць дамоў, да бацькоў, якіх даўно не бачыў. На радзіме ён быў зноў арыштаваны дэфензівай — на гэты раз па даносу здрадніка, былога члена КПЗБ. Надышоў 1939 год. Многія таварышы Івана Мальца па партыі, вызваліўшыся з польскіх турмаў, адправіліся ў казематы НКУС або ў Сібір. Івану Васільевічу пашчасціла, ён не быў рэпрэсіраваны.

●

Вялікая Айчынная вайна застала Івана Васільевіча ў яго родных Мольнічах, дзе ён узначальваў калгас. Летам 41-га ён ідзе добраахвотнікам у армію. У верасні Малец запісваецца ў лыжны батальён, становіцца рэдактарам батальённай газеты. З нецярпліваццю чакае адпраўкі на фронт. Аднак лёс Івана Васільевіча і лёс тысяч яго землякоў вырашыў таварыш Сталін: загадам старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны ўсе былыя жыхары Заходняй Беларусі і Украіны, а таксама Прыбалтыкі маглі накіроўвацца толькі ў рабочыя батальёны.

Іван Васільевіч не мог змірыцца з тым, што ён застанецца не на пярэднім краі. Пісаў рапарт за рапартам. За яго хадайнічалі камсамольская і партыйная арганізацыі палка, нават інспектар ПУРСЧА браўся дапамагчы—так яго ўразіла страснае жаданне Мальца біцца з фашыстамі, а галоўнае — перакананасць у сваім праве і абавязку служыць народу. Іван Васільевіч піша заяву ў ЦК ВКП (б). Але дайшла яна, як потым даведаўся Малец, толькі да начальніка Палітупраўлення Мехліса. Настойлівасць радавога байца магла яму падацца падазронай...

Як бы то ні было, Малец застаецца ў рабочым батальёне. У гэтых батальёнах служылі потым таксама салдаты, якія вырваліся з нямецкага палону і прайшлі зневажальную праверку ў спецлагерах. Нябачнае кляймо недаверу ляжала на іх да канца вайны, ды і пасля...

Тут, у рабочым батальёне, пройдуць для Івана Васільевіча яго ваенныя гады, тут ён будзе выбраны старшынёй рабочага камітэта, тут сустрэне сваю будучую жонку...

●

З Іванам Васільевічам мы гутарым у яго доме, у вёсцы Вялікія Навасёлкі, што за некалькі кіламетраў ад Дзяржынска. Жыве ён тут даўно, больш за дваццаць гадоў, жыве ўдваіх з жонкай. Дзеці — тры дачкі — дарослыя ўжо, працуюць у Мінску, гадуюць дзяцей. Ёсць у Івана Васільевіча ўжо і праўнук. Дзесяць гадоў, як ён на пенсіі. А да таго — настаўнічаў у мясцовай школе.

Сядзім з Іванам Васільевічам за сталом, перабіраем здымкі, дакументы, кнігі з артыкуламі пра «таварыша Змітра». У доме і за вокнамі зусім ціха, так што нішто не перашкаджае гутарцы. І толькі час ад часу размову перапыняе тэлефон: то Івана Васільевіча просяць абавязкова быць на партыйным сходзе, то скардзяцца на нейкую несправядлівасць, просяць парады. Адчуваецца — Іван Васільевіч, яго слова, яго вопыт патрэбны людзям. І ён гэта адчувае, ганарыцца гэтым. З задавальненнем гаворыць, як часта яму яшчэ даводзіцца выступаць, асабліва перад моладдзю.

І раптам:

— А ведаеце, усё тое, пра што мы гаворым, пра што ўспамінаем, маладым, відаць, не патрэбна. Гісторыяй мала хто з іх цікавіцца.

Гаворыць гэта Іван Васільевіч спакойна як пра нешта сумнае, але даўно вядомае і зразумелае. І я не ведаю, што адказаць. Што сказаць чалавеку, які пражыў доўгае і складанае жыццё, поўнае ўдач і памылак, расчараванняў і ўзлётаў? Мы не суддзі старэйшым пакаленням. Мы можам толькі паспрабаваць зразумець іх. Зразумець, што кожнае жыццё, кожны лёс — непаўторны і унікальны.

І таму я кажу на развітанне толькі адно:

— Добрага здароўя вам, Іван Васільевіч! Добрага здароўя!

●

Іван Васільевіч Малец зноў уступіў у партыю ў 1946 годзе. Пасля XX з'езда адноўлены і яго партыйны стаж — з 1927 года.

Віталь ТАРАС.

Памяць жыве

Я нарадзіўся і доўгі час жыў на Гродзеншчыне ў вёсцы Кунцаўшчына, што недалёка ад вёскі Балічы, радзімы А. В. Баліцкага, аднаго з відных дзеячаў культуры рэспублікі, які 30 кастрычніка 1937 года быў расстраляны, як вораг народа. Добра ведаў яго родных і знаёмых. Хочацца сказаць, што і з маёй вёсачкі Кунцаўшчына, у якой налічвалася 18 двароў, трынаццаць чалавек загінула ў перыяд культу асобы Сталіна.

Прапаную ўвазе чытачоў «ЛіМа» допіс, прысвечаны памяці выдатнага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча Антона Васільевіча Баліцкага. З вялікай радасцю даведаўся, што Бюро ЦК КПБ прыняло рашэнне сярод іншых дзеячаў пасмяротна аднавіць у радах КПСС і яго.

Мне ўдалося пазнаёміцца з сястрой жонкі А. В. Баліцкага Зояй Паўлаўнай Завадскай, якая жыве зараз у Мінску. Яна ўспамінала: «Я ведала Антона Васільевіча Баліцкага як палымянага рэвалюцыянера яшчэ да 1917 года. Ён быў афіцэрам 300-га палка, які некаторы час дыслацыраваўся ў г. Бендэрах, дзе мы жылі. У кастрычніку 1917 года Антон Васільевіч быў пасланы ў камандзіроўку ад палка ў Петраград і аказаўся ўдзельнікам штурму Зімняга. Памятаю, як ён, прыехаўшы з Петраграда, пра ўсё гэта нам расказваў. Антон Васільевіч у час штурму быў нават паранены шабляй. У той час ён праводзіў вялікую агітацыйную работу сярод насельніцтва, выступаў з дакладамі, чытаў лекцыі. Пасля яго полк перавялі ў Адэсу, дзе ў медінстытуце вучылася мая сястра Тамара. Тут яны пазнаёміліся і ажаніліся. Сустрэлася я з імі зноў толькі ў 1920 годзе у г. Вазнясенску, Антон Васільевіч Баліцкі ўзначальваў там «Нарасветы». Нягледзячы на пасляваенную разруху, усе школы тут працавалі бесперабойна, дзеці атрымлівалі гарачыя абеды, настаўнікі пайкі, зарплату. Антон Васільевіч у сяле Ак-Мечэць адкрыў сельскагаспадарчы тэхнікум. Я разней з ім працавала выкладчыкам біялогіі. Як кіраўніка яго ўсе паважалі і любілі...».

У 1921 годзе яго як беларуса па тэлеграме Леніна адазвалі ў г. Мінск, успамінае З. В. Завадская, і прызначылі намеснікам народнага Камісара асветы БССР. Антон Васільевіч быў цесна звязаны з пісьменнікамі Беларусі, асабліва ў блізкіх адносінах быў з Янкам Купалам, Міхасём Чаротам, Цішкам Гартным. Яны часта бывалі ў яго доме, чыталі свае творы, раіліся. А. Баліцкі быў таксама вялікім прыхільнікам выяўленчага мастацтва, драматургіі і музыкі. У яго кватэры збіраліся артысты, спевакі. У іх доме праслухоўваліся новыя творы беларускіх кампазітараў, у прыватнасці творы тады яшчэ маладога кампазітара Аладава...

У пачатку 1922 года ў Мінску быў заснаваны Інстытут Беларускай Культуры (Інбелкульт). З 1922 года па 1924 год гэты інстытут праводзіў вялікую навукова-даследчую і культурную работу. 4 лістапада 1924 года на 3-й сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Антон Васільевіч Баліцкі выступіў з дакладам, у якім даў высокую ацэнку рабоце Інбелкульта і ўнёс прапанову аб рэарганізацыі яго ў Акадэмію навук БССР.

На чале аб'яднанай секцыі беларускай мовы і літаратуры ў Інстытуце Беларускай Культуры стаяў прэзідыум, старшынёй якога доўгі час быў А. В. Баліцкі. Пад яго кіраўніцтвам секцыя беларускай мовы і літаратуры правяла значную работу па падрыхтоўцы акадэмічных выданняў твораў беларускіх пісьменнікаў.

Лёс сям'і Баліцкіх трагічны. Антон Васільевіч быў арыштаваны і расстраляны. Даведаўшыся пра гэта, раптоўна памерла яго жонка Тамара Паўлаўна, пакінуўшы шасцімесячнага сына. Сын Баліцкага — Антон Антонавіч Баліцкі — прайшоў усю вайну, дайшоў да Берліна. Пасля перамогі над фашысцкай Германіяй ён застаўся ў войсках Савецкай Арміі. Скончыў ваенную акадэмію ў Кіеве. Зараз у званні падпалкоўніка.

На радзіме Антона Васільевіча Баліцкага з яго родзічаў нікога няма. Ад хаты захаваўся адзін падмурак. Памёр апошні яго пляменнік — Пракоп Аляксандравіч Баліцкі. Але памяць аб А. В. Баліцкім сярод яго землякоў жыве. У музеі Лашанскай сямігадовай школы імя Я. Ф. Карскага і ў музеі Луцкаўлянскай сярэдняй школы экспануюцца яго фатаграфіі, матэрыялы аб слаўным сыне Беларусі.

А. ЦЫХУН,
заслужаны настаўнік БССР.

ЛЯ КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

Служэнне Радзіме

На Усходніх могілках у Мінску на адным з надмагільных помнікаў выбіты лаканічныя радкі: «Матрос Кастрычніцкай рэвалюцыі». Крыху ніжэй: «Прэзідэнт Акадэміі навук БССР». Тут пахаваны вядомы савецкі вучоны Васіль Феафілавіч Купрэвіч, імя якога ведаюць далёка за межамі роднай яму Беларусі.

Пра слаўны шлях, пройдзены былым матросам, які сустрэў Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю на мінаносцы «Самсон», прымаў удзел у штурме Зімняга, расказвае Уладзімір Ліпскі ў дакументальнай аповесці «Урокі Купрэвіча», выпушчанай выдавецтвам «Беларусь» у серыі «Нашы славутыя землякі».

Аўтар аповесці вылучае дзевяць своеасаблівых урокаў героя, якія, калі падагульніць іх, выстройваюцца ў сістэму: «Ёсць запавет і ёсць урокі жыцця Купрэвіча. Яны сцвярджаюць мо найгалоўнейшы наказ акадэміка-біёлага, што праца, стваральная, творчая праца чалавека, і ёсць... надзейны ген актыўнага даўгалецця».

Дарэчы, В. Купрэвіч быў адным з першых, хто зацікавіўся праблемамі даўгалецця. Гэта па яго ініцыятыве ў Акадэміі навук БССР стварылі сектар геранталогіі, дзякуючы яго падтрымцы пачалі праводзіцца шматлікія даследаванні. Праўда, усё гэта было ў апошнія гады жыцця Васіля Феафілавіча. Кніжка ж пачынаецца з таго моманту, калі В. Купрэвіча толькі што выбралі прэзідэнтам Акадэміі навук рэспублікі (гэта быў пачатак студзеня 1952 года), калі ў жыццёвай і даследчыцкай біяграфіі вучонага пачаўся новы, самы важны віток. Віток, які стаў магчымым дзякуючы папярэднім, настойліва і напружана пражытым гадам.

У. Ліпскі, выкарыстоўваючы ўражанні ад сустрэчы з людзьмі, што добра ведалі вучонага, расказы яго блізкіх, успаміны самога В. Купрэвіча, стварае прывабны воблік чалавека, які рос і сталеў разам з роднай яму Беларуссю. Арганічна ўваходзіць у плынь аповесці імправізаваны дзённік В. Купрэвіча. У юнацтве ён сапраўды вёў марскі дзённік, занатоўваў у ім уражанні перадрэвалюцыйных і рэвалюцыйных гадоў. Але дзённік той не захаваўся. На падставе згадак многіх людзей, архіўных запісаў пісьменнік сам стварае «дзённік Купрэвіча». Гэты мастацкі прыём яму ўдаецца: уражанне такое, быццам сам В. Купрэвіч спавядаецца аб пражытых гадах, вяршыць своеасаблівы маральны суд над сабою.

У аповесці дзве сюжэтныя лініі. Першая звязана з ужо згаданым выбраннем В. Купрэвіча прэзідэнтам Акадэміі навук, другая — рэтраспектыўнага плана. Гаворыцца пра маленства вучонага, яго любоў да расліннага і жывёльнага свету, працу настаўнікам, а потым пра першыя крокі на даследчыцкай ніве. Не абыходзяцца ўвагай і гады вайны, праведзеныя ў блакадным Ленінградзе. Менавіта ў гэтыя час В. Купрэвіч стаў камуністам, абараніў доктарскую дысертацыю.

Сімвалічна гучыць эпізод, звязаны, як мы сёння гаворым, з адліжнымі гадамі. Вярнуўся ў Мінск рэпрэсіраваны ў трыццатыя гады М. Ганчарык, Першая іхняя сустрэча адбылася ці то ў 1929-ым, ці то ў 1930 годзе. Тады М. Ганчарык загадваў кафедрай батанікі Інстытута біялогіі Акадэміі навук БССР, звярнуў увагу на часопісныя публікацыі вясковага настаўніка прыродазнаўства В. Купрэвіча, падтрымаў, абнадзеіў... Цяпер, праз шмат гадоў, ужо В. Купрэвіч запрашае М. Ганчарыка ў тагачасную Акадэмію сельскагаспадарчых навук. Не без уплыву В. Купрэвіча вырашыўся і лёс вядомага вучонага М. Томіна, які таксама нямала зведаў у сваім жыцці.

Паказваючы В. Купрэвіча чалавекам далёка неардынарным, У. Ліпскі адначасова праводзіць думку аб тым, што ў яго лёсе былі самым цесным чынам паяднаны лепшыя чалавечыя і грамадзянскія якасці. Сумленнасць, шчырасць суседнічалі з прынцыповасцю, адкрытасцю і строгасцю, калі справа тычылася навукі. Так паступіў В. Купрэвіч і тады, калі даведаўся, што Інстытут біялогіі пляцецца ў хвасце навуковых даследаванняў. Тады ж і было прынята рашэнне прэзідыума Акадэміі навук БССР аб вызваленні М. Дарожкіна ад выканання абавязкаў дырэктара, «які не забяспечыў кіраўніцтва інстытутам».

Галоўным жа ў жыцці В. Купрэвіча было тое, што ён «перш за ўсё шукаў станоўчае, радаваўся любой знаходцы, умеў сказаць добрае суцяшальнае і абнадзейваючае слова». А яшчэ — умеў глядзець наперад. Гады прэзідэнцтва В. Купрэвіча — паскоранае развіццё беларускай навукі. Былі адкрыты ў Акадэміі навук БССР інстытуты фізікі, матэматыкі, ядзернай энергетыкі, цепла- і масаабмену, генетыкі і цыталогіі і іншыя, адбылося шэраг важных навуковых адкрыццяў, у тым ліку і на сусветным узроўні.

«Урокі Купрэвіча» — кніга, якая прымушае не толькі задумацца над лёсам яе галоўнага героя, нашага выдатнага сучасніка. Адначасова яна абуджае і іншыя думкі. У. Ліпскім зроблены адзін з першых крокаў па напісанні мастацкай біяграфіі вучонага. А колькі ж у нашай рэспубліцы людзей, якія варты такой увагі і пашаны — скажам, той жа М. Ганчарык, М. Улашчык, нядаўна пайшоўшы з жыцця Г. Гарэцкі?!

Адным словам, першы крок зроблены.

А. КУНЦЭВІЧ.

Выстаўкі

Віцебскі «Квадрат» — Казіміру Малевічу

У зале віцебскай арганізацыі Саюза мастакоў працавала выстаўка членаў творчага аб'яднання «Квадрат», на якой, акрамя работ удзельнікаў аб'яднання, экспанаваліся матэрыялы аб таварыстве «УНОВИС» («Утвердители нового искусства») — галоўным плёне жыцця К. Малевіча. Экспазіцыя, хоць і крыху перагружаная, вызначалася вялікім густам і пашанай да Настаўніка, які працаваў у Віцебску з 1919 па 1922 год. Гледача сустракаў вялікі белы крыж, у сарцавіне якога — чорны квадрат. Пад ім — вядомы «Аўтапартрэт» К. Малевіча 1927 г. Побач — «супрэматычны букет» з чорных і чырвоных рэек. У афармленні скарыстаны цытаты з тэарэтычных прац Малевіча. Далей — галоўная частка экспазіцыі, якая апавядае пра УНОВИС, пра яго ўдзельнікаў у Віцебску (Валянціна Ермалаева, Ілья Чашнік, Леў Юдзін, Ілья Сузцін, Мікалай Коган, Леанід Лісіцкі). Усхваляваная гаворка аб дзёрзкіх людзях, якія рызыкавалі зазірнуць у невядомае. Амаль усім ім была загатавана сталінская пайка лёсу. В. Ермалаева, напрыклад, загінула без ежы і вады на адным з астравоў Аральскага мора.

Аднак жа гаворка не пра іх асабісты трагічны лёс. Галоўнае — іх творчасць, справа. На жаль, гэта галоўнае і закрыта ад нас пакуль паўвекавой тоўшчай невядомасці, і тое, што зрабілі ўдзельнікі УНОВИСА, сёння мы ведаем толькі ў «шкілетным» выглядзе, хаця яны паспелі стварыць тэорыю куды больш развітую і дасканалую.

Супрэматызм — нараджэнне навуковага і перш за ўсё тэхнічнага прагрэсу на пачатку нашага стагоддзя. Ужо каня адпрэглі ад самахода, але аўтамабіль па-ранейшаму нагадваў карэту. Фабрыкі па-ранейшаму нагадвалі палацавыя і храмавыя будынкі. Трэба было выйсці на новыя прынцыпы формастварэння, каб ісці па шляху прагрэсу далей. К. Малевіч апярэдзіў свой час. Да ягоных форматворчых прынцыпаў звярнуліся ў нашай краіне праз некалькі дзесяцігоддзяў, калі спатрэбілася даць дах мільёнам. Тады ўзнікла тэхналогія модульнага будаўніцтва. Дом, паводле слоў Карбюзье, стаў «машынай для жылля».

Па сутнасці, ад абстрактна-дынамічных кампазіцый К. Малевіча і В. Кандзінскага, іх паплечнікаў пачынаецца сучасны дызайн з яго модульнай камбінаторыкай.

Сёння разам з ухваленнем К. Малевіча як выдатнага мастака мы бачым і гістарычную абмежаванасць супрэматызму. Справа, канечне ж, не ў тым, што мастацкая спадчына К. Малевіча «не зразумелая» недасведчаным; гэта час паправіць. Справа ў тым, што ў супрэматызме чалавек з яго ўнутраным светам зводзіцца на ўзровень дэталі індустрыяльнай цывілізацыі. Але тэхнакратычны кірунак вядзе ў тупік. Не чалавек для машыны, а машына для чалавека. Чалавек у прыродзе не дэспатычны тыран, а разумны нашчадак спадчыны, якую стварылі яму прырода і грамадства.

Крокам у асэнсаванне супрэматызму ў новай якасці і стала выстаўка творчага аб'яднання віцебскіх мастакоў «Квадрат». У Малевіча яны ўзялі дух пошуку, эксперыменту, творчай неўтаймаванасці. Аддаючы даніну «высакароднай здані» свайго папярэдніка і настаўніка, члены «Квадрата» накіроўваюць свае намаганні на пошук уласных аксіём формаўтварэння. Першы і пакуль самы значны вынік іх дзейнасці — гэта адраджэнне той творчай атмасферы, якой горад быў слаўны ў першыя дзесяцігоддзі веку. Дух Віцебска 20-х вітае ў іх майстэрнях. Што ж датычыць рэальных знаходак — карціна пакуль што, на мой погляд, больш сціплая.

Да мастакоў «Квадрата» можна прад'явіць патрабаванні па вялікім рахунку мастацтва. І таму скажу адразу: галоўны твор выстаўкі — гэта сама выстаўка, на якой няма твораў раўнадушных. Але ж у мастацкіх адносінах амаль ва ўсіх адчуваецца нейкая недастатковасць, сэнсавая недагружанасць, прытым, што ёсць творы цікавыя. Напрыклад, «Жаночы торс» работы А. Малея, лірычнае «Прысвячэнне К. Малевічу» В. Шылко. Ці ўзяць хоць бы арыгінальны па задуме твор А. Слепава «Дэфармацыя асобы». Або «Азбука хлусні» А. Дасужава, «Аналіз дзеяння» В. Шчаснага. І ўсё ж пры гэтых поспехах не пакідае ўражанне, што мастакі спяшаюцца, што іх творчасць пакуль нагадвае занадта бурны рост гідрапанічных агуркоў, быццам усё ёсць — і колер, і форма, і пах, але няма толькі канцэнтрацыі вітамінаў, якую няспешна копяць агуркі на градцы.

Канечне ж, не аб «спадабаецца — не спадабаецца» трэба весці гаворку на выстаўцы. Галоўным у творчасці К. Малевіча і яго паплечнікаў быў пошук не асобнага самавыяўлення, а новай візуальнай мовы. Ці ўспрынялі разам з назвай члены «Квадрата» гэты пафас пошуку? Пакуль цяжка сцвярджаць, што ўдзельнікі «Квадрата» свядома ставяць сабе такую задачу. Падобна на тое, што яны пакуль толькі актыўна адмовіліся ад састарэлай выяўленчай мовы і чыста інтуітыўна рухаюцца ў розныя бакі. Сама па сабе такая адданасць справе выклікае павагу. Але ж і сведчыць аб стыхійнасці руху. Здаецца, што «Квадрат» выстаўкай, прысвечанай К. Малевічу, павінен скончыць этап стыхійнага развіцця і выйсці на шлях мэтанакіраванага, усвядомленага эксперыменту. Дзеля гэтага ў землякоў Малевіча цяпер ёсць усё: статус творчага аб'яднання, арганізаванасць, назапашанае майстэрства і вельмі таленавіты лідэр — Аляксандр Малей, прозвішча якога па дзіўным супадзенні вельмі сугучна прозвішчу Казіміра Малевіча.

Аляксандр ДАБРАВОЛЬСКІ.

А. СЛЕПАЎ. «Захавальнікі музы».

А. МАЛЕЙ. «Сонечнае зацьменне».

В. ШЫЛКО. «Прысвячэнне Казіміру Малевічу».

На блакітным экране

З 2 ПА 8 СТУДЗЕНЯ

2 студзеня, 23.20
ВЯЧЭРНІ КАНЦЭРТ

Выступае дзяржаўны ансамбль танца Латвійскай ССР «Дайле».

3 студзеня, 21.50
«ЛІРА»

Мастацка-публіцыстычная праграма расказвае аб падзвіжніках беларускай культуры.

6 студзеня, 19.30
«МАЯ ТЫ РОДНАЯ ЗЯМЛІЦА»

Мікола Засім. Старонкі жыцця і творчасці.

7 студзеня, 13.20
«МЕТРАНОМ»

Музычнае таварыства: надзеі і трывогі.

7 студзеня, 16.10
«ЭКРАН: ПРАБЛЕМЫ, ГЕРОІ»

Адбудзецца знаёмства з новымі стужкамі эстонскага «Тэлефільма».

7 студзеня, 17.55

Творчы вечар народнага артыста СССР І. Лучанка.

У ім выступяць салісты Дзяржаўнага канцэртнага аркестра БССР Я. Паплаўская, І. Афанасьева, А. Ціхановіч, вакальна-інструментальныя ансамблі «Сябры», «Песняры», І. Кабзон, В. Талкунова, Т. Гвардцытэлі і іншыя.

7 студзеня, 23.05
ВЯЧЭРНІ КАНЦЭРТ

Прэм'ера ансамбля народнай музыкі «Жывіца» Беларускага тэлебачання і радыё пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі рэспублікі В. Пархоменкі.

8 студзеня, 13.05
«ТЭАТР І ЧАС»

Дэмакратызацыя грамадства, рух краіны да прававой дзяржавы, стан нацыянальнай культуры і праблемы міжнацыянальных адносін — па ўсіх гэтых пытаннях выказваюць сваю пазіцыю акцёры-купалаўцы.

У перадачы прымаюць удзел В. Манаеў, Г. Давыдзька, М. Кірычэнка, А. Уладамірскі, Ю. Авяр'янаў.

Вядучы — кандыдат мастацтвазнаўства В. Ракіцкі.

8 студзеня, 18.40
«РОЗДУМ»

Перадача знаёміць з творчасцю аднаго з першых мастацтвазнаўцаў рэспублікі М. Шчакаціхіна.

Вядучы — мастацтвазнаўца У. Бойка.

8 студзеня, 23.05
«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ»

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ ІМЯ А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад прафесарска-выкладчыцкага складу (з мінскай прапіскай):

кафедра камернага ансамбля
дацэнт-1
кафедра аркестравага дырыжыравання
выкладчык-1
кафедра опернай падрыхтоўкі
заг. кафедры-1
кафедра спеваў
прафесар-1
ст. выкладчык-2
кафедра скрыпкі
дацэнт-1
кафедра харавога дырыжыравання
ст. выкладчык-1

Тэрмін падачы заяў 1 месяц з дня апублікавання. Заявы і дакументы згодна палажэнню аб конкурсах накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30. Даведкі па тэл.: 22-49-42, 26-06-70.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 08275

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі і нарыса — 33-19-65, аддзела пісьмаў — 33-19-65, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і тэлебачання — 33-21-53, аддзела музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў — 33-24-62, аддзела народнай творчасці і культасветработы — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і фотаілюстрацый — 33-44-04, 33-24-62, карэктарскай — 32-20-64, бухгалтэрыі — 23-73-37.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Рычард СМОЛЬСКІ, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.